ЛіМ
ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА
ГАЗЕТА ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ БЕЛАРУСІ
23 верасня 1994 г. № 38 (3760) Кошт 25 руб.

РДК

ЗДАНІ ЎЗНІКАЮЦЬ АПОЎНАЧЫ

Мікалай КРУКОЎСКІ: «Мы блукаем у цемры бездухоўнасці, бо і грамадства наша, і культура перажываюць... глыбокую поўнач. Таму і мрояцца сяму-таму, зусім як у Гогаля, злавесныя мерцвякі, што паўстаюць з магіл: то Расійская імперыя ў дарэвалюцыйных межах, то гіганцкі, узброены да зубоў архіпелаг ГУЛАГ пад шыльдаю «СССР».

5,12

ДОМ ТВОРЧАСЦІ

Апавяданне Алеся АСТАШОНКА.

9

СВЕТЛЫ СЛЕД БУДЗЕ ВЕЧНА ЖЫВЫМ

Памяці Івана Ласкова.

13

СПАЧАТКУ СНАРАДЫ, ПАСЛЯ ЛЮДЗІ...

Віктар АСТАФ'ЕЎ: «Каб крычалі «За Радзіму, за Сталіна» — такога не памятаю. Нейкая пашанотлівасць, страх — гэта было. Як жа нам без Бога? Вось і замянілі. А каб крычаць... Ну а маральная ідэя... Была, вядома. Але не камунізм, не камуністы — іх заўсёды ненавідзелі, пагарджалі, баяліся... Ваявалі, думалі: вось пераможам — лягчэй стане. Спадзяваліся на перамены. Падманулі...»

14, 15



Ідзе ўсё, здаецца,
сваёю адвечнай хадой:
Спадае лістота
і меней у небе сінечы.
І хочацца верыць
такою парой залатой
У светлыя дні
і ў спраўджаны лёс чалавечы.

Фота В.СТРАЛКОЎСКАГА

ЛІМ КОЛА ДЗЁН

У краінах сталай дэмакратыі летам людзі адпачываюць. У тым ліку і ад палітыкі. А ў нашай краіне лета было насычана палітыкай болей, чым зіма і вясна, разам узятыя. Бо менавіта на гэты час былі прызначаны выбары прэзідэнта. Падобна на тое, што адпачыць ад палітыкі не давядзецца і восенню. У наступны аўторак распачынае працу чарговая сесія Вярхоўнага Савета, на якой прэзідэнт выступіць з антыкрызіснай праграмай. Сярод больш як 50 пытанняў на сесіі будзе абмяркоўвацца і дата новых выбараў у Вярхоўны Савет. Прэзідэнт, мабыць, быў бы не супраць і датэрміновых выбараў — недзе ў лістападзе-снежні, бо ягоны электарат у выніку непазбежных «непапулярных» мер паціху скарачаецца і да наступнай вясны можа знікнуць увогуле. Ці супадуць жаданні прэзідэнта і народных дэпутатаў?

ПАРАДА ТЫДНЯ

На 49-й сесіі Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый дэлегацыя Рэспублікі Беларусь мае намер прасіць аб змяншэнні членскіх унёскаў, якія наша краіна штогод выплачвае ААН. На думку намесніка генеральнага сакратара ААН па гуманітарных пытаннях П. Хансена, нічога з гэтага не атрымаецца. «Каб задаволіць просьбу Беларусі, прыйдзецца пераглядаць усю сістэму членскіх унёскаў. Даўшы Беларусі станоўчы адказ, мы створым прэцэдэнт, а ў гэтым разе да жадання Беларусі зменшыць членскія ўнёскі могуць далучыцца многія», — сказаў ён. Спадар Хансен лічыць, што для нашай краіны будзе больш рэнтабельным прыцягваць больш інвестыцый, чым скарачаць сваю долю фінансавых абавязкаў перад ААН.

ЦЫТАТА ТЫДНЯ

«Нам цяжка меркаваць сёння аб пэўных падзеях, але іх нельга замоўчваць. Вось калі нашы некаторыя гарачыя галовы лічаць, што пра акупацыю Беларусі Іванам Грозным нельга гаварыць, што гэта ўбівае нейкі клін. Але гэтая падзея была лёсавызначальнай для беларускага народа! І тая 20-гадовая вайна панесла за сабою ахвяры паловы насельніцтва Беларусі. Вы ўявіце, колькі сярод гэтай паловы было інтэлігенцыі, перадавых духоўных! Яны звычайна першыя гінуць у войнах, непрыстасаваныя самыя. Было падарвана існаванне духоўнае цэлай нацыі той вайной! Што ж, мы гэта абмінём, як у старых падручніках, што гэта было толькі класавае змаганне супраць польскіх феадалаў? Гэта была вайна (няважна, нават, хто яе з кім вёў), якая падарвала існаванне нашага генафонду. Што ж, мы будзем пра гэта маўчаць? Тады не зразумеем гістарычны працэс: чаму ў XVI стагоддзі быў Скарына, быў Будны, еўрапейская адукацыя, а потым, у другой палове XVII пачынаецца заняпад, і мова беларуская знікае? Ды таму, што знішчана была інтэлігенцыя, спалены друкарні, цэнтры адукацыі загінулі! Не сказаўшы пра гэта, нельга зразумець сутнасць гістарычнага працэсу».

(Лявон Баршчэўскі: «Праблема падручнікаў — прадмет абмеркавання спецыялістаў, а не палітычных партый і сіл...» «Беларуская маладзёжная», N 14).

ПАСЛЯДОЎНАСЦЬ ТЫДНЯ

Нягледзячы на пратэсты рускамоўнага насельніцтва Жамойці, тэлесерыял «Санта-Барбара» ў гэтай краіне транслюецца цяпер з перакладам на жамойцкую мову. У адпаведнасці з нядаўна прынятым законам, які дазваляе дэманстраваць на тэрыторыі Жамойці мастацкія фільмы толькі на дзяржаўнай (жамойцкай) мове.

ДЭМАНТАЖ ТЫДНЯ

Гарадскія ўлады Таліна (Эстонія) не далі дазволу на правядзенне якіх-небудзь мерапрыемстваў каля мемарыяла вызваліцелям Таліна ад фашысцкай акупацыі (сёлета спаўняецца 50 год з дня вызвалення). Нядаўна прэм'ер-міністр Эстоніі М. Лаар выступіў з прапановай аб пераносе ў іншае месца пахаванняў і дэмантажы самога помніка.

«НЕДАСВЕДЧАНАСЦЬ» ТЫДНЯ

Блізкія да ўрадавых колаў сродкі масавай інфармацыі Расіі паведамілі, што цяпер, пасля выводу войск з Германіі і краін Балтыі, уся расійская армія сканцэнтравана ў межах Расіі, у Расіі болей няма ваенных баз за сваімі межамі. З паведамлення можна зрабіць выснову, што ўрад Расіі альбо не ведае пра шматтысячную расійскую ваенную групоўку на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, альбо лічыць Беларусь часткай Расійскай Федэрацыі.

СУПРАЦЬПРАЎСТВА ТЫДНЯ

Былы міністр абароны Беларусі генерал П. Казлоўскі незадаволены тым, што прэзідэнт зняў з ягонага пагона зорку, збіраецца «шукаць праўды» ў палітыцы, «знайсці ўправу» на прэзідэнта ў асяродку палітычных сіл, якія згодзяцца заступіцца за пакрыўджанага генерала. «В одиночку, конечно, сложно бороться. И я готов пойти в политику, чтобы через общественные организации, через партию добиться своего». Генерал забыўся, што калісьці сам сваім загадам забараніў беларускім вайскоўцам пад пагрозай звальнення з войска займацца палітычнай дзейнасцю.

РАСКОША ТЫДНЯ

У той час, як чарнобыльская катастрофа пазбавіла Беларусь амаль пятай часткі сельскагаспадарчых угоддзяў, не хапае зямлі для фермерскіх гаспадарак, Міністэрства абароны Беларусі мае ў сваім распараджэнні 500 тысяч гектараў зямлі. Спроба вырваць гэтую зямлю з-пад гусеніц танкаў сустракаецца з жорсткім супраціўленнем ваенных чыноўнікаў.

НЕПАРАЗУМЕННЕ ТЫДНЯ

Паводле паведамленняў друку, у складзе ўзначальваемай прэзідэнтам Беларусі Рады Бяспекі, куды ўваходзіць прэм'ер-міністр і кіраўнікі ключавых міністэрстваў, не значыцца імя спікера Вярхоўнага Савета М. Грыба. Затое там ёсць імя ягонага першага намесніка.

ЛІСТ ТЫДНЯ

«Народная газета» (20 верасня г. г.) пад рубрыкай «Горкая пошта» надрукавала ліст пенсіянеркі М. Луцэнкі «Краіна пакутуючых інвалідаў». Хочацца працытаваць з яго некалькі радкоў: «Цяпер я цвёрда пераканалася, што наша краіна — краіна пакутуючых інвалідаў, да гора якіх дзяржаўным чыноўнікам няма справы. У дзяржавы хапае грошай, каб купляць гэтым самым чыноўнікам дзесяткі «мерседэсаў». Аднаму толькі Канстытуцыйнаму суду адвалілі на персанальны аўтатранспарт 2,6 мільярда рублёў (у чэрвені 1994 г.). Гэтага хапіла б на 420 выдатных інвалідных калясак (патрэбнасць цэлай вобласці)».

Ці патрэбны тут які-небудзь каментарый?

Напярэдадні

ДЗЕЛЯ СПРАВЫ ЦІ ПАКАЗУХІ?

Вялікія палітычныя і сацыяльна-эканамічныя зрухі ў грамадстве, якія адбыліся за апошнія 4-5 гадоў, а, галоўнае, набыццё Беларуссю незалежнасці і дзяржаўнага суверэнітэту прывялі да карэнных змен у функцыянаванні Вярхоўнага Савета, які з чыста дэкаратыўнага ўтварэння ў камуністычныя часы ператварыўся ў сапраўды вышэйшы орган улады. Карэнным чынам змяніўся і статус народнага дэпутата, змяніўся ў сэнсе яго большага напаўнення, яго выключнага месца ў грамадстве.

У гэтым допісе мне б хацелася закрануць адзін з бакоў дзейнасці Вярхоўнага Савета і яго дэпутатаў. Маецца на ўвазе кантрольная функцыя парламента. Адна з іх — дэпутацкі запыт, патрабаванне даць афіцыйнае растлумачанне па пытанні, якое закранае той ці іншы аспект жыцця краіны.

Паводле Закона аб статусе народнага дэпутата Рэспублікі Беларусь запыт можа быць адрасаваны Старшыні Вярхоўнага Савета, Прэзідыуму ВС, Старшыні Савета Міністраў, міністрам, кіраўнікам ведамстваў і іншым адказным службовым асобам. Акрамя гэтага, запыт можа быць адрасаваны кіраўнікам усіх прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, размешчаных на тэрыторыі рэспублікі.

Галоўная ўмова дзейнасці кожнага дэпутацкага запыту — яго строгая адпаведнасць існуючым прававым нормам. Тым не менш, нярэдкія выпадкі ў нашым парламенце, калі гэтыя нормы парушаюцца. Так, аднойчы дэпутацкі запыт быў адрасаваны аднаму з райвыканкамаў, хоць менавіта мясцовыя органы ўлады, паводле закона, не могуць быць аб'ектамі дэпутацкіх запытаў у Вярхоўным Савеце.

Паводле Часовага рэгламента, запыт можа быць адрасаваны толькі аднаму органу ці адной службовай асобе. Але і ў гэтым дапускаюцца парушэнні ўстаноўленага парадку — некаторыя парламентарыі звяртаюцца са сваім запытам адначасова ў два, а то і ў тры адрасы. Пры такім падыходзе цяжка вызначыць меру адказнасці кожнага органа ці службовай асобы, якія фігуруюць у тым запыце.

Як прадугледжана Часовым рэгламентам, запыт не можа закранаць канкрэтныя справы, якія знаходзяцца ў кампетэнцыі старшыні Вярхоўнага суда, Генеральнага пракурора, рэспубліканскіх следчых органаў. Некаторыя ж дэпутаты з маўклівай згоды спікера парламента парушалі і гэтае палажэнне. Так, у адным запыце дэпутат патрабаваў ад Генеральнага пракурора прыняцця пэўных мер па справе, якая знаходзілася ў яго на разглядзе.

Для таго, каб запыт меў канкрэтны вынік, трэба, каб строга захоўваліся правілы працэдуры, якая ўстаноўлена нарматыўнымі актамі. Паводле працэдуры, запыт можа быць зроблены толькі на сесіі, таму не з'яўляюцца дэпутацкімі запытамі звароты асобных парламентарыяў да службовых асоб па тэлефоне, праз прэсу і г. д.

Прадугледжанае рэгламентам азнаямленне ўсіх дэпутатаў з запытам і адказам на яго з'яўляецца прызнаннем права кожнага члена Вярхоўнага Савета патрабаваць дадатковых тлумачэнняў ад органа, службовых асоб, якім адрасаваны запыт, а таксама права прызнаць адказ нездавальняючым.

Згодна з законам, орган або службовая асоба, якой зроблены запыт, абавязаны даць на яго адказ на бягучай сесіі ў трохдзённы або іншы тэрмін, які ўстаноўлены Вярхоўным Саветам. Але, трэба адзначыць, што гэтае патрабаванне выконваецца ў нас у надзвычай рэдкіх выпадках. Парушаецца не толькі тэрмін, бывае, што запыт наогул не знаходзіць якога-небудзь адказу на сесіі.

Адсутнасць належнага рэагавання на дэпутацкія запыты прыводзіць да таго, што дэпутаты на сесіях зноў вяртаюцца да ўжо ўзнятага імі раней пытання. Так, быў вымушаны паступіць дэпутат У. Гаркун. 21 студзеня 1994 г. у сваім паўторным запыце ён патрабаваў ад Міністэрства фінансаў растлумачыць парадак прымянення арт. І Закона аб падатку на паліва. Запыт быў выкліканы тым, што ў сувязі з недакладнасцю фармулёвак закона ён не «працаваў», і ў сельскую мясцовасць перастала завозіцца паліва.

У сувязі з гэтым дэпутат Гаркун зрабіў запыт міністру энергетыкі, але — зноў безвынікова. Вярхоўны Савет і на гэты раз не вярнуўся да разгляду важнага запыту.

На жаль, амаль не бывае спрэчак па дэпутацкіх запытах. Звычайна не выконваецца і палажэнне, паводле якога пасля тлумачэння службовай асобы па дэпутацкім запыце Вярхоўны Савет павінен прыняць пастанову, у якой можа быць устаноўлены тэрмін выпраўлення хібаў у рабоце таго ці іншага ведамства. Тым не менш, як правіла, дэпутаты не атрымліваюць інфармацыі аб мерах, якія былі прыняты па тым ці іншым запыце.

Што яшчэ здзіўляе — бывае, што дэпутацкі запыт сфармуляваны так няпэўна, можна сказаць — непісьменна, што зразумець, што да чаго ў ім, проста немагчыма. Бываюць запыты наогул без адраса, як тое славутае пісьмо чэхаўскага Ванькі Жукава «У вёску, дзядулі». Я быў сведкам, калі адзін з дэпутатаў, што выступіў у «Розным», сказаў: «Запыт я адрасую тым службовым асобам, якія ў Савеце Міністраў займаюцца гэтай праблемай». Ніводнага прозвішча не было названа.

Відаць, дэпутацкі запыт па разуменні некаторых народных абраннікаў — гэта не сродак палепшыць справу, а чыста фармальны акт. А для некаторых, дадамо, спроба прадэманстраваць сваю псеўдаактыўнасць.

А. ЛЕЙЗЕРАЎ,
доктар юрыдычных навук,
прафесар

Пошта

«З ПАПОЎСКАЙ УПАРТАСЦЮ...»

ДА ТРЭЦЯЙ ГАДАВІНЫ ВЯРТАННЯ З НЕБЫЦЦЯ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ СІМВАЛАЎ

Пытанне аб дзяржаўных сімвалах Беларусі і дзяржаўнай мове ў апошні час набыло значэнне аднога з галоўных пытанняў. Без перабольшвання можна сказаць, што яно становіцца лёсавызначальным для беларускага народа і яго дзяржавы. Час ад часу ў сродках масавай інфармацыі хваля за хваляй ідуць шалёныя наскокі на дзяржаўныя сімвалы Беларусі, на дзяржаўную мову і на саму дзяржаву з боку камуністаў і палітычных партый, якія ўваходзяць у Народны рух Беларусі.

Напярэдадні святкавання 50-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў працяўнікі незалежнасці Беларусі ўчынілі сваю чарговую атаку на дзяржаўныя сімвалы Беларусі, ДСПС і «Славянский собор» выступілі з заявамі аб змене нацыянальных дзяржаўных сімвалаў на ранейшыя камуністычныя (гл. «Белорусская нива», N 87).

Пытанне аб дзяржаўных сімвалах і дзяржаўнай мове ў Беларусі ў сучасны момант выйшла на пярэдні край ідэалагічнай і палітычнай барацьбы. У ім найбольш яскрава адлюстроўваюцца палітычныя пазіцыі і ідэалагічныя карані супрацьстаячых бакоў.

Адносіны да нацыянальнай сімволікі на Беларусі з боку рускамоўных і мясцовых бальшавікоў-камуністаў ва ўсе часы былі рэзка адмоўныя. Яны ніколі яе не прызнавалі і лічылі вялікай небяспекай для свайго панавання. Цяперашнія ідэолагі «зліцця» нацый і панславінізму ў якасці галоўнага аргумента супраць выкарыстання беларускай нацыянальнай сімволікі ў якасці дзяржаўнай ужо прыводзяць не іх «буржуазнае» паходжанне, а той факт, што ў час акупацыі Беларусі нямецкімі фашыстамі нацыянальны сцяг і герб выкарыстоўвалі паліцаі-здраднікі. Сапраўды, гэта факт гісторыі і ад яго нікуды не дзенешся. Але трэба ведаць, што пытанні мінулага — гэта пытанні этыкі, а не палітыкі.

На што замахваюцца цяперашнія камуністы і сабарысты? Яны паставілі адной з галоўных сваіх мэт напачатку знішчыць нацыянальную сімволіку, беларускую мову, а затым і беларускую дзяржаву. Пасля правядзення такой палітыкі ад беларускай нацыі нічога не застанецца. Беларусы будуць знішчаны не фізічна, а шляхам іх асіміляцыі. Дзеля гэтага, напачатку, трэба выгруціць іх нацыянальную самасвядомасць. На ўзбраенне ўзята і адпаведная тэорыя — тэорыя «зліцця» нацый.

Правядзенню гэтай палітыкі перашкаджае беларуская мова, якая значна адрозніваецца ад рускай. Вось чаму і робяцца на яе такія шалёныя атакі з боку нарадарухаўцаў, якія разлічваюць на тое, што беларусы ў рэшце рэшт выракуцца сваёй мовы і сваёй нацыянальнай сімволікі.

Камуністы і іх палітычныя саюзнікі апантаны ідэяй стварэння новай звышімперыі, штосьці накшталт былога СССР. А дзеля гэтага ім неабходна палітычная ўлада. Вось чаму імі вядзецца ідэалагічная апрацоўка грамадзян Беларусі ў пэўным накірунку з выкарыстаннем розных сацыяльных прыманак, падтасоўкай гістарычных фактаў, хлуснёй і г. д. Улічваючы тое, што прапановы камуністаў у сферы эканомікі не знаходзілі раней і не знаходзяць цяпер падтрымкі ў народа, яны, каб перамагчы на маючых адбыцца парламенцкіх выбарах і прыйсці да ўлады, перанеслі свае акцэнты ў ідэалагічнай і палітычнай барацьбе з эканамічных пытанняў на нацыянальныя і на пытанні дзяржаўнага будаўніцтва.

Гэта добра прадуманы тактычны ход. Рускамоўныя камуністы, а іншых на Беларусі, бадай, і няма, добра ведаюць талерантнасць беларусаў, іх менталітэт, іх нацыянальную самасвядомасць, настальгію старэйшых пакаленняў па сацыялістычным мінулым, па савецкай сістэме ўлады. Тут разлік

Брава!

САЛІРУЕ... АРКЕСТР

Усё-такі вялікі аркестр у «жывым» гучанні — гэта рэч! Калі, зразумела, гучанне чыстае...

Засумаваўшы па натуральным сімфанічным гучанні, меламаны памкнуліся ў Беларускую дзяржаўную філармонію — на адкрыццё чарговага канцэртнага сезона. Адкрыццё адбылося: назаўтра толькі й размоў было, што пра новую, Дзевятую сімфонію Д. Смольскага для аркестра і электрагітары (саліст — В. Смольскі, беларускія музыканты ігралі пад кіраўніцтвам германскага дырыжора П. Д. Панзла). Аднак тэма сённяшняга творчага стану і прафесійнага ўзроўню самога Акадэмічнага сімфанічнага аркестра Беларусі — гэтая тэма ў свецкіх гутарках чамусьці дыпламатычна замоўчвалася... Праз некалькі дзён, 19 верасня, быў яшчэ адзін сімфанічны канцэрт, пасля — дый нават падчас! — якога крытыкі-«дыпламаты» ўжо не стрымлівалі ні сваіх эмоцый, ні меркаванняў. Таму што на гэты раз яны проста радаваліся.

А падставу для радасці даў Вялікі сімфанічны аркестр беларускай оперы, які ўпершыню выступаў на айчыннай філарманічнай сцэне як самастойны калектыў. На сцэне былі лепшыя музыканты рэспублікі — штатныя артысты гэтага аркестра і некалькі запрошаных з іншых. Дырыжыраваў мастацкі кіраўнік — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі А. Анісімаў. Зала (калі такое было на «тутэйшых» сімфанічных праграмах!) шчыльна поўнілася людзьмі ад партэра да балкона. Воклічы «брава!» ганаравалі кожны твор: «Іспанскае капрычыо» М. Рымскага-Корсакава, «Рамэо і Джульету» П. Чайкоўскага... Збалансаванае, аксамітнае гучанне, чысціня й пранікнёнасць інструментальных сола ў аркестры, нават сінхронны рух скрыпічных смыкоў, — усё ўсцешвала. Ды асаблівай уцехаю было чуць неабыякавае, эмацыянальнае і асэнсаванае гранне, даверваючы сваю душу класічнай музыцы, у якой з'ядналіся дырыжор і артысты аркестра.

У другім аддзяленні аркестр выступіў з яркім творчым партнёрам — лаўрэатам рэспубліканскага конкурсу піяністаў, арыгінальным музыкантам Ц. Сергяенем (Мі мінорны канцэрт Ф. Шапэна). А потым проста ўзрушыў залу бліскучым, у добрым сэнсе выбуховым выкананнем «Балеро» М. Равеля. Былі «бісы»: Р. Вагнер, П. Чайкоўскі...

Цудоўныя музыканты. Артыстычны маэстра А. Анісімаў, якога так і хочацца назваць і рэжысёрам, і салістам праграмы. Што тут казаць? Дзякуй! Дзякуй за спатканне з лепшым сімфанічным аркестрам Беларусі!..

С.Б.

ПАМЯЦІ АЎТАРА «ЗОРАЧАК»

7 кастрычніка ў культурным цэнтры Фрунзенскага раёна сталіцы адбудзецца вечарына памяці Сяргея Новіка-Пеюна, які пайшоў з жыцця гэтым летам. На жаль, маладзейшыя пакаленні амаль нічога не ведаюць пра жыццё, творчасць і трагічны лёс гэтага беларускага самародка. Хіба толькі апошнім часам, дзякуючы запісам Данчыка, С. Новік-Пяюн стаў вядомы як аўтар песні «Зорачкі». А гэткіх самабытных песень у яго ці не дзве сотні! Пра незвычайную асобу С.Новіка-Пеюна, пра ягоны самаахвярны, падзвіжніцкі шлях раскажуць удзельнікі мемарыяльнай вечарыны. Прагучыць і невялічкая канцэртная праграма, падрыхтаваная ўдзельнікамі вакальнай студыі. Арганізатары вечарыны будуць рады гасцям, якіх чакаюць а 19-й гадзіне. Праезд да вул. Альшэўскага, будынак 81-й школы.

Н. К.

Меркаванне

МАЕМ ГРОШЫ І ХОДЗІМ БОСЫЯ...

ЗАЦЕМКІ ПРА НАШ ЛЁС І РОДНУЮ МОВУ

Ці спрыяе руская мова беларускаму мысленню?

Руская мова з'яўляецца адной з развітых моў свету. Яна сапраўды вялікая і магутная. Аднак тое, чым карыстаюцца рускамоўныя грамадзяне нашае краіны, не багатая руская мова, не мова Пушкіна, Тургенева, Ляскова.

Беларускі варыянт рускай мовы мае некалькі сотняў слоў. Ён існуе на Беларусі менш як два стагоддзі і прыйшоў праз указы, абмежнікі, а пазней праз «Кароткі курс ВКП(б)», «Малую зямлю», радыё, тэлебачанне, газеты. У гэтай мове няма адценняў, жывога бляску, шматколернага зіхацення.

Да таго ж, мала ведаць слова. Трэба ўмець ужываць яго. Ужываць згодна з асаблівасцямі граматычнага складу мовы. Розны матэрыял патрабуе рознага падыходу, рознай інструментоўкі. Мала мець канькі, трэба мець яшчэ і каардынацыю канькабежца, каб не выглядаць, як валожынскі бугай на лёдзе. Бо вось што атрымліваецца, калі чалавек з мысленнем, прыладкаваным да беларускай мовы, карыстаецца рускімі словамі: «я говорю штрихами», «мы будем поддерживать мозги нашей нации» і г. д.

Пабудова сказаў, слоўнікавы запас, выразнасць думкі і іншыя якасці выказванняў не адлавядаюць як беларускай, так і рускай мовам. Але менавіта так гаворыць адзін з адукаваных рускамоўных прадстаўнікоў нашага грамадства.

Відавочна, што карыстанне такой рускай мовай штучна абмяжоўвае дзяржаўнае мысленне і творчы патэнцыял асобы.

Якія патрэбны варункі, каб па-сапраўднаму авалодаць рускай мовай?

Па-сапраўднаму авалодаць — гэта авалодаць так, каб мова стала натуральнай і творчай прыладай. Натуральнай, як вада для рыбы. Рыба не будзе адчуваць сябе натуральна ў нечым, што толькі нагадвае ваду. Дзеля плённага мыслення патрэбна знітаванасць мовы і мыслення. Чым больш перашкод гэтай знітаванасці, тым менш плёну мыслення.

Каб рускамоўны слоўны цягнік ішоў па каляіне беларускага мыслення, беларускага светаадчування, трэба перарабіць каляіну.

Для гэтага выкінуць беларускую мову з усіх сфер ужывання, адмовіцца ад фальклору, беларускіх летапісаў і старадрукаў, беларускай гісторыі, сімволікі, ад звычаяў і памяці продкаў, адмовіцца нават ад кволай этнічнай самасвядомасці, ператварыцца ў «заходніх рускіх» ці нешта падобнае. І толькі тады будзе ўсё гладка, не будзе перашкод для сапраўднай магутнай рускай мовы.

Што мы набываем, калі адмаўляемся ад роднай мовы?

Кожная мова адметная. У кожнай мове адбіваецца адмысловае светаадчуванне, светапогляд. Кожнай мове ўласцівыя семантычныя, фанетычныя, сінтаксічныя і іншыя прыкметы, якія служаць «матрыцай», «каляінай» для мыслення тых, хто ёю карыстаецца. Гэтыя «каляіны мыслення» наезджаныя продкамі. Кожная каляіна прыладкаваная да «сваіх» слоў, «сваіх» гукаў. Словы — будаўнічы матэрыял для думак, меркаванняў, сцвярджэнняў, паняццяў нашага светапогляду — адпавядаюць памеру каляін мыслення.

Гістарычнае паходжанне слоў і слоўнікавых сэнсавых гнёздаў вызначае рознае стаўленне прадстаўнікоў розных моў да рэальнага свету.

Вось два варыянты сцвярджэння:

а/ каб выхаваць асобу, сярод усяго іншага, настаўнікі даюць ёй адукацыю;

б/ чтобы воспитать личность, среди прочего, учителя дают ей образование.

Калі мы звернемся да гістарычных і этымалагічных слоўнікаў, то выявім розны **падтэкст** у гэтых сцвярджэннях:

Слова «личность» паходзіць з сэнсавага слоўнікавага гнязда, дзе корань «лицо», дзе за якасць, за сэнс бярэцца вонкавы выгляд. Слова «асоба» (ад «асобны», не такі, як усе) не абапіраецца на якасці твару, адлюстроўвае і сацыяльныя якасці.

Слова «выхоўваць» з аднаго сэнсавага гнязда са словамі «хаваць», «ахоўваць», гэта значыць «бараніць», «апякаць». Рускае слова «воспитать» з гнязда «питать», «питание», «пита» — старажытнаславянскае слова «ежа», «хлеб».

Слова «настаўнік» аднаго кораня са словам «настаўляць», настаўляць на правільны шлях. А рускае слова «учитель», як тлумачаць этымолагі, паходзіць ад літоўскага кораня «(ja)ukus» — утаймоўваць, дзе «ук» перад «и» перайшло ў «уч».

Слова «адукацыя» паходзіць ад лацінскага кораня «duco» — весці за сабою. Рускае слова «образование» са слоўнікавага гнязда, дзе ёсць словы «вырезать», «обрезать» (лішніцу, тое, што перавышае запланаваную норму).

На гэтым прыкладзе відаць, як утвараўся погляд на з'явы, у прыватнасці, як фармавалася канцэпцыя адукацыі ў беларускім і расійскім менталітэтах. Відавочна, што мова ўплывае на падтэкст, на прыхаваны сэнс меркаванняў, высноў, матывацыі дзеянняў, тэорый і вучэнняў.

Паходжанне слова ў кожнай мове нараджае свой непаўторны асацыятыўны ці лагічна-паслядоўны працэс мыслення. Адны мовы спрыяюць рабоце інтуітыўнага мыслення, другія прымушаюць думаць па законах логікі.

Нездарма ў Францыі нарадзіліся вадкасна-хвалевыя фізічныя тэорыі (Фрэнель, дэ Бойль і інш.), у англасаксонскіх краінах дыскрэтна-карпускулярныя тэорыі (Ньютон, Планк і інш.). У Вялікай Брытаніі, Нямеччыне Свет успрымаецца вуглавата-квадратным (Haus, home) у адрозненне ад элінскага статычнага Сфераса ці гальскіх жавіяльных віхураў.

Калі мова не стасуецца з асаблівасцямі мыслення, з'яўляюцца думкі, падобныя да забітых адкруткай цвікоў, ці шрубоў, закручаных малатком.

Дык ці варта адмаўляцца ад сваіх разумовых уменняў? Ці варта мяняць сваю мову, мяняць гаршчок на гліну?

Ці ўплывае мова на палітыку?

De jure ў нашай краіне дзяржаўная мова — беларуская, de facto — руская. Яна пануе ў апараце прэзідэнта і ў праўленні калгаса, у пракуратуры і судзе, у ЖРЭО і паліклініцы, у большасці праграм радыё і тэлебачання, якія транслюцца на краіну.

І як вынік, паўсюдна нараджаюцца сугучныя ў мове планы, канцэпцыі, тэорыі.

Карыстанне моваю іншай краіны ў самых прэстыжных галінах стасункаў з'яўляецца сродкам уціску на індывідуальнае і грамадскае жыццё. Гэты ўціск не збройны, не эканамічны (пагрозаю адключыць газ), а лінгвістычны, псіхалагічны, ідэалагічны. Нязначная частка сведчанняў пра тое, як руская мова дапамагае выхоўваць беларускі патрыятызм, трапляе ў друк. Напрыклад, дырэктар Беларускага інстытута культуры і мастацтва ў Нью-Йорку спадар Вітаўт Кіпель у сёлетнім 31 нумары газеты «Наша слова» сумна распавядае, як нашы мытнікі абразліва адносіліся да дзяржаўнага герба.

Быццам негвалтоўны ўціск рускай мовы блоціць наш нацыянальны гонар, пачуццё нацыянальнай годнасці. Таму гэты ўціск можна кваліфікаваць як разбуральны і антыбеларускі. І трэба зазначыць, што гэты ўціск дастаткова выніковы.

Знаходжанне паміж дзвюх моў, дзвюх каляін мыслення і дзейнасці — гэта знаходжанне на інтэлектуальных ростанях, што садзейнічае расшчапленню асобы, замінае яе чыннасці, спрыяе млявасці, знікненню ініцыятывы, нежаданню браць на сябе адказнасць за сябе і краіну. Таму нашыя рускамоўныя дзяржаўныя дзеячы бачаць мэту ў тым, каб скласці з сябе адказнасць за краіну, як хутчэй «уз'яднацца» з Расіяй.

Можа, беларусы не здольныя быць адказнымі, прадбачлівымі, смелымі, гаспадарлівымі? Не! Беларусы — паўнавартасны этнас. Нашы магчымасці дэманструе беларуская гісторыя, якая вельмі раздражняе русіфікатараў, бо нельга знішчыць народ, які ведае свае патэнцыі. А пакуль... «маем грошы і ходзім босыя». Пакуль...

Сяргей ЯЗЕРСКІ, псіхатэрапеўт

просты. Узаконіўшы свае партыйныя сімвалы і партыйную (рускую) мову ў якасці дзяржаўных, захаваўшы старую сістэму ўлады, застанецца прыкласці вельмі невялікія намаганні, каб легітымізаваць сваё палітычнае панаванне ў грамадстве і канстытуцыйна замацаваць яго на дзесяцігоддзі, як і раней, у складзе славянскай, расійскай ці то савецкай імперыі.

Больш таго, камуністы і сабарысты імкнуцца зрабіць свае партыйныя сімвалы (дакладней, сімвалы сваёй былой партыйнай імперыі) у якасці дзяржаўных, сваю мову — у якасці дзяржаўнай, сваю этнанігілістычную (партыйнацэнтрысцкую) ідэалогію — у якасці дзяржаўнай, сваю партыю — у якасці кіруючай, каб тым самым узаконіць спачатку ў Беларусі ўсе атрыбуты ствараемай імі «новай» імперыі, а затым і ў астатніх краінах СНД і Усходняй Еўропы. Вядома, што будаўніцтва імперыі пачынаецца з навязвання народу ідэі яе неабходнасці і зацвярджэння яе сімвалаў.

Як бачым, барацьба камуністаў супраць нацыянальных сімвалаў — гэта барацьба за ўзаконьванне камуністычна-імперскага панавання, барацьба за адраджэнне імперыі, барацьба за знішчэнне нацыянальнай адметнасці беларусаў.

Вяртаючыся да пытанняў этыкі, трэба зазначыць, што яшчэ Гегель прыйшоў да выводу аб тым, што вышэйшым гонарам для нацыі з'яўляецца ўтварэнне сваёй дзяржавы. Нарадарухаўцы, квапячыся на вышэйшы гонар нацыі, паводзяць сябе ў сувязі з гэтым вельмі неэтычна. «Нацыя здольна дараваць ушчамленне яе інтарэсаў, але не можа дараваць абразы яе гонару, асабліва, калі яе абражаюць проста-такі з папоўскай упартасцю», — адзначаў у пачатку XX стагоддзя другі вядомы нямецкі вучоны-сацыёлаг Макс Вебер.

Я не думаю, што беларуская нацыя даруе тым, хто цяпер абражае яе гонар, яе дзяржаўны сцяг, яе дзяржаўны герб, яе дзяржаўную мову, як бы ні разгортваліся палітычныя падзеі ў будучым.

Абараніць вышэйшы гонар беларускай нацыі ад гвалтоўных дзеянняў з боку пэўных палітычных сіл — вось першачарговая задача, якая паўстала ў сучасны момант перад кожным сумленным грамадзянінам Беларусі, перад кожнай палітычнай партыяй і грамадскай арганізацыяй. Толькі на падставе гэтага магчыма кансалідацыя грамадства і выхад Беларусі з цяжкага сацыяльна-эканамічнага крызісу.

Тры гады назад, 19 верасня 1991 года, народ Беларусі зноў утварыў сваю незалежную дзяржаву, вярнуў з небыцця свае нацыянальныя сімвалы. Таму 19 верасня — сапраўднае нацыянальнае свята. У гэты дзень Беларусь пазбавілася ад камуністычнай сімволікі і ўзаконіла свае нацыянальныя святыні — бел-чырвона-белы сцяг і герб «Пагоня». Ніхто і нішто не можа прынізіць важнасці гэтай падзеі ў жыцці беларускай нацыі і яе дзяржавы. Таго ж, хто падымае руку на гонар нацыі, на дзяржаўныя сімвалы і дзяржаўную мову, чакае праклятце народа і божая кара. Нішто не можа спыніць імкнення беларускага народа да свабоды і незалежнасці.

Міхась АНТОНЕНКА,
намеснік старшыні Беларускай сялянскай партыі, кандыдат эканамічных навук

ДВУХТЫСЯЧНЫ НУМАР «НІВЫ»

У штотыднёвіка беларусаў Польшчы — свайго роду юбілей. Выйшаў чарговы, трыццаць сёмы за сёлетні год, пазначаны 11 вераснем, нумар. Адначасова ён двухтысячны з таго дня, калі з'явілася новае выданне.

Як адбывалася гэта, падрабязна расказаў у кнізе «Вірыі», выпушчанай у 1991 годзе, у Беластоку, Георгій Валкавыцкі. Яму, тады нядаўняму выпускніку Літаратурнага інстытута імя А. М. Горкага ў Маскве, і выпала стаць першым галоўным рэдактарам тыднёвіка. Уласна ён, Г. Валкавыцкі, і назву газеце прыдумаў, а 1 кастрычніка 1955 года зрабіў пробны макет. Але да выхаду газеты было яшчэ далёка. Толькі 1 лютага 1956 года Г. Валкавыцкі атрымаў афіцыйнае прызначэнне на пасаду галоўнага рэдактара, хоць абавязкі гэтыя выконваў ужо з 1 студзеня.

Пробныя нумары «Нівы» выйшлі 11 і 19 лютага, а 26 лютага 1956 года з'явіўся спецыяльны выпуск газеты, які атрымалі дэлегаты ўстаноўчага з'езда Беларускага грамадска-культурнага таварыства. Прыхільна сустрэў выхад беларускай газеты на Беласточчыне польскі друк. А ў Мінску адгукнуліся на гэтую важную падзею «Звязда» і «Советская Белоруссия», а Ніл Гілевіч напісаў верш «На прадвесні».

Дзейнасць «Нівы» стала часткай работы ўсяго Беларускага грамадска-культурнага таварыства па нацыянальным адраджэнні на Беласточчыне. З 1957 года пачаліся рэгулярныя перадачы на беларускай мове па радыё. У гэтым жа годзе пабачыў свет першы выпуск штогодніка «Беларускі каляндар», які праз некаторы час ператварыўся ў літаратурна-мастацкае і грамадска-культурнае выданне. Сталі выдавацца кнігі, аўтары ж перад гэтым творы свае апрабоўвалі на старонках «Нівы».

Двухтысячны нумар штотыднёвіка — і юбілейны, і рабочы. Ёсць у ім матэрыялы (прынамсі, на апошняй шаснаццатай паласе змешчаны рэпартаж «Фотагісторыя «Нівы»), што дазваляюць задумацца над шляхам, пройдзеным выданнем, ёсць і публікацыі (а іх нямала, якія даюць мажлівасць даведацца, чым жывуць беларусы Беласточчыны сёння, і як ставяцца яны да мінулага.

Адным словам, юбілей — юбілеем, а праца — працай. Як і ўчора, як і заўчора, як і ў першыя дні свайго жыцця газета імкнецца аб'ектыўна і шырока асвятляць жыццё на Беласточчыне.

Цяперашні галоўны рэдактар «Нівы» Яўген Міранові́ч сваё выступленне назваў «Энцыклапедыя беларусаў Беласточчыны». І на самай справе гэта так. Таму застаецца разам са спадаром Я. Мірановічам спадзявацца, што «Ніва» ёсць і будзе... «калектыўным партрэтам беларусаў Беласточчыны».

ЛіМ
ЧАСАПІС

КУВАЛДАЙ... ПА АРГАНЕ



Няхай уражлівы чытач не ўздрыгвае — да гэтага, дзякуй Богу, справа яшчэ не дайшла. Хоць з нашым стаўленнем да культуры ўсяго можна чакаць.

Трывожны званок арганіста Белдзяржфілармоніі Канстанціна Шарава прывёў у Залу камернай музыкі, што ў касцёле Святога Роха на Залатой Горцы. Як вядома, дзесяць гадоў назад чэшскія майстры ўстанавілі тут цудоўны арган. І ўсе гэтыя гады радаваў ён слухачоў чароўнымі гукамі.

Цяпер сітуацыя складваецца так, што будынак касцёла, верагодна, будзе перададзены вернікам. Ва ўсякім разе, тут ужо праходзяць нядзельныя набажэнствы. А нядаўна пачалі перарабляць тую частку касцёла, дзе цяпер устаноўлены арган (раней тут быў алтар). Пры гэтым не даўмеліся нават належным чынам прыкрыць унікальны інструмент, толькі завесілі яго, і то не ўвесь, дзіравым палатном. І пачалі кувалдамі бурыць сцены. Пласт цэглавага пылу пакрыў усё навокал, і можна толькі здагадвацца, колькі яго трапіла ўнутр аргана.

Спробы К. Шарава спыніць варварства не знайшлі разумення ні ў наваяўленых «рэстаўратараў», ні ў кіраўніцтва філармоніі, якой належыць інструмент.

Можа, час умяшацца ў гэтую справу Міністэрству культуры і вызначыць лёс аргана?

Яўген КАЗЮЛЯ, БЕЛІНФАРМ

БЕЛАРУСКІ POSTМАДЭРН У ПУШКІНСКАЙ ГАЛЕРЭІ

Работы дванаццаці мастакоў з Мінска, Віцебска, Полацка, Гародні, Свіслачы досыць арганічна стварылі ёмістую кампазіцыю жывапісу і скульптуры ў галерэі А. Пушкіна, што ў Віцебску. Выставіліся тут постмадэрністы — ужо «пасталеўшыя» мастакі І. Кашкурэвіч, А. Пушкін, В. Васільеў, С. Цімохаў, К. Селіханаў і толькі ўзыходзячыя «зоркі» Н. Залозная, С. Бабарыка, Ю. Анушка ды іншыя. Вядома, можна гаварыць пра суб'ектыўнасць адбору работ, пра перавагу сяброў. Але ніводнага разу нельга было адмовіць Аляксандру Пушкіну, як мастаку і трымальніку галерэі, у адчуванні толькі ўзнікшых перспектыўных і цікавых плыняў беларускага мастацтва, у адкрыцці яшчэ невядомых імёнаў, у гусце, зрэшты, стварэння экспазіцыі і яе тэарэтычнага абаснавання. Так, апошняя выстава «Postмадэрністы» не проста зафіксавала з'яўленне гэтага накірунку, яна выявіла цэльнасць яго ў пэўным сэнсе паганскую — у тэматыцы і стварэнні вобразаў. Гэта шлях вяртання да міфалагічнасці, перакладзенай на сучасную мастацкую мову, падобны таму, з якога распачыналася авангардная мастацтва XX стагоддзя.

Н. Ш.

Пошта

НЕ ТРЭБА ПАДШТУРХОЎВАЦЬ!

Нядаўна ў «Народнай газеце» быў змешчаны артыкул пад назвай «Камусьці надта хочацца, каб прэзідэнт наступіў на граблі...» У гэтым артыкуле яго аўтар Аляксандр Класкоўскі даваў адказ грамадзяніну Баранаву В. І. на ліст у газету. Апошні лічыць, што ўсе прамовы, выказванні нашага прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі павінны друкавацца ва ўсіх выданнях без выключэння толькі на рускай мове, бо «прэзідэнт сам гаворыць толькі па-руску».

Ну што на гэта сказаць? Дзіўна, што так разважае, такога патрабуе, як падкрэслівае аўтар артыкула, рабочы, беларус, 1947 года нараджэння... Мне, як грамадзяніну роднай Рэспублікі Беларусь, стала нялоўка і крыўдна за чалавека, што прыйшоў да такіх вывадаў і перакананняў. А чаму друкаваць выступленні прэзідэнта толькі па-руску? А як быць тым выданням, якія выходзяць на роднай мове, на польскай, яўрэйскай ці на якойсьці замежнай?

Мне захацелася напісаць ліст самому нашаму прэзідэнту Аляксандру Рыгоравічу Лукашэнку, сказаць яму, каб не прыслухоўваўся да такіх «парад». Але тут жа падумаў, што маё слова да яго наўрад ці дойдзе, а калі трапіць каму-небудзь з яго адміністрацыі, то гэта не прынясе ніякай карысці: многія з каманды прэзідэнта, на жаль, салідарны з прапановай грамадзяніна Баранава. Таму і вырашыў выказаць свае думкі на старонках паважанага нашага штотыднёвіка як звычайны, нязменны яго падпісчык і чытач.

Усім грамадзянам Рэспублікі Беларусь, якая ўсё больш упэўнена набывае свой суверэнітэт і незалежнасць, добра вядома, што беларуская мова па Канстытуцыі з'яўляецца ў нас дзяржаўнай і што ўсе астатнія мовы шануюцца як мовы зносін. І правільна падкрэсліваў журналіст А. Класкоўскі ў сваім адказе грамадзяніну Баранаву, што «не трэба падштурхоўваць нававыбранага кіраўніка дзяржавы да сумніцельнай ролі магільшчыка беларушчыны». Дык няўжо Баранаў не чытаў хоць бы асобных артыкулаў нашай Канстытуцыі, у якіх дакладна і ясна запісана палажэнне аб дзяржаўнай мове, якой павінны карыстацца ўсе грамадзяне Рэспублікі Беларусь. Гэта прынята і зацверджана на Вярхоўным Савеце дзяржавы абсалютнай большасцю нашых народных абраннікаў.

І тут мне на думку прыходзіць такая выснова: грамадзянін Баранаў у лісце ў газету выкладваў не свае думкі, а гаварыў і пісаў з чужога голасу. Ён належыць да таго пасляваеннага пакалення, якое было ў многім падманута нашымі былымі дзяржаўнымі і партыйнымі кіраўнікамі ў тлумачэнні нацыянальнага пытання, у адносінах да роднай мовы.

Некаторыя асобы з партыйнай наменклатуры яшчэ зусім нядаўна сцвярджалі, што ў нас на Беларусі дзве родныя мовы — руская і беларуская і дзейнічаць яны павінны нараўне. Адна сапраўды дзейнічала. А другая — кроўная, карэнная? Пра другую проста забывалі, нібыта яе зусім няма, больш таго — прынижалі, выкідвалі з ужытку.

Цяпер становішча іншае. Родная мова ўзнята на дзяржаўную вышыню і павінна дасягнуць усенароднага ўжытку. Пра гэта павінен дбаць кожны чалавек, які лічыць сябе грамадзянінам суверэннай беларускай дзяржавы. У гэтым напрамку я асабіста раіў бы і нашаму першаму беларускаму прэзідэнту, паважанаму Аляксандру Рыгоравічу, больш шанаваць родную мову, часцей, калі не заўсёды, выступаць на ёй, гаварыць са сваім народам на той мове, якая спрадвеку была яго кроўнай, матчынай.

Хочацца сказаць крыху пра сябе, пра свае адносіны да мовы.

Нарадзіўся я ў глыбіннай, далёкай ад чыгункі вёсцы Альшоў, што побач з Хоцімскам. Там прайшло маё маленства і юнацтва. Першай маёй настаўніцай у пачатковай школе была родная маці народнага паэта Беларусі Аркадзя Куляшова — Кацярына Фамінічна Ратабыльская. Яна вучыла мяне з першага па чацвёрты клас. Усе ўрокі праходзілі на беларускай мове. А літаратуру мы вывучалі па творах рускай і беларускай класікі. У чытанцы для трэцяга класа «Наша Айчына» былі вершы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Янкі Журбы, урыўкі з твораў Цішкі Гартнага, Кузьмы Чорнага, Міхася Лынькова і іншых вядомых нашых паэтаў, празаікаў. Мы завучвалі на памяць вершы, паэмы, казкі, паданні. І ў школе, і дома са сваімі роднымі, блізкімі гаварылі на сваёй роднай мове.

Пасля студэнцкай пары, якая заканчвалася перад самай вайной, мне давялося амаль дваццаць гадоў служыць у арміі. Пасля заканчэння Сталінградскага ваенна-палітычнага вучылішча прайшоў усю вайну ад пачатку да канца, затым доўгі час служыў за межамі радзімы, працаваў у вайсковых газетах, пісаў артыкулы, нарысы. Але сваёй роднай мовы не забываў ніколі, нідзе, ні на адну імгненне. Часам нават салдацкія сны ў акопах мне сніліся па-беларуску.

Прыгадваю словы выдатнага беларускага пісьменніка Барыса Мікуліча, які, знаходзячыся ў выгнанні ў часы сталінскага генацыду, далёка ад родных мясцін, у самых невыносных умовах, пісаў, наколькі было магчыма, на роднай мове свае творы, чытаў іх там мясцовым людзям — сібіракам — і гаварыў ім: «Я ведаю чатыры мовы, а думкі выказваць магу лепш за ўсё па-беларуску».

Нехта скажа: «Ат, гэта ж пісьменнік так разважае. Яму сам бог наканаваў так пісаць і гаварыць...» Не, дарагія, гэта не так. Няпраўда тое, што беларускі народ забывае сваю мову. Прыедзьце вы ў мой родны Хоцімск. Паслухайце, як там гавораць мае землякі. Гавораць яны на той мове, якая жыла і жыве тут спрадвеку.

Не хочацца гаварыць пра тых дзеячаў, якія імкнуцца пасеяць ў нашым грамадстве зерне недаверу, унесці разлад паміж людзьмі ў нашым сённяшнім нялёгкім жыцці, тым больш, калі заходзіць гаворка аб мове, аб нацыянальнай прыналежнасці. Я ведаю многіх вучоных, інжынераў, работнікаў культуры, людзей розных нацыянальнасцей — рускіх, яўрэяў, украінцаў, грузінаў і іншых. Не забываючы сваіх родных моў, жывучы доўгія гады на Беларусі, яны добра вывучылі яе мову і не толькі гавораць па-беларуску, але і пішуць свае творы, трактаты. Так яно і павінна быць. Нельга не любіць народ, з якім звязаў свой лёс.

Пятро ПРЫХОДЗЬКА

ЯШЧЭ АДНА ПАРАДА ПРЭЗІДЭНТУ

Ужо каторы раз чую з вуснаў шаноўнага Прэзідэнта Беларусі пра славутыя 82 працэнты выбаршчыкаў, што быццам бы аддалі за яго свае галасы. Паважаны Аляксандр Рыгоравіч! Ці не досыць хлусіць перад усім светам? Вы ж добра разумееце, што за Вас прагаласавалі 82 працэнты (ці дакладная лічба?) толькі тых выбаршчыкаў, што прыйшлі на выбарчыя ўчасткі ў другім туры. Толькі тых! Сарамліва апускаючы гэты «маленькі» нюанс, Вы пашыраеце тыя працэнты на ўсіх выбаршчыкаў, на ўсіх грамадзян Беларусі, што маюць права выбіраць. Але ж Вам не трэба забываць і пра тых, хто не прыйшоў галасаваць. Многія, у тым ліку і я асабіста, не прыйшлі, бо не бачылі выбару — сваімі поглядамі, як і праграмамі, Вы і Кебіч былі вельмі блізкія. Дакладныя звесткі пра колькасць і гэтых выбаршчыкаў, здаецца, публікавала Цэнтральная выбарчая камісія. Калі б іх падлічыць, то за Вас, шаноўны Прэзідэнт Беларусі, галасавала нешта каля паловы ўсіх выбаршчыкаў Беларусі. Ва ўсякім разе не 82 працэнты. Да таго ж многія з выбаршчыкаў, галасуючы ў другім туры за Лукашэнку, ставілі перад сабой адну галоўную мэту: скінуць бяздарны і прадажны ўрад Кебіча, які пачаў ужо гандляваць суверэнітэтам Беларусі. А многія, скажу з усёй упэўненасцю, выбіралі ў другім туры з двух зол меншае.

Кажу ўсё гэта я не для таго, каб неяк зачапіць Ваша самалюбства, паважаны Аляксандр Рыгоравіч. Проста хацелася б, каб Вы развеялі некаторыя свае ілюзіі і не надта казыралі тымі працэнтамі. Тым больш, што выбары — гэта ўжо мінулае. Цяпер Вас будуць ацэньваць рэальнай Вашай дзейнасцю. І толькі. Нават не будуць супастаўляць яе з Вашай перадвыбарчай праграмай, на якую (не толькі Вашу) надта не зважалі — мала што можна наабяцаць! Трэба прызнаць: гледзячы на першыя крокі Вашага прэзідэнцтва, многія з тых, што галасавалі супроць Вас, цяпер патроху мяняюць сваю думку на Вашу карысць. Мне асабіста падабаецца, напрыклад, тая напорыстасць і рашучасць, з якой Вы ўзяліся выводзіць нашу эканоміку з крызісу, рэфармаваць гаспадарку, спыняць інфляцыю. Калі Вы будзеце паслядоўнымі ў гэтых пераўтварэннях, не на словах, а ў сапраўднасці праводзіць рэформы, то на Ваш бок пяройдуць многія з Вашых праціўнікаў. Вядома, пры той толькі ўмове, што Вы будзеце гарантам нашага суверэнітэту. Памножыць лік Вашых прыхільнікаў і тое, што Вы не зацыкліваецеся на якой-небудзь неасцярожна выказанай Вамі «тэзе», што Вы на хаду, адкрыта і сумленна, выпраўляеце ўласныя памылкі, напрыклад, звязаныя з рознымі «аб'яднаннямі». Вашых прыхільнікаў будзе значна больш, калі Вы, адкінуўшы папулісцкія, часова толькі выгадныя для Вашага іміджу меры, па-сапраўднаму будзеце дбаць пра інтарэсы Беларусі, пра яе будучыню, пра памнажэнне нашага багацця, і не толькі матэрыяльнага, але і духоўнага, пра нашу культуру, без якой не можа быць ніякага прагрэсу, пра міжнародны аўтарытэт нашай маладой незалежнай краіны, дабіваца таго, каб нас паважалі ў свеце і не смяяліся з нашага невуцтва і нацыянальнага нігілізму.

Кастусь ЦВІРКА

ХТО ХОЧА ЗВАЦЦА БЕЛАРУСАМ

Аўтар гэтага ліста — беларус з Чэлябінска, былы журналіст, а цяпер мікрафермер (мае 20 сотак зямлі) Рыгор Сцяпанавіч Лявонцьеў. Ён ужо друкаваўся ў «ЛіМе», чытачы, пэўна, памятаюць ягоны цікавы ліст аб сваіх фермерскіх поспехах, змешчаны ў штотыднёвіку за 3 чэрвеня г. г.

У жніўні Р. Лявонцьеў прыязджаў на радзіму, быў у Мінску, зазірнуў і да нас у рэдакцыю, каб падзяліцца сваімі ўражаннямі ад наведвання бацькоўскага краю, думкамі і развагамі аб нашым нялёгкім часе, аб сённяшняй сітуацыі ў нашай маладой незалежнай краіне і яе будучыні. На развітанне папрасіў колькі сёлетніх нумароў штотыднёвіка, бо выпісаць «ЛіМ» у Расіі не змог.

А не так даўно ад Рыгора Сцяпанавіча прыйшло пісьмо, а ў ім — гэты ліст. Шкада, што ён спазніўся, прыйшоў тады, калі ўжо скончылася падпісная кампанія. Тым не менш, мы вырашылі яго надрукаваць. Не дзеля таго, каб выхваляцца, а дзеля таго, каб нейк падмацаваць і нашу, і чытацкую веру ў тое, што праца наша — не марная.

Разам з лістом Р. Лявонцьеў прыслаў і досыць аб'ёмныя нататкі пад назвай «Баліць маё сэрца за Беларусь». Мы іх абавязкова падрыхтуем да друку і пазнаёмім з імі нашых чытачоў. А пакуль што — вось гэты ягоны кароткі ліст пра наш родны і любімы «ЛіМ».

Шаноўныя супрацоўнікі «ЛіМа»!

Сардэчны вам дзякуй за каштоўны падарунак — падабраны для мяне камплект вашага штотыднёвіка. Акрамя старонак з тэлетыднем, прачытаў усё да апошняга радка.

Магчыма, вам гэтага не зразумець, але калі чытаеш беларускія тэксты ва ўмовах поўнага панавання рускай мовы і асобных размоў на татарскай мове, дык з больш абвостраным пачуццём успрымаеш усё багацце беларускай мовы, яе адметны гукавы лад, асаблівую сілу выразнасці шматлікіх слоў, якая страчваецца пры перакладзе. Несумненна, руская мова вельмі багатая, але не менш багатая і беларуская мова, прытым яна яшчэ са сваім характэрным адценнем пяшчотнасці, што асабліва выяўляецца ў паэзіі.

Толькі цяпер я змог зразумець душэўны стан тых маладых беларускіх хлопцаў, якія ў пачатку XX стагоддзя прыехалі вучыцца ў Пецярбургскім універсітэце ці ў іншых расійскіх навучальных установах. Тым часам у гімназіях грунтоўна вывучалі лацінскую мову, яе веданне давала магчымасць лягчэй авалодаць нямецкай, англійскай, французскай мовамі. У шматколерным букеце разнамоўных слоў яшчэ вастрэй адчуваўся «пах» роднай беларускай мовы, у душы нарастала неадольнае імкненне да беларускасці, жаданне дапамагчы роднаму народу ўсвядоміць сябе нацыяй.

З тых маладых людзей выйшлі вядомыя ўсяму свету паэты, вучоныя, грамадскія дзеячы. Іх імёны і справы сталі гісторыяй і славай Беларусі.

Гэты ліст я адрасую не толькі супрацоўнікам «ЛіМа», але і тым маладым хлопцам і дзяўчатам, хто сёлета паступаў у тэхнікумы ці інстытуты і «зрэзаўся» па беларускай мове. З вышыні свайго ўзросту (а мне за 50) і ведаў я раю ім выпісаць «ЛіМ». Калі ўважліва чытаць ягоныя нумары хоць бы на працягу 4 — 5 месяцаў, дык любы экзамен па беларускай мове і літаратуры не будзе страшны. І калі будзе субяседаванне нават на самым высокім інтэлектуальным узроўні, вынік яго будзе станоўчы для абітурыента з «ЛіМам».

У Беларусі ці не 85 працэнтаў насельніцтва жыве ў гарадах, а там жа пераважна карыстаюцца рускай мовай. У сувязі з павышанымі патрабаваннямі на экзаменах па беларускай мове ў некаторых сем'ях, дзе ёсць старшакласнікі, бацькі падумваюць аб рэпетытарах. Выгадней, танней і больш надзейна выпісаць для дзяцей «ЛіМ».

На першай старонцы «ЛіМа» напісана, што гэта газета творчай інтэлігенцыі Беларусі. Можна было б напісаць, што гэта газета і тых, хто хоча звацца беларусам, хто жадае стаць культурным чалавекам. Бо гэта культурная і вельмі карысная газета.

Паверце мне, землякі.

Рыгор ЛЯВОНЦЬЕЎ

г. Чэлябінск

P. S. Падпіска на чацвёрты квартал закончылася. Але... Выпісаць «ЛіМ» на лістапад і снежань — можна. У любым паштовым аддзяленні.

«Здань блукае па Еўропе — здань камунізму» — гэтымі, амаль што вершаванымі, радкамі палохалі еўрапейскага абывацеля без малога дзвесце гадоў таму маладыя, тады яшчэ жартаўлівыя класікі марксізму. Здань тая ў 1922 годзе раптам стала вельмі сур'ёзнай рэальнасцю — Савецкі Саюз, які неўзабаве стаў нядобра здзіўляць свет размахам сваіх «будоўляў камунізму» і наганяць вялікі страх атамнымі і вадароднымі бомбамі... Але, як і належыць усякай прывіднай рэальнасці, ён гэтак жа нечакана ў 1991 годзе знік з твару зямлі, пакінуўшы пасля сябе шматлікія ГУЛАГі з Курапатамі, загнаную ў тупік эканоміку ды гіганцкую азлобленую армію, якую няма чым карміць. Невядомыя, аднак, шляхі Гасподнія: для былога савецкага абывацеля гэты злавесны прывід ізноў, як быццам, пачынае напаўняцца нейкай дзівоснай прыцягальнасцю. Зусім як у старамодным расійскім рамансе: «вернись, я все прощу!»... Камуністы на гэтай хвалі ўсур'ёз збіраюцца набраць галасы на выбарах; злавесная здань пачынае зноў блукаць па прасторах адной шостай планеты. Паўсюдна можна пачуць прароцтвы аб хуткім уваскрэсенні вялікага мерцвяка — Савецкага Саюза...

Мікалай КРУКОЎСКІ

ЗДАНІ ЎЗНІКАЮЦЬ АПОЎНАЧЫ...

Перш чым разгледзецца, у чым тут прычына і што нам абяцае той страхавіты мярцвяк, што вылазіць з віскулёўскай магілы, заглянем на першыя старонкі яго, так бы мовіць, гісторыі хваробы. Заадно кінем погляд і на продкаў яго, ці не было там якой нядобрай спадчыннасці. Трэба адразу ж прызнаць, што продкі ў яго былі дастаткова шаноўныя: Платон, Кампанела, Томас Мор, Сен-Сімон. А што да Роберта Оўэна, дык гэты вялікі гуманіст, па сведчанні Герцэна, увогуле быў мілейшы чалавек. Прынамсі, усе яны жадалі дабра чалавецтву і ніяк не намерваліся навязваць яму гэтае дабро кулакамі. Як у вялікіх летуценнікаў, іх праекты стварэння справядлівага грамадства былі для іх і іх прыхільнікаў дарагой і салодкай марай. Марай, заснаванай на хрысціянскай ідэі дабра і любові да бліжняга (Платона таксама можна лічыць у пэўным сэнсе папярэднікам хрысціянства).

Некалькі інакш выглядалі справы ў нашых «класікаў», заснавальнікаў г. зв. «навуковага камунізму». Яны хутка расчараваліся ў ідэалізме сваіх вялікіх папярэднікаў і, жадаючы як мага эфектыўней ператварыць свае ідэалы ў рэальнасць, узялі сабе на ўзбраенне паслядоўны, «круты», як цяпер гавораць, матэрыялізм. На першае месца яны паставілі эканоміку, рашуча адкінуўшы рэлігію як «опіум для народа» і аб'явіўшы мараль з яе духоўнымі каштоўнасцямі ўсяго толькі «надбудовай» над базісам. Адгэтуль зусім лагічна выцякала, што і ў рэвалюцыйнай практыцы яны сталі арыентавацца на сацыяльныя нізы — пралетарыят, а ў спосабах рэалізацыі сваіх намераў — на матэрыяльную сілу і гвалт (успомнім славутую формулу Маркса: «Ідэя, авалодаўшы масамі, становіцца матэрыяльнай сілай»). З той жа паслядоўнасцю адгэтуль вынікала, што і ў палітыцы на першы план высоўвалася дыктатура пралетарыяту, меўшая такія далёкасяжныя і страхотныя наступствы. І тое не было вынікам нейкіх нядобрых асабістых рысаў «класікаў», хоць Бакунін і адзначаў, напрыклад, у Маркса непрыемныя дыктатарскія замашкі. Агульны дух еўрапейскай культуры пачынаў ужо тады, згодна Шпенглеру, паціху выветрывацца і хіліцца да таго, што ён называў цывілізацыяй як бы прадвяшчаючы будучы Untergang des Abendlandes, з характэрным для гэтай эпохі прагматызмам і матэрыялізмам. Побач з матэрыялістам Марксам жылі і тварылі такія вучоныя, як Дарвін з яго страшнаватаю барацьбой за існаванне, што выклікала пярэчанні нават у анархіста Крапоткіна і спарадзіла г. зв. сацыяльны дарвінізм. Побач з Марксам пісаў Бальзак з яго памешанымі на грошах Габсекамі і цынічнымі Растыньякамі. Не без іх уплыву Ніцшэ абвесціць, што «Бог памёр»... Міжволі думаецца, ці не з той жа прычыны праскочыла ў Маркса з Энгельсам амаль зусім па Фрэйду тое злашчаснае слоўца-агаворка «прывід»? Так ці інакш, але ў Еўропе марксаўскі экстрэмізм быў заўважаны. І такія паслядоўнікі Маркса, як Кауцкі і Бернштэйн, адышлі ад яго пазіцый, «рэабілітавалі» мараль і далі пачатак развіццю сучаснай еўрапейскай сацыял-дэмакратыі...

Зусім іншымі шляхамі пайшла гісторыя ў Расіі. Тое, што ў тагачаснай Расіі амаль што не было пралетарыяту і што Ленін, раскалоўшы міжнародны рэвалюцыйны рух, змушаны быў фактычна рэвізаваць марксізм, каб прыстасаваць яго да расійскай спецыфікі, агульнавядома, як агульнавядома і крытыка яго заходнееўрапейскімі марксістамі. З гэтай прычыны Ленін яшчэ больш звузьгарызаваў і завастрыў «матэрыяльна-сілавыя» характарыстыкі марксізму, якія набывалі ў яго аўтарстве проста цынічныя рысы.

Куды меней, аднак, асвятляўся афіцыйнай гістарыяграфіяй другі важнейшы аспект праблемы — нацыянальны. Калі ў класічным марксізме ён адступаў на далёкі план, замяняўся пралетарскім інтэрнацыяналізмам (што пераходзіў у Маркса нярэдка ў абстрактны касмапалітызм — «рабочыя не маюць айчыны»), то ў шматнацыянальнай Расіі, «турме народаў», па вядомым выразе Леніна, гэты аспект не мог не пасунуцца на першы план. Тое ж самае было б, толькі з процілеглым знакам, і ў выпадку, калі б Расія была монанацыянальнай дзяржавай, як, напрыклад, Германія. Тады б сацыялізм, згодна ленінскай формуле аб магчымасці перамогі ў адной асобна ўзятай краіне, абавязкова атрымаў бы прыстаўку «нацыянал» з усімі выцякаючымі адсюль наступствамі, як і здарылася ў Германіі ў 1933 годзе... Так ці інакш тагачасная Расія ўяўляла сабою туга зацягнуты вузел класавых і нацыянальных супярэчнасцей, і апошнія з іх былі, можа быць, нават куды вастрэйшымі, чым першыя. Ды і класавыя супярэчнасці існавалі не столькі паміж рабочымі і капіталістамі, як тое хацелася Леніну для распачатку будовы сацыялізму ў Расіі, колькі паміж адсталым феадальным ладам і растучай нацыянальнай буржуазіяй. Нездарма ў лютым 1917 года рэальна быў звергнуты менавіта царызм, і імперска-феадальная Расія адразу ж пачала імкліва распадацца на шэраг самастойных нацыянальна-дзяржаўных утварэнняў: Фінляндыя, Польшча, Украіна, Беларусь, прыбалтыйскія і закаўказскія самастойныя рэспублікі. Рэвалюцыя 1917 г., як не раз ужо прыходзілася пісаць, насіла не столькі класавы, колькі нацыянальна-вызваленчы характар.

Далей жа ўсё пайшло ў поўнай адпаведнасці з Марксавай метафарай прывіднасці. Прывідам была так званая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя, якую нават самі бальшавікі называлі спачатку проста пераваротам. Прывідам неўзабаве стане і Савецкі Саюз, у склад якога бальшавікі пачнуць з імпэтам заганяць разбеглыя нацыянальныя рэспублікі, не грэбуючы не толькі мардабоем (успомнім вядомую грузінскую справу), але і крывёй. За гэтым другім прывідам будзе хавацца старая знаёмая рэальнасць — Расійская імперыя, атрымаўшая ўжо рысы дзяржаўнага капіталізму , ці, па класіфікацыі Леніна, імперыялізму. Зрэшты, і сам Ленін лічыў СССР параджэннем расійска-імперскага шавінізму. Імперыялізм гэты ў сталінскія і постсталінскія часы будзе выступаць перад намі яшчэ ў адной масцы —масцы «развітога сацыялізму». І, нарэшце, самі камуністычныя партакраты нацягнуць на сябе прывідныя маскі служак народа і «будаўнікоў камунізму», хаваючы пад імі сваю сапраўды буржуазную сутнасць, за што некалі Мілаван Джылас па марксісцкай жа тэрміналогіі трапна акрэсліць іх як «новы клас». І што, дарэчы, зусім не перашкодзіць ім добра арыентавацца ў пасляперабудоўчыя кампрадорска-буржуазныя часы, перасеўшы з чорных «Волгаў» у шыкоўныя ўласныя мерседэсы... Так праславутая «сацыялістычная рэчаіснасць» аказалася чымсьці падобным да гётэўскай Вальпургіевай ночы, дзе, як вядома, таксама нялёгка было адрозніць здань ад рэальнасці і саладжава-прыгожую маску ад страхатлівай, агіднай морды...

Не дзіва, што як толькі вецер гісторыі падзьмуў мацней, усе тыя прывіды і маскі імгненна зніклі, як і самая вялікая з іх — Савецкі Саюз, што бясслаўна закончыў у Віскулях сваё напалову містычнае існаванне. Тым болей «містычным» можа здацца той факт, што гэты прывід зноў пачынае з'яўляцца сёння, палохаючы сумленных людзей. Але дзеля гэтага маюцца даволі рэальныя прычыны, і карэняцца яны зноў-такі ў гісторыі. Яшчэ вялікі Гегель, як вядома, зазначыў, што ўсё ў гісторыі з'яўляецца двойчы: спачатку ў форме трагедыі, калі «духоўнае» рэзка пераважае над «рэальным», а затым — як камедыя, у якой, наадварот, рэальнасць высоўваецца на першы план. Думку гэтую любіў паўтараць і Маркс. У XX ст. яе пераканаўча пацвердзілі на багатым фактычным матэрыяле славуты ангельскі гісторык Тойнбі, выдатнейшы сацыёлаг сучаснасці амерыканец Сарокін і памянёны ўжо Шпенглер (дарэчы, і ў нас на Беларусі канцэпцыя тая распрацоўвалася амаль што чвэрць стагоддзя ў эстэтычным кантэксце і чыталася ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, ды ўсё ж такі была прыдушана калегамі-філосафамі, як ні дзіўна, ужо ў цяперашнія, постперабудовачныя часы...). З гэтай канцэпцыяй выдатна стасуецца летуценна-ідэальны, рамантычны характар вучэння папярэднікаў класічнага марксізму. Той характар часткова захоўваецца ў Маркса і Энгельса, хоць набывае пад уплывам дыяматна-гістматаўскага светапогляду тыя самыя характэрныя рысы «прывіднасці». Пры далейшым гістарычным развіцці, па меры паступовага перамяшчэння рэвалюцыйнага эпіцэнтра з Захаду на Усход, на тэрыторыю Расійскай імперыі, рысы тыя прымалі ўсё больш і больш злавесныя «матэрыяльна-сілавыя» адценні: заклікі «к топору» і да т.п. Яшчэ да наступлення марксісцкай эпохі гэта было заўважана Дастаеўскім, які адлюстраваў іх у рамане «Бесы».

У часы панавання марксізму-ленінзму і асабліва сталінскага яго варыянту наступае перыяд сапраўды д'ябальскай вакханаліі зла: чэкісцкія зверствы, масавыя расстрэлы, ГУЛАГ, ваяўнічае невуцтва і ідэалагічнае цемрашальства, словам, усё тое, пра што, сяму-таму вельмі хацелася б, каб народ не ведаў... Разам з тым захоўвалася і пэўная інерцыя ідэальна-рамантычнага складніку марксісцкага вучэння. Тая рамантыка штурхала рэвалюцыянераў на эшафоты і катаргу, натхняла паэтаў, пісьменнікаў і мастакоў, заклікала моладзь на гераічныя подзвігі і працоўны энтузіязм. Што было, тое было: М. Астроўскі і У.Маякоўскі, А. Герасімаў і В. Мухіна, Д. Шастаковіч і С. Пракоф'еў... У нас, на Беларусі, таксама процьма адпаведных прыкладаў.

Але і «рамантыка» хутка вырадзілася, бо з самага пачатку мела ў сабе нешта жорсткае і бесчалавечнае («Ваше слово, товарищ маузер!» у Маякоўскага, альбо, напрыклад, псеўданім расійскага паэта: Павел Беспощадный). Рамантызм гэты з цягам часу сам стаў ілжывай маскай, за якой хаваліся самыя нізкія, «шкурныя», эгаістычныя інтарэсы: жаданне быць прыкмечаным начальствам, адхапіць Сталінскую прэмію, як было, напрыклад, з мастаком А. Герасімавым або са скандальна вядомым у свой час драматургам А. Суравым з яго п'есай «Зелёная улица»... Наступала ўжо не толькі камічнае, але нізкае, наступала сама брыдота. І вось калі маскі былі скінуты, і людзі ўбачылі сябе і ўсё акаляючае ў цынічна рэальным, бязлітасным святле. Фігавыя лісткі маралі і чалавечай духоўнасці раптам адваліліся, і мы аказаліся тымі самымі голымі малпамі, пра якіх некалі так здорава напісаў англійскі антраполаг Дэсманд Морыс...

Зразумела, на гэткім фоне колішняя рамантычная ідэальнасць, нягледзячы на яе відавочную прывіднасць, выклікае зараз у тых, хто імкнецца яшчэ неяк захаваць тое рамантычнае аблічча, салодка-пакутлівую настальгію па «великой эпохе» і «великому прошлому». Пісаў жа некалі Фрэйд, што зло забываецца першым, а добрае помніцца куды даўжэй... Настальгія тая, аднак, тое самае, што туга па маладосці, якая ніколі ўжо не вернецца. Соцыумы старэюць гэтак жа беспаваротна, як і біялагічныя арганізмы. Усур'ёз спадзявацца на тое, каб аднавіць былое, могуць адны толькі безнадзейныя «бальшавікі» накшталт Ніны Андрэевай альбо сумнавядомага генерала В. Сарокіна. У гісторыі грамадства, як у жыцці паасобнага чалавека, час ніколі не ідзе ў адваротным напрамку і аглядвацца назад можна толькі дзеля таго, каб выразней бачыць і разумець тое, што чакае наперадзе.

Ёсць, аднак,і ~~другая тыпу~~ настальгія па «великому и могучему» (Савецкаму Саюзу). Настальгія не па «рамантыцы», а па «матэрыяльна-сілавых» яго кляйнодах, па т. зв. «парадку». Настальгія куды больш небяспечная. «Навесці, урэшце, парадак і запусціць прамысловасць», — такі заклік можна пачуць зараз сярод палітыкаў маладзейшага веку, трапна названых кімсьці за іх неабальшавізм «маладымі

(Працяг на стар. 12)

ПРАЗ «Д'ЯБЛАВА МОРА» Ў ... ЛІТАРАТУРУ

У Алеся Аляшкевіча — дзве спецыяльнасці. Спачатку скончыў Лідскае музычнае вучылішча, а затым факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Выкладае музыку ў пасёлку Коласава. Тым самым з журналістыкай, як быццам, развітаўся. З журналістыкай — магчыма... Але прывабіла А. Аляшкевіча літаратура, а калі канкрэтней — фантастыка. А што ў гэтым жанры ён адчувае сябе ўпэўнена, можна даведацца, пазнаёміўшыся са зборнікам А. Аляшкевіча «Д'яблава мора», што стаў адной з чарговых кніжак «Бібліятэкі часопіса «Маладосць». Акрамя аднайменнай аповесці, у яе ўвайшлі два апавяданні — «Страшны суд» і «Чорная дзірка». Да ўсяго А. Аляшкевіч стаў зусім не А. Аляшкевічам, а маладым пісьменнікам Алесем Гарой. Магчыма, пад такім псеўданімам і лацвей веславаць праз «д'яблава мора» ў ... літаратуру.

«БЕЛАРУСКАЯ ДУМКА», N 8

Адкрываецца нумар вершам У. Караткевіча «Бабіна лета». Г. Булыка гутарыць з У. Гілепам, кіраўніком групы па стварэнні Нацыянальнага гісторыка-культурнага запаведніка «Нясвіж», першым намеснікам міністра культуры і друку Рэспублікі Беларусь («Нясвіжская жамчужына: другое нараджэнне). У раздзеле «Духоўны свет» —публікацыі У. Каклюхіна і В. Крукава «Акумулятары чалавечага духу», В. Салеева «Душа твая, чалавеча», У. Барысенкі «Вяртанне да будучага». У «Літаратурнай гасцёўні» новымі навеламі прадстаўлены У. Глушакоў. «Коннік белы ў чырвоным полі...» — артыкул А. Рогалева ў раздзеле «Вузлы айчыннай гісторыі. Альтэрнатыўны погляд».

А ВОСЬ І ДЗЕВЯТЫ НУМАР...

З Беластока «Часопіс» прыходзіць, бадай, хутчэй, чым некаторыя нашы рэспубліканскія выданні. У «Хроніцы мясцовасці» — расказ пра цяперашні пасёлак Орля, а яшчэ ў 1789 годзе мястэчка з гарадскімі правамі. Змешчана гутарка з паэтэсай З. Сачко і тры яе вершы. Расказв..цца пра фундацыю «Жыццё», якая мае намер разгарнуць шырокую дзейнасць, у тым ліку арганізаваць сетку турысцкіх баз. У календары верасня называюцца асноўныя даты месяца. Я. Янушкевіч падрабязна (калі ўлічыць невялікі памер нататкі) расказвае пра Б. Эпімах-Шыпілу. М. Ваўранюк дзеліцца ўражаннямі ад нядаўняга свята ў Пінску — «Фестываль у сталіцы Палесся».

«МАСТАЦТВА», N 8

У раздзеле «Эстэтыка» — артыкул С. Бенядзіктава «Сацыял-камуністычная асоба» і ўражанні М. Раманюка пра культурнае жыццё аднаго з самых эканамічна развітых нямецкіх гарадоў Штутгарта — «Агароджа для коней, альбо Вечны сад».

З. Лысенка («Пашырэнне дыяпазону») дзеліцца ўражаннямі ад камічнай оперы Г. Даніцэці «Viva la mamma» ў Дзяржаўным тэатры музычнай камедыі...

«Пакуль я пішу, я шчаслівы» — адказы Б. Акуджавы на пытанні гледачоў і журналістаў падчас наведвання Мінска. А. Мільто («Справаздача ліцэя») расказвае пра канцэрт выхаванцаў Рэспубліканскага ліцэя пры Беларускай акадэміі музыкі. Гэтыя матэрыялы аб'яднаны ў раздзел «Музыка».

Разнастайны раздзел «Выяўленчае мастацтва»: «У залатых водсветах цішыні» Т. Бондар, «Мініяцюры з каменю» Р. Паўлавец, «Найменне варта адрадзіць» А. Чарняўскай, «Нешараговы шараговец» Л. Налівайкі, іншыя публікацыі.

На розныя густы матэрыялы раздзела «Тэатр». Т. Катовіч («Ляцяць па небе шарыкі...») рэцэнзуе спектакль «Цырк Шардам» паводле Д. Хармса ў Акадэмічным тэатры Я. Коласа. Ж. Лашкевіч («Нешта, пра што мы не ведалі...») гутарыць з Б. Луцэнкам і С. Кузьміной пра знакаміты спектакль «Трагедыя чалавека» І. Мадача на сцэне Тэатра імя М. Горкага. Т. Ратабыльская запрашае на дыпломныя спектаклі выпускнікоў Беларускай акадэміі мастацтваў («Пачатак»).

Прадстаўлены рубрыкі «Мастацкае фота», «Гісторыя мастацтва», «Рэцэнзіі», «Падзеі, факты, інфармацыя».

Сярод кніг

«...КАБ НАЗВАЦЬ ЦЯБЕ, СВАБОДА»

Вось ужо больш двух дзесяткаў гадоў, як я ўражаны паэзіяй Гіёма Апалінэра, якога адкрыў для сябе на другім курсе Мінскага інстытута замежных моў. Тады я пазнаёміўся з некаторымі яго перакладамі на рускую мову (Антакольскі, Кудзінаў), а праз нейкі час прачытаў у арыгінале ў нашай былой Ленінскай бібліятэцы. Неўзабаве, роўна 20 гадоў назад, выйшаў у свет зборнік вершаў Гіёма Апалінэра «Зямны акіян». Гэта была першая спроба перакладчыцы Эдзі Агняцвет перадаць на нашай мове творы славутага французскага паэта, у жылах якога цякла беларуская кроў. Пазней Э. Агняцвет напіша, што ёю кіравала

Продкаў магутная сіла
Пэўна, падспудна паіла
Паэзію Апалінэра.

Пройдзе некалькі гадоў, і я з хваляваннем буду трымаць у руках кніжку яшчэ аднаго слыннага сына Францыі — Поля Элюара, якая выйдзе ў той жа серыі «Паэзія народаў свету» ў выдавецтве «Мастацкая літаратура». Пра гэта паэтка скажа з найвялікшым пачуццём адказнасці перад чытачом:

...Зноў я ў пакутах і стратах!
Трывожная, цяжкая мара:
Як мне сабраць па зярнятах
Магію слоў Элюара?

І вось зноў, на гэты раз — цэлае суквецце імёнаў, якія сустрэліся пад сціплай тонкай абгорткай: Гіём Апалінэр, Поль Элюар, Луі Арагон, Рабер Дэснос, Марыс Карэм, Жак Брэвер. Сустрэліся ў цудоўным мастацкім аздабленні вядомага мастака Анры Маціса, еўрапейскі іканапіс якога адмыслова перадае подых той эпохі, калі стваралі сваю паэзію згаданыя таленавітыя майстры слова.

Наклад кніжкі сціплы: 1000 асобнікаў. У наш бурлівы час вялікімі тыражамі выдаецца літаратура іншага кшталту. Мы бачым яе на кожным кроку: на аўтастанцыях, на вакзалах, у пераходах... Кідкія вокладкі прыцягваюць позіркі пажаданай да эротыкі і фантастычных прыгодаў моладзі. Але мне робіцца лягчэй на сэрцы, калі я ўспамінаю, што гэта ўжо ўсё было. Было ў Нью-Ёрку 30-х гадоў, у Парыжы 50-х, у Варшаве 80-х, у нас — цяпер. І яшчэ я супакойваюся, калі прыгадваю, што першы друкаваны зборнік вершаў Апалінэра «Бестыярый, альбо Картэж Арфея» выйшаў у 1911 годзе накладам у 120 асобнікаў. І адзін такі асобнік захоўваецца ў Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь. Яшчэ студэнтам, на пачатку 70-х, я гартаў яго дрыжачымі ад хвалявання пальцамі. І там таксама своеасаблівы настрой ствараюць гравюры выдатнага мастака Рауля Дзюфі, як цяпер яго стварае пластычная графіка Анры Маціса.

А зараз пагартаем кніжку, каб пераканацца, што магія слоў адчуваецца і ў перакладах. Пачнём з Луі Арагона. Вельмі сугучны сэрцам беларусаў, якія сёлета святкуюць вызваленне сваёй айчыны ад фашысцкай навалы, эмацыянальны верш «Французскі марш», напісаны паэтам у час другой сусветнай вайны:

Завулак кожны, сад і краскі
Мы вырвем з лютых рук германскіх!
І агарод, і свіран кожны
Нам вырваць трэба з рук варожых!
Узгоркі вырвем і лагчыны,
І могільнікі, і хаціны.

Бадай, такі ж імпэт, такую ж нянавісць да акупантаў мы бачым у вядомым вершы Янкі Купалы «Беларускім партызанам».

А вось гэтыя радкі каго вам нагадваюць?

Рэч дзіўная, урэшце, гэты свет.
І я пайду, не дасказаўшы слова.
Усё што меў: і поўдзень васільковы,
Пажар і ноч пакіне вам паэт.

Я, напрыклад, чытаю, і перад вачыма паўстае знаёмае аблічча: змарнелы, змучаны невылечнай хваробай, адзін у чужым паўдзённым горадзе, «малады верабей», наш незабыўны Максім...

Найвышэйшым гуманізмам і глыбокім непрыняццем войнаў прасякнуты верш Луі Арагона «Песня міру», што працягвае быць надзённым у наш жорсткі час, калі шмат дзе ліецца кроў:

СУПЫНІЦЕ АГОНЬ супраць
маці і сына яе,
супраць сэрца, якому яна
сэрца ўсё аддае!
СУПЫНІЦЕ АГОНЬ супраць шчасця
і добрых надзей,
СУПЫНІЦЕ АГОНЬ, каб палалі пачуцці
людзей!
СУПЫНІЦЕ АГОНЬ супраць класаў,
каткоў і садоў,
Супраць ясляў, дзе звонка
ад тоненькіх галасоў,
Супраць смеху дзяцей, што глядзяць
на палёт галубоў...

Хацеў бы звярнуць увагу на добра перададзены каларыт у вершах Рабера Дэсноса «Зебра», «Мурашка», «Светлячок». Пераклады вельмі ўдаліся, і гэта, вядома, не толькі таму, што перакладчыца — вядомая дзіцячая паэтка. Напэўна, і па духу яна з Дэсносам мае шмат агульнага.

Напрыклад, у вершы «Мурашка»:

Як мурашка падрастае —
Васемнаццаць метраў мае.
Гэта — казка-небыліца!

Цягне воз яна да хмары,
А на возе — трутні-скнары...
Гэта — байка-небыліца!

А мурашка размаўляе
Па-французску, па-гавайску.
Гэта — казка-небыліца!
Хто ў такую верыць казку?

У перакладзе верша Жака Прэвера «Я — гэта я», як мне падаецца, Эдзі Агняцвет памайстэрску перадае споведзь сучаснай

З французскай і бельгійскай паэзіі. Пераклад Эдзі Агняцвет. «Мастацкая літаратура», Мн., 1993.

ЗАСТАВАЦЦА БЕЛАРУСАМ

Прысутнасць Масея Сяднёва ў нашай літаратуры сёння, безумоўна, вельмі адчувальная. І не толькі як аднаго з найбольш яркіх прадстаўнікоў беларускага замежжа, які мае шэраг твораў, што па сваіх мастакоўскіх вартасцях не саступаюць напісанаму іншымі, чые жыццёвыя і творчыя пуцявіны былі няпростымі і пакручастымі. Прысутнасць М. Сяднёва ў беларускай літаратуры — найперш у тым, што, гаворачы сёння аб яе набытках, нельга не прымаць пад увагу яго вершаў, прозу, эсэістыку. І што не менш важна — М. Сяднёў, нягледзячы на паважаны ўзрост (летась Масею Ларыёнавічу, як вядома, споўнілася восемдзесят гадоў), па-ранейшаму працуе вельмі актыўна. Асабліва ў публіцыстыцы і эсэістыцы. М. Сяднёў спяшаецца выказацца па самых набалелых праблемах, што ў аднолькавай ступені хвалююць беларусаў, дзе б яны ні жылі — пытанні Адраджэння, росту нацыянальнай свядомасці, культуры мовы і г. д. Яны знайшлі сваё адлюстраванне і ў новай кнізе М. Сяднёва, шматзначна названай «Масеева кніга», што аператыўна выпушчана выдавецтвам «Мастацкая літаратура».

Якую задачу ставіў перад сабой аўтар, бачна з невялікага ўступу: «У тваіх руках, паважаны чытач, «Масеева кніга», створаная з агледзін крыжовай дарогі майго чалавечага лёсу, з назіранняў за літаратурным працэсам на далёкай Бацькаўшчыне, з тужлівых пачуццяў вяртання праз дзесяцігоддзі... Паводле першапачатковай задумы кніга мелася быць у нейкай ступені філасофскай, менавіта Масеевай кнігай. І калі ёй не ўдалося стацца такой, дык асабістай яна сталася ў поўнай меры: на яе старонках аўтар паспрабаваў выказаць сваё патаемнае, чутае душой. Маім адзіным жаданнем было — сцвердзіць сябе, гэта значыць выказаць сябе абсалютна свабодна ў закранутых пытаннях».

Аднак, як заўважае М. Сяднёў, гэтымі пытаннямі змест зборніка не абмяжоўваецца: «У кнізе, у яе цэнтры ляжыць нібы другая, асобная кніга — «біблейскія» вершы і пераклады. Ладна дапоўнілі кнігу лісты — мае і мной атрыманыя. За радкамі бачацца людзі, высвечваецца час, угадваецца і сам аўтар, не важна як — адмоўна ці дадатна».

Адным словам, споведзь душы. Душы збалелай па ўзаемаразуменню, не адно дзесяцігоддзе пазбаўленай магчымасці кантактаў.

Споведзь пачынаецца з раздзела «Адкрыццё Бацькаўшчыны». Адкрыццё, што адбылося праз шмат дзесяцігоддзяў, калі ўжо М. Сяднёў і спадзявацца не мог, што нарэшце зноў зможа ўбачыць любую Беларусь. Зрэшты, пра гэта прачула сказана ў першым артыкуле «З Менску—у Мінск» (чытач лёгка заўважыць, што асобныя з матэрыялаў «Масеевай кнігі» публікаваліся ў «ЛіМе», іншых рэспубліканскіх выданнях).

Вяртанне ў гады юнацтва. Згадкі аб пісьменніках, сустрэча з якімі аказала ўплыў на ўсё жыццё і тое асабістае, за чым паўстаюць, як кажуць, сам час, сама эпоха: «Дазволю сабе яшчэ раз вярнуцца да майго Менску. Менск — гэта мой лёс, у ім я жыў, паміраў і ў ім цяпер нібы ўваскрос. Але Менск — гэта не толькі мой лёс. Гэта лёс цэлай нашай літаратуры, лёс ейных творцаў у вялікай колькасці — фатальны лёс. Менск — гэта, можна сказаць, калыска нашай літаратуры і адначасна — ейная Галгофа».

Здавалася б, радасць сустрэчы дапаможа ў нечым забыць аб жудасным. Але такая яна, чалавечая памяць, што не адным добрым жыве. Ды і як забыцца, калі водгалас таго страшнага і сёння нагадвае пра сябе скалечанымі людскімі лёсамі, загубленымі жыццямі. А яшчэ тым нацыянальным нявер'ем, што, бадай, каранямі пачынаецца з канца трыццатых гадоў, калі знішчалася сама беларускасць, а новыя парасткі яе, якія было з'явіліся пазней, не маглі ўжо прабіцца праз асфальт нацыянальнага нігілізму.

Таму душа не толькі радуецца, душа і ў роспачы. Як жа сталася, што беларусы забыліся, што яны найперш беларусы: «Дык вось з старога Менску, з майго Менску, я наведаў новы, малавядомы мне Мінск, я сказаў ужо — прыгожы, шыкоўны горад, які мне трэба яшчэ вывучыць, палюбіць. Ды ўсё ж, калі я хадзіў ці ездзіў па ім — аўтобусам, тралейбусам, метро, машынай, — прыглядаўся, прыслухоўваўся, напрыклад, да суцэльнай небеларускай гаворкі, да саміх людзей, добрых, цярплівых, міласэрных і прыгожых, мне неяк міжволі прыходзіла думка — з'ехала некуды Беларусь, тая, што я ведаў, і пытаўся ў сябе самога, ці вернецца яна і калі?»

Напісана ў 1990 годзе, вылілася ў споведзь пасля першага наведвання Радзімы. «Ці вернецца калі-небудзь Беларусь?» — бадай, асноўная думка, што прысутнічае і ў згаданым артыкуле і ў многіх іншых. Не, пытанне М. Сяднёвым так прама, безумоўна, не ставіцца. Але яно нязменна дае аб сабе знаць. Праз трывожны роздум аўтара аб сённяшнім дні Бацькаўшчыны, праз яго вяртанні ў перажытае, праз жаданне адчуць, убачыць, зразумець, а што ж чакае ўсіх нас наперадзе, у той Беларусі, да якой мы імкнёмся і якую будуем.

У гэтых развагах сцвярджэнне «Мы не можам талпацца ў мінулым» (а менавіта так названы адзін з артыкулаў) напачатку падаецца больш, чым дзіўным. Тым больш, што аўтар мае на ўвазе не проста мінулае, а багатую нацыянальную гісторыю. М. Сяднёў, безумоўна, не супраць таго, каб памятаць, адкуль мы і хто мы... Трывога яго ўзнікла з іншай нагоды. І трывога зразумелая: «Не ўзняла беларускага патрыятызму і наша прапаганда Кастуся Каліноўскага і Т. Касцюшкі. У гістарычных творах Уладзіміра Караткевіча беларус не пазнае сябе.

Агітуем за адраджэнне, але адраджэння, актыўнага працэсу адраджэння, на жаль, няма. Няма дынамікі. Няма руху. Ёсць статыка. Агулам беручы, беларус, як бы выключыў сябе з гісторыі, застаўся па-за ёю».

эмансіпаванай жанчыны, якая дужа ўпэўнена ў сваіх вартасцях.

Не пазбаўлены глыбокай жыццёвай філасофіі і верш «Цырк», які дасціпна завяршаецца словамі:

У кожнага свой цырк,
Панове!

А вось верш Прэвера «Песня пра Сену» дужа пераклікаецца з шэдэўрам Апалінэра «Пад мостам Мірабо». Асабліва рэфрэн:

У Прэвера:

Плыве сабе спакойна
І дзень, і ноч, і год.

У Апалінэра:

Гадзіннік выбіў: ноч ідзе
Застаўся я, прамчаўся дзень.

Напэўна, абодва чэрпалі натхненне з фальклору, ці, можа, гэта вынік аднолькавых гістарычных рэмінісцэнцый...

Бельгійскі паэт Марыс Карэм сваім першым вершам нагадаў мне аднаго з сучасных беларускіх класікаў:

Я нарадзіўся ў цяжкі дзень нястачы,
Але на вуліцы крынічнай свет я ўбачыў.
Багацця хата родная не мела,
Але была бялізна, як снег, бела.

У яго вершах нянавісць да срэбралюбства, да тых, хто адчувае сябе рабамі золата:

А ў целе, пад панцырам залатым,
Глуха б'ецца
Сытае сэрца —
Да ўсяго раўнадушнае, апроч золата.

(«Золата»)

Узнёслая і простая любоў да маці:

І маці ў здзіўленні заўсёдным
Уважна ўглядаецца ў вочы мае:
«Ты, пэўна, сынок мой, галодны?»
Ніколі адвагі ў мяне не стае —
Сказаць, як люблю яе моцна!
А маці руку адхіляе цішком:
Збаночак, як круглае сонца,
Ўзнімае і поіць мяне малаком.

(«Рукі маёй маці»)

І шчымлівая туга па далёкім дзяцінстве, якое ўжо не вернецца ніколі:

І ў люстэрку ў сваім сутарэнні
Ён убачыў кагось, як у сне:

Хтось глядзеў на яго, у здзіўленні,
Наіўнымі, дзіцячымі вачамі
І плакаў над сівымі валасамі...

(«Успамін»)

У тым жа ключы, але з большым аптымізмам, напісаны верш «Свет дзяцей», у канцы якога паэт сцвярджае, нягледзячы ні на што: «Дзеля маленства варта жыць!»

З тым жа настроем чытаюцца вершы «Зялёны ліст» і «Няўжо ніколі, як дзіця»...

Адзначыўшы вартасці многіх перакладаў, не магу не сказаць і пра недахопы. Некаторыя пераклады шмат губляюць, калі не захоўваецца ўнутраная гармонія верша. Гэта можна засведчыць на прыкладзе знакамітага шэдэўра Гіёма Апалінэра «Мост Мірабо», які ўжо зрабіўся хрэстаматыйным.

Вершу ўласцівая вельмі строгая і дакладная рытміка, ён музыкальны й лёгкі ў арыгінале. Нягледзячы на адсутнасць пунктуацыі, ад якой Апалінэр свядома адмовіўся ў 1912 годзе, верш «трымаецца» за кошт мелодыі, якая нібы той стрыжань працінае яго. На гэты стрыжань нанізаны простыя, звычайныя словы. Менавіта меладычнасць, песеннасць і ствараюць незабыўнае ўражанне, зачароўваюць чытача.

У перакладзе мы бачым, здаецца, тыя ж самыя словы, якія адпавядаюць па сэнсу, але, паколькі мелодыя парушана, то пераклад у многім страчвае:

Пад мостам Мірабо струменіць Сена,
Нібы каханне наша.
Запомніць трэба, што бядзе на змену
Прыходзіць радасць вокамгненна.

Пра тое, што перакладчыцы ўдаецца шмат дзе захаваць меладычнасць арыгінала, сведчыць пераклад не менш вядомага верша Поля Элюара «Свабода», ён гучыць па-беларуску з такім жа настроем, як і па-французску.

Многія вершы з гэтай сціплай кніжкі засталіся па-за маёй увагай. Я ўбачыў толькі тое, што ўбачыў. Нехта ўбачыць нешта іншае. Але гэта кніжка вартая прачытання, яна — пэўная з'ява ў культурным жыцці нашага грамадства, якое толькі выходзіць на цярновы шлях спазнання сваёй свабоды. І карціць зноў прыгадаць Элюара:

Мне сілу дае гэта слова,
Я зноў жыццё пачынаю
Народжаны я, каб спазнаць цябе,
Каб назваць цябе,
СВАБОДА.

Уладзімір ПАЛУПАНАЎ

Віншуем!

УЧАРАШНІЯ І СЁННЯШНІЯ ПРЫЧАЛЫ

Дазволю невялікі ўспамін. Дакладна, праўда, не памятаю з 1965 ці з 1966 года... Адно магу пэўна сказаць: вучыўся я тады на першых курсах універсітэта. І, безумоўна, як і ўсе мы, учарашнія вясковыя юнакі і дзяўчаты, любіў хадзіць на сустрэчы з пісьменнікамі. Акурат «Цэнтральная» кнігарня ў Мінску часта арганізоўвала іх. Неяк завіталі туды Іван Шамякін, на той час ужо аўтар рамана «Сэрца на далоні», якім зачытваліся літаральна ўсе, і некалькі яго калег па пяру. Запомніў толькі І. Шамякіна, а яшчэ А. Вольскага, бо ў абодвух браў аўтографы. І. Шамякіна і раней чытаў, а з А. Вольскім знаёмства пачалося з той сустрэчы. З яго кнігі паэзіі «Далёкія і блізкія прычалы», на якой аўтар напісаў мне колькі слоў-пажаданняў.

Гэтую кніжку і цяпер захоўваю. Выдадзена яна ў 1962 годзе. А побач — іншыя зборнікі Артура Вітальевіча. Як для дарослых, так і для дзяцей. І ўсё ж тая першая асабліва дарагая. Бо з яе і пачалося знаёмства з цудоўным паэтам. Знаёмства з не менш цудоўным чалавекам было наперадзе, калі пачаў працаваць у «ЛіМе».

І цяпер, калі прыгадваю даўні аўтограф, далёкую ўжо сустрэчу, думаю: не было б яе, магчыма, інакш бы ставіўся б і да творчасці А. Вольскага. Усё ж, пагодзімся, гэта вельмі важна, калі знаёмства з тым ці іншым творцам адбываецца, як мага раней і пры тым пры абставінах, што запамінаюцца.

Але знаёмства знаёмствам, а творы — творамі... На іх, на творы, безумоўна, нямала ўплывае і асабістая біяграфія аўтара. Як вядома, будучы пісьменнік нарадзіўся ў колішнім Койданаве, дзе на той час служыў яго бацька, пазней вядомы беларускі празаік і драматург Віталь Вольскі. Артур, як і яго аднагодкі, рос дзіцем свайго часу. Шмат у чым неспакойнага, бурлівага, і, як мы цяпер ведаем, супярэчлівага. А. Вольскі любіў не толькі літаратуру, захапляўся і маляваннем. У 1938 годзе паступіў у Віцебскае мастацкае вучылішча, стаў бы мастаком, калі б не вайна... Была эвакуацыя на Урал, адкуль прызвалі на службу на Ваенна-Марскі Флот, ажно на Далёкі Усход. Пачалася новая паласа і біяграфіі: «Мінёр... Боцман... Ваенны журналіст». Прымаў удзел у баях супраць імперыялістычнай Японіі. Дэмабілізаваўся толькі ў 1952 годзе.

Адарваны ад роднай Беларусі, некаторы час пісаў па-руску. На рускай мове з'явілася ў 1953 годзе і аповесць «Родная сям'я» (Хабараўск). Разам з пісьменнікам Барысам Іртышскім, з якім служыў на флоце, А. Вольскі расказваў пра юнакоў, прызваных на флот пасля вайны. Марская тэматыка заняла значнае месца і ў першай аўтарскай кніжцы «Маленькім сябрам» (яна ўбачыла свет у 1955 годзе ў тагачасным Дзяржаўным выдавецтве БССР). А перад тым, як з'явіцца «Далёкім і блізкім прычалам», выйшла і першая «дарослая» па-беларуску «Водбліскі далёкіх маякоў» (1958).

Артур Вольскі ўваходзіў у паэзію, літаратуру, як творца, якога спачатку і на самай справе не ахвотна адпускалі «далёкія і блізкія прычалы». Уражанні ад флоцкай службы мелі ў памяці трывалы запас, і пра ўсё хацелася расказаць. Але паступова тэматыка твораў пашыралася, лірычны герой паэта ўсё пільней прыглядаўся да жыцця ўвогуле і станавіўся больш адкрытым, чыстым душой, даверлівы сэрцам.

Хоць былі ў А. Вольскага і іншыя «дарослыя» кнігі («Дабрата», «Выратавальны круг», «Наваселле дрэў», а таксама выбранае «Чалавек, якому баліць»), асмелюся сказаць, што пакрысе яго сапраўдным празваннем стала дзіцячая літаратура. І пачаўшы ў ёй як паэт, Артур Вітальевіч неўзабаве сцвердзіўся яшчэ як празаік і драматург.

Можна доўга пералічваць яго кнігі (іх ужо недзе пад дваццаць) таму запынюся на некаторых. Скажам, «Рагатка» (1971). У ёй А. Вольскі выступіў адразу як паэт і як празаік. І з першых жа старонак знайшоў адпаведную інтанацыю, каб зацікавіць маленькіх: «Добры дзень, дарагі дружа! Мне вельмі прыемна, што ты ўзяў у рукі маю кніжку. Цяпер яна ўжо і твая. Можна лічыць, што мы з табой пазнаёміліся. А пад канец кніжкі, магчыма, і сябрамі станем.

Аднак ты чакаеш абяцанай казкі? Добра.

Скажу табе, толькі па сакрэту: можа, гэта зусім і не казка. Сам памяркуй — што казачнага можа быць у рагатцы? У той самай рагатцы, якую ты, напэўна, добра ведаеш. Драўляная рагулька. Два гумовыя паскі. Раменьчык.

У гэты раменьчык
Кладзецца каменьчык...»

А ўзяць «Лясныя мастакі», «Жывыя літары» (абедзве выйшлі ў 1973 годзе), «А куды

падаўся дождж» (1974), «Ізумрудавы горад, дзе ты...» (1977). Займальна, захапляюча, па-майстэрску! Увогуле, напісанае А. Вольскім для дзяцей таму і важна, што яно грунтуецца на традыцыях народнай маралі, тых традыцыях, пра якія мы, на жаль, часта забываемся. А без іх жа ў выхаванні дзяцей не абысціся.

Важкія набыткі А. Вольскага ў галіне драматургіі. Разам з П. Макалём ён напісаў п'есы «За лясамі дрымучымі», «Марынка-крапіўніца», якія набылі сцэнічнае жыццё. Сумесна з Э. Доўнер — кінасцэнарый «Марынка, Янка і тайны каралеўскага замка». Па ім пастаўлены фільм. П'еса-казка «Сцяпан — вялікі пан», пакладзеныя на музыку Ю. Семянякам, стала першай беларускай аперэтай для дзяцей і загучала ў 1979 годзе з падмосткаў тэатра музычнай камедыі...

Ды гэта ўсё ўчарашнія жыццёвыя і творчыя прычалы Артура Вітальевіча, а заўтрашнія? Шлях да іх пралягае ўжо сёння. Пішуцца новыя творы, праводзяцца ўрокі ў школе — А. Вольскі з пісьменнікаў, якія вельмі ахвочыя сустракацца са сваімі маленькімі і юнымі чытачамі. А яшчэ шмат турбот займаюць грамадскія клопаты. Прынамсі, А. Вольскі з'яўляецца старшынёй Беларускага дэмакратычнага аб'яднання. Гэта таксама праца на карысць Адраджэння, у імя будучыні суверэннай Беларусі.

Семдзесят гадоў, хоць, ужо і не поўдзень, але яшчэ далёка не вечар. Асабліва, калі хораша і плённа пішацца. Калі душа гэткая няўрымслівая, як у юнацтве. Ды і на выгляд А. Вольскаму ніколі не дасі семдзесят. Бадай, тут і марская выпраўка сказваецца. А яшчэ нязменны аптымізм.

З днём нараджэння, дарагі Артур Вітальевіч! Новых Вам жыццёвых і творчых вёснаў!

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Катэгарычна? Магчыма... Не менш катэгарычна і гэта: «Я сказаў, ёсць сімптомы нацыянальнага абуджэння. Так, ёсць. Але не больш. Няма каму будзіць. Няма Правадыра. Правадыра, які падслухаў бы, чым сёння жыве душа беларуская. Падслухаў бы — і павёў. Нам патрэбен Правадыр, патрэбен сённяшні — а не ўчарашні — Кастусь Каліноўскі! Не з-пад шыбеніцы, а Кастусь Каліноўскі з трыбуны беларускага парламента. Каб сённяшняга Каліноўскага пачуў зняверaны беларускі народ і пайшоў за ім. Я малюся: «Прыйдзі! З'явіся! Паўстань!», «Паўстань, з народу нашага прарок!» І далей: «Наш народны фронт «Адраджэнне» — гэта, па сутнасці, пагляд назад, а не наперад». Сцвярджае гэта не хто-небудзь, а чалавек, што на ўласнай скуры адчуў: «Чырвоная зорка хлусіць» (словы М. Сяднёва з аднаго з яго раманаў). І гаворыць той, хто ніякага дачынення не мае да ўсёй закуліснай барацьбы, што часам вядзецца. Ён жыве Беларуссю. Ён жыў Беларуссю. Дык прыслухаемся да яго голасу. На карысць агульнай справы прыслухаемся. А калі не жадаем прыслухацца, дык памаўчым. Бо непрыманне чужых поглядаў мы «праходзілі» ўжо. У той самы час, калі... чырвоная зорка хлусіла.

Бадай, і сам Масей Ларыёнавіч разумее, як мы, да месца і не да месца ўжываючы сумніцельнае замежнае слова «плюралізм», на самай справе вельмі далёкія ад прымання рознасці поглядаў. Нездарма артыкул «Яшчэ раз пра мову» М. Сяднёў пачынае з агаворкі: «У нас, бывае, хваравіта ўспрымаецца адрозны пагляд на тое ці іншае пытанне, асабліва калі яно тычыцца такой сферы, як сфера нацыянальная. Гэта як нешта святое, чаго нельга чапаць. Устанавіўся нейкі казённы пагляд у гэтай сферы, і, барані Божа, не пагадзіцца з ім, паддаць яго крытыцы, нават самай лёгкай. Ці гэта тычыцца пытання беларускай дзяржаўнасці, ці пытання беларускай гісторыі, у прыватнасці, Вялікага княства Літоўскага — па кожнаму з гэтых і падобных пытанняў усталявалася ўжо зацвярдзелая догма, і парушыць яе пагражае вам ну проста «адлучэннем ад царквы». Тут ён адстойвае свой, уласны погляд наконт таго, якой быць беларускай мове.

Але раздзел «Адкрыццё Бацькаўшчыны» толькі частка «Масеевай кнігі». Ёсць у ёй і «Скрыжаванні» — вершы, найперш «біблейска-іранічныя», напісаныя апошнім часам, пераклады, падарожныя нататкі «Дзесяць дзён у Мюнхене», зноў лісты. Дарэчы, перапіска прысутнічае і ў заключным раздзеле «Лёс беларускіх паэтаў». М. Сяднёў і ў гэтым жанры выкарыстоўвае магчымасць лепей раскрыцца самому. Таксама адбываецца свайго роду дыялог. Дыялог на адлегласці. Дыялог праз сутыкненне і ўдакладненне думак. Дыялог праз патрэбу мець субяседніка.

Што да «Лёсу беларускіх паэтаў», дык гэта згадкі М. Сяднёва пра гэткіх жа пакутнікаў духу, як і сам ён. З успамінаў, пісаных у свой час па просьбе Хведара Ільяшэвіча для газеты «Новая дарога», што выдавала Беларускае аб'яднанне ў Беластоку, паўстаюць воблікі Сымона Баранавых, Міхася Зарэцкага, Тодара Кляшторнага, Алеся Дудара, Аляксандра Цвікевіча і іншых. Відавочна, што гэта не толькі паэты... М. Сяднёву дастаткова некалькіх штрыхоў, каб пераканаўча сказаць пра таго, хто пакінуў глыбокі след у ягонай памяці. У прыватнасці, гэта тычыцца згадак пра С. Баранавых, А. Цвікевіча.

Беларусам заставацца... Яшчэ адна думка, што пранізвае «Масееву кнігу». Заставацца, як застаўся ім М. Сяднёў. Як засталіся ўсе тыя, хто гэтаксама, як і ён, у далячыні ад Бацькаўшчыны пастаянна жылі Бацькаўшчынай.

Развагі наконт гэтага ў артыкуле «Грэшныя думкі на тэму беларускай мовы» гучаць упэўнена: «Беларусу наканавана быць беларусам, нават каб ён не хацеў ім быць, бо — добра ці дрэнна — ён нарадзіўся гэтакім, з'явіўся на свет Божы, і куды б ён ні пайшоў, да каго б ні прыставаў, да якой мовы ці культуры ні далучаўся б, ён усё роўна па прыродзе сваёй будзе заставацца — можа, нават не ўсведамляючы гэтага — беларусам, а галоўнае — яго гэтакім будуць лічыць, не зважаючы на ўсе высілкі прыстасавацца. Выхаду тут іншага няма, як толькі заставацца тым, кім ты нарадзіўся».

Чым не эпіграф да «Масеевай кнігі»?

А. М.

ПАМЯЦІ АЛЕСЯ АДАМОВІЧА

Прэс-канферэнцыямі, што праводзяцца ў Нацыянальным прэс-цэнтры ў Мінску, журналістаў не здзівіш. Іх рэгулярна практыкуе і Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь. І ўсё ж нядаўняя сустрэча, што прайшла ў аўторак, істотна рознілася ад аналагічных мерапрыемстваў. Прэс-канферэнцыя прысвячалася памяці Алеся Адамовіча — пісьменніка і грамадскага дзеяча, які, як вядома, у пачатку сёлетняга года заўчасна пайшоў з жыцця.

На прэс-канферэнцыі выступілі міністр культуры і друку А. Бутэвіч, дырэктар Інстытута радыяцыйнай бяспекі Акадэміі навук Беларусі В. Несцярэнка, скульптар С. Гарбунова, карэспандэнт газеты «Комсомольская правда» па Беларусі В. Ягорава.

Прагучала нямала ўхвальных слоў пра творчасць Алеся Міхайлавіча, падкрэслівалася, як шмат зрабіў ён дзеля таго, каб народ ведаў праўду пра чарнобыльскую катастрофу.

Адзначалася, што неабходна належным чынам увекавечыць ягоную памяць. Выдавецтва «Мастацкая літаратура» выпускае Збор твораў А. Адамовіча. Спачатку меркавалася (сам аўтар паспеў зрабіць заяўку), што ён будзе з трох тамоў. Цяпер вырашана выпусціць дадатковы, чацвёрты том, які складуць празаічныя і публіцыстычныя творы, напісаныя Алесем Міхайлавічам у апошнія гады яго жыцця.

Скульптар С. Гарбунова працуе над помнікам, які будзе ўстаноўлены на магіле А. Адамовіча ў вёсцы Глуша Бабруйскага раёна. Асноўныя выдаткі на ўстаноўку яго бярэ дзяржава, але вядома, якія сёння фінансавыя цяжкасці. Таму вырашана звярнуцца да ўсіх, каму дорага імя Алеся Міхайлавіча, па дапамогу ў зборы грошай на надмагільны помнік.

Просьба сродкі накіроўваць на СПЕЦРАХУНАК МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ДРУКУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ДЛЯ ЗБОРУ СРОДКАЎ НА БУДАЎНІЦТВА ПОМНІКА АЛЕСЮ АДАМОВІЧУ N 700701 У ГАРДЫРЭКЦЫІ БЕЛБІЗНЕСБАНКА г. МІНСКА, КОД 764.

ЗЫХОДЗЯЧЫ З УЛАСНАЙ НЕАБХОДНАСЦІ

26 і 27 верасня на сцэне Рускага тэатра Беларусі адбудуцца спектаклі «На дне» Максіма Горкага і «Макбет» У. Шэкспіра ў пастаноўцы нямецкага рэжысёра Рабэрта Чулі, які быў адным з фундатараў Тэатра на Руры, адметнага тэатральнага ўтварэння як для Нямеччыны, так і для Еўропы. «Як перад асобным акцёрам, так, вядома, і перад тэатрам... стаіць задача: толькі зыходзячы з уласнай неабходнасці, ізноў ды ізноў даводзіць сваё месца ў грамадстве. Першы крок у гэтым кірунку, такім чынам, абранне тэмы... і толькі пасля гэтага — выбар п'есы, з чыёй дапамогаю мы намерваліся рэалізаваць гэтую тэму. ...Драматург — не адзіны аўтар у тэатры. Акцёр — таксама аўтар,» — заазначыў сп. Чулі ў адным са сваіх інтэрв'ю. Напраўду, Тэатр на Руры прадстаўляе сабою, прынамсі, паводле ягоных стваральнікаў, прынцыпова новае мастацкае, культурніцкае і нават асветнае ўтварэнне, юрыдычна вызначанае як... таварыства з абмежаванаю адказнасцю. Тэатр на Руры — першы ў Германіі тэатр, які працуе на трох мовах: нямецкай (Тэатр на Руры), цыганскай (ПРАЛІПЭ) і турэцкай (трупа Турэцкага нацыянальнага тэатра). Ягонаю мэтаю з'яўляецца паслядоўнае ўвядзенне культур нацыянальных меншасцяў у еўрапейскі тэатральны кантэкст, пры гэтым не адно ў традыцыйнай форме гастроляў, а шляхам сапраўднага замацавання іншамоўных труп у нямецкіх гарадах. Між тым асноўным матывам узнікнення Тэатра на Руры зрабіўся мастацкі: пошук новых і найноўшых сувязяў між рэжысёрам і акцёрам. Апірышчам гэтых пошукаў сталіся доследы Антанена Арто.

На здымку: Рабэрта Чулі.

ТАКІ БЫЎ ГЛЕБАЎ...

Народнага артыста СССР, лаўрэата Дзяржаўных прэмій СССР Глеба Глебава ў купалаўскім тэатры называлі проста і кранальна ласкава: «Глебушка». І нярэдка дадавалі слова «наш» — «сёння наш Глебушка іграе». І калі ў фае гасла святло, то білецёры, гардэробшчыкі, буфетчыцы, мабыць, уся абслуга тэатра, хто мог вылучыць вольную хвіліну, спяшаліся ў залу, каб у дваццаты, а можа, і ў двухсоты раз з асалодай сачыць за ігрой Глебава. І ён шчодра дарыў радасныя, вясёлыя хвіліны. Іскрысты, напоены сонцам талент Глебава быў шырока адкрыты і абсалютна даступны для ўсіх.

Ён набыў усеагульнае прызнанне.

Так гаворыць пра выдатнага беларускага коміка ў кнізе «Глеб Глебаў», выпушчанай выдавецтвам «Навука і тэхніка», доктар мастацтвазнаўства Анатоль Сабалеўскі.

Да мастакоўскага вобліку Г. Глебава, як вядома, даследчыкі звярталіся і раней. У прыватнасці, выйшлі дзве брашуры — С. Дуніна «Глеб Паўлавіч Глебаў» (Масква, 1949) і У. Стэльмаха «Народны артыст СССР Г. П. Глебаў» (1954). Аднак з-за абмежаванасці памеру аўтары іх, зразумела, не маглі ўсебакова асэнсаваць талент гэтага майстра.

Па сутнасці, даследаванне А. Сабалеўскага — першая манаграфія пра Г. Глебава (і, думаецца, не апошняя). Аўтар асэнсоўвае шлях, пройдзены майстрам, з таго моманту, калі Глеб Сарокін (сапраўднае прозвішча акцёра) яшчэ выступаў на самадзейнай сцэне... Вялікая ўвага падаецца станаўленню талента Глеба Паўлавіча на купалаўскай сцэне. І, зразумела, асноўная гаворка пра Г. Глебава — сталага мастака, яркую мастакоўскую індывідуальнасць.

Кніга багата ілюстравана шматлікімі здымкамі.

Паэзія

Юрась СВІРКА

«ВОРАГ НАРОДА»

ГУЛАГАЎСКАЯ БАЛАДА

Крычы ва ўсё горла,
зглыне ўсё тайга,
Хоць век свой такога не чула,
І слалася ўсхліпам
апошнім туга,
І клаліся людзі пад кулі.
Алесь ЗВОНАК

1

Хоць паўсюль людзей хапалі
У трыццатыя гады,
Ды ў адно, што вораг — Сталін,
Не, не верыў ён тады;

І на допытах не верыў.
Не паверыў і ў турме,
І тады, як штрэкі «мераў»
На прамёрзлай Калыме;

Хоць і еў ён бульбу з квасам,
Сніўшы радасць перамог,
Ды за Сталіна тым часам
Перагрызці горла мог;

У атаку падганялі.
Не ішла ў атаку рацъ.
Ды «За Сталіна!» — крычалі,
І не мог ён не крычаць.

2

За далёкім Магаданам,
Тым, што слынны мерзлатой,
Лагер, сопкамі схаваны,
Паказаў характар свой.

Раз не выйшлі на работу
Там, дзе тачкі і кайло.
Паўбарака патрыётаў
У пратэсце залягло.

«Нам, зняважаным, судзімым,
Толькі на перадавой
Вернасць матухне-радзіме
Даказаць сваёй крывёй.

Згодны працаваць і ўночы,
Да знямогі працаваць.
Там быць хочам, там быць хочам,
Дзе ваюе наша рацъ».

Аднаго патрабавалі:
«Фронт! Пашліце нас туды».
Ды маўчала ў стыні далеч,
Як прадвесніца бяды.

«Праяўляеце адвагу.
Ці прыелісь харчы?
Ці дадому, дахадзягі,
Захацелася ўцячы?»

Дні праходзяць. Чутна зноўку:
«Годзе, лежні, бунтаваць.
Адмяняйце галадоўку:
Адпраўляем ваяваць...»

Быццам схлынула знямога,
Аднадумцы, дружбакі
Падхапіліся на ногі
І стаяць, нібы штыкі.

Строй раўняюць дабравольцы
Перад лагерам сваім.
Камуністы, камсамольцы,
Ды, на жаль, усе ў былым.

Пасылаць на фронт? — Нязгода!
Гіньце ў стылай старане.
Хто ім, «ворагам народа»,
Зброю дасць.
Ты? — «Не!» Ён — «Не!»

«Бедалагі, бедалагі...
Выхад знойдзен, — смертны ход!
Адвядзём далей за лагер.
Там і будзе ўсім вам фронт».

Хто ў бушлаце, хто ў ватоўцы,
Пехатой пайшла братва.
Пасміхаліся ахоўцы:
«Сустракай «байцоў», Масква...»

Уздыхалі маладыя:
«Ты навек бывай, барак!»
Моўчкі кедры страявыя
Паглядалі на ваяк.

На санях скарб небагаты —
Рукзакі ды хатулькі...
Зэкі рушылі этапам.
Шлях і доўгі, і цяжкі.

Зрэдку чутны перамовы
У пустыні снегавой:
Ззаду, спераду ахова
І з бакоў сцярог канвой.

«Памагчы свайму народу,
Ён такі цяжар нясе!..»
Не дайшлі яны да фронту:
Расстралялі у тайзе.

3

З іх адзін (бывае ж дзіва)
Акрываўлены ўцалеў.
І ў няшчасці ёсць шчаслівы:
Абхітрыў канвойны гнеў.

Ён у снег глыбей падаўся.
Не падымеш галавы.
У трызненні забываўся,
Ён жывы ці нежывы:

«У народа зараз гора:
Ён вядзе смяротны бой.
Не, народу я не вораг,
І народ не вораг мой.

У любой пайду я роце,
Толькі б трапіць на вайну,
Каб пад кулямі на фронце
Замаліць сваю віну.

Але ў чым я вінаваты
І за што турма нягод?
Ад сваіх, нібы ад катаў,
Здзек цярплю не першы год.

Дзе ты, шчасце? — Міма, міма,
Не відно цябе нідзе.
Як хацеў я, каб Радзіма
Не адстала у хадзе.

Я хацеў, яе крывінка,
Каб цвіла заўжды яна.
Хіба тут мая памылка,
Хіба тут мая віна?..»

Адыходзіў ад трызнення.
Прад вачыма змрок радзеў.
Ды канвою-ачаплення
Не было відно нідзе.

Як снапы ляжалі хлопцы.
Кроў ды снег калымскі скрозь...
Не дарогай, а па сонцу
Ён на захад поўз і поўз.

Хоць была ў трывозе далеч,
Бачыў ён з усіх дарог:
З парай цёплай адплывалі
Душы тых, хто ў снезе злёг...

«Вось яна якая, воля!» —
Радасць ён адчуў душой.
І праз месяц, можа, болей
Быў ён там, дзе бой ішоў.

4

...Танк паўзе праз перашкоды,
«Не, акоп не пройдзеш мой».
Вораг з «ворагам народа»
Бой вядуць, смяротны бой.

«Не раздавіш мяне з ходу,
Паваюем мы яшчэ».
Вораг «з ворагам народа»
Б'юцца, кроў ракой цячэ.

«Атрымаў удар знішчальны
За Радзіму, што таптаў,
І «За Сталіна!» — не ўхвальна,
А з нянавісцю сказаў.

Мацюкнуўся злосна, груба,
Сплюнуў кроўю раз-другі.
Скрыгатнулі гнеўна зубы,
Што ўцалелі ад цынгі.

Не адной крыві і роду
І не з блізкай стараны
Вораг з «ворагам народа».
Не саюзнікі яны.

«Згінь жа, злыдзень вераломны!
Ты не ведаеш, хто мы.
Ты не пройдзеш: я нязломны,
Быццам скалы Калымы...»

Уздыхнуў ён пасля бою:
«Не, яшчэ не скончан бой
І з калымскай мерзлатою,
І з мярзотаю людской».



Малюнак Ул.СКРЫГАНАВА

Эдуард АКУЛІН

«ДАРУЙ, РАДЗІМА, СЛОВА «НЕНАВІДЖУ»

•

М. БАГДАНОВІЧУ

Паэты пачынаюцца з любові
да страчанай, зняважанай Айчыны.
Паэты пачынаюцца са Слова
з таемным сэнсам першае прычыны.

Паэты пачынаюцца з жанчыны,
якая здрадай плаціць за каханне.
Паэты пачынаюцца з хвіліны,
калі нябёсы клічуць на спатканне...

Паэты пачынаюцца са славы,
з якою не самотна ім памерці.
Пачатак для паэта — гэта права
законны шлюб да трыццаці
узяць са Смерцю.

•

О Беларусь — абліччам Божамаці —
сыноў сваіх, што прадалі Агмень,
дзе моц бярэш, каб гнеўна не праклясці,
дзе слёз бярэш, каб бласлаўляць з калень.

У ценю ад чарнобыльскага крыжа
іудаў крык параніў цішыню...
Даруй, Радзіма, слова «ненавіджу»,
што сёння прамаўляю ўпершыню.

ПЫТАННЕ

У люстэрка спытаю: — Хто ты?
Азірнуся назад у памяць,
дзе за кожны грахоўны дотык
нікло сузор'яў нявечыць пальцы.

Здрада родніць заўжды крывёю,
успамінамі нішчыць прышласць,
бо каханне сваім гняздоўем
выбірала здаўна агнішча.

МУЗЫКА

А потым, пасля, як-небудзь
памяць па складу рэха
азавецца раптоўна ў нас,
ні раз, ні два і ні тры...
Слёзы не варты твару.
Трэба здалець спатоліць —
нават калі ад болю.
Прыгожае не знікае.
Яго забірае Вечар.
Неадольнае нас нявечыць.

У лесе свечак
жыў туман...
Чаўном у Вечнасць
сплыў арган.

КАХАННЕ

Amori et dalori... *

Каханне — пакута.
Душою распнутай
між Пеклам і Раем лунаць...

Каханне — атрута.
Святы і аблудны
я выберу смерць, каб кахаць.

Каханне — як рудня,
дзе ў свята і ў будні
нам працай сябе катаваць.

Каханне — ёсць мудрасць,
якую Бог людзям
адкрыў, каб грахі дараваць.

---

* *Кахай і пакутуй...*

РАСКОЛІНА

Свет раскалоўся напалам.
Тут забыццё — каханне там.
Там дождж пяшчоты — тут няма.
Там лета сноў — а тут зіма.
Тут цішай стомлены пакой —
там смех сыноў і голас твой.
Тут пах вяргінь — там водар руж.
Там неба сінь — тут спод калюж.
Там цвіў агмень — тут галавешкі...
Свет раскалоўся. Крочу пешкі
да слёз народжаных з усмешкі.

Проза

Алесь АСТАШОНАК

ДОМ ТВОРЧАСЦІ*

ЭСКІЗ АНТЫЎТОПІІ

Памяці Вялікага Кастрычніка

Быў час — кніга без малюнкаў і кнігаю не лічылася. Ніводны наш мэтр у самым жахлівым сне не мог дазволіць сабе выдання без глянцавых уклеек. Не знайшлося, праўда, такіх літаратараў, якія б суправаджалі свае творы ўласнымі малюнкамі — але, будзем шчырыя, яны ўжо паўставалі на далягляндзе. Адна паэтка, услед за вядомым французскім арыгіналам, нават стварала вершы ў графічнай форме кругоў, трохкутнікаў, трапецый і паралелаграмаў, ромбаў і ажно нейкіх не акрэсленых азначэннем фігур, якія прыязны крытык чамусьці назваў «парарубероідамі», уклаўшы ў тэрмін вялікі сэнс — вось да чаго даходзіла ілюстраванне ў кнігавыданні!

Але ўсё гэта, праз раптоўнае падаражэнне ўсяго існага, стала ўжо сівой мінуўшчынай. Цяпер тыя ж самыя мэтры радуюцца проста выхаду кнігі, сёй-той пакутна дае згоду на папяровую — падумаць адно! — вокладку, а ўсе разам, і «зубры», і «зялепуха», выдаюцца ўсё меней, ахвяруючы часам машыністкам ці не палову так званага ганарару.

Праз гэтую сумную акалічнасць аўтару эскіза прыходзіцца адмовіцца ад першапачатковай задумы і, замест падрабязнага чарцяжа, які б яскрава паказаў на паперы мажлівасці ўзнікнення фантасмагорыі ў прапанаванай геаметрычнай структуры, распавесці асаблівасці гэтае структуры словамі.

Дом творчасці пісьменнікаў «Іслач», размешчаны кіламетраў за сорак ад Менска ў маляўнічых мясцінах, дзе бруіцца аднайменная чыстая рачулка, у якой яшчэ можна злавіць стронгу, уяўляе сабою даволі вялікі, амаль замкнёны, з невялікім праходам паміж секцыямі, прамакутнік. Двор гэтага прамакутніка — таксама немалы, у ім можна гуляць, асабліва калі не спяшаешся, а ў самым куце яго высіцца вежа, якая асабліва надае ўсяму комплексу выгляд строгі, гатычны, а часам, у благое надвор'е, нават змрочны.

Так і хочацца верыць, што тут можа напісацца якоесьці «Дзікае паляванне караля Стаха» або «Дзіўнае здарэнне з д-рам Джэкілем і містэрам Хайдам».

І тэрыторыя вакол будынка таксама вялікая, з дужа далёкімі металічнымі агароджамі, свабодная ад іншых збудаванняў.

Не менш цікавае і ўнутранае ўладкаванне будынка. Чатыры доўгія калідоры і — дзверы, дзверы, дзверы... Калідоры разгаліноўваюцца ў калідорчыкі, закуткі, на трох кутах дома пераходзяць у лесвіцы, што вядуць уніз — у «банки», як называе іх тут па-расейску персанал. За дзвярыма — жылыя нумары. Маленькія, сярэднія, адносна вялікія — у два пакоі, і некаторыя з апошніх — двухпавярховыя, з мансардамі і, адпаведна, лесвіцамі, на якіх неаднойчы падгулялыя пастаяльцы мелі клопат з наступствамі.

Асабліва ўражвае нумарацыя. Той, хто прадумваў яе прынцып, дальбог, заслугоўвае звання матэматыка-логіка. Прынцып гэты для простага розуму, асабліва пісьменніцкага, неспасцігальны. Нумарацыя ператварае калідоры ў сапраўдныя лабірынты, тым больш што ёсць яшчэ мала не падземныя адсекі — «банки». Многія заўсёднікі дома сутыкаліся з велізарнымі цяжкасцямі пры знаходжанні нумароў, дык што тады ўжо казаць пра не самых частых наведнікаў?

Аднойчы адзін «генерал славеснасці» ў пошуках свайго жытла і ў пэўным, адзначым дзеля справядлівасці, стане гадзінамі кружляў гэтымі лабірынтамі і так і не знайшоў свайго прытулку. Выгледзелі яго пад раніцу на падлозе, зусім непадалёк ад уласнага нумара. Рука яго была выкінута ўперад, што ў правадыра, ён заціскаў у ёй ключ, дакладней, пранумараваны «набалдашнік», а ключ паказваў у патрэбным накірунку, прычым падкрэсліваў накірунак указальны палец, досыць грацыёзна выцягнуты ўздоўж ключа. Мабыць, нябога адшукаў нарэшце сваю мэту, аднак сілы дайсці да яе ўжо не хапіла.

Вось што такое іслацкія лабірынты.

Параўнальна нядаўна жыў у мурах дома і адзін адносна малады літаратар, пра якога пойдзе гаворка: менавіта з ім здарылася фантасмагорыя.

З пэўных прычын літаратар гэты страціў у Менску кватэру і быў змушаны перабрацца на сталае жыхарства ў дом, балазе каштавала гэта яму вельмі нядорага. Было яшчэ троє-чацвёра ягоных калег, што жылі там гэтаксама, як ён, наведваючы, аднак, іншым разам часовы гарадскі прытулак. У нашага літаратара такога не было, і тым самым ягонае становішча істотна адрознівалася ад становішча калег і не магло не ўплываць на ягонае самапачуванне.

Адзінота ягоная зусім не была тым дабратворным станам, які па-расейску хораша называецца «уединением» — гэта была адзінота, і часам яна ператваралася ў тугу і роспач. Схільны й так да дэпрэсіі і да адной са звычак, што зазвычай называюць дурнымі, ён часта заліваў пякучы агонь самоты халоднай вільгаццю тармажэння адмоўных пачуццяў. Часам пажар быў доўгі, і, адпаведна, на тое, каб злізаць языкі ягоных пеўняў, патрабаваўся час. Такімі днямі літаратар мог нават не выходзіць з нумара: сякая-такая ежа пры сабе мелася, зрэшты, яе заўсёды маглі прынесці калегі, таксама тым часам пажарнікі, і навошта ўражваць добрапрыстойных і ўстрыманых членаў грамадства сваім экзатычным выглядам? Дарэчы, з'ява гэтая была не такая ўжо і рэдкая ў доме: здаралася так, што людзі, асабліва адзначым зноў жа дзеля справядлівасці, непісьменнікі, узносчыкі вольных савецкіх прафсаюзаў, прыехаўшы, зачыняліся ў нумары на некалькі дзён і калі нарэшце дабіраліся да сталовай, дык не маглі адшукаць свайго там убачанага толькі ў першы дзень стала.

Аднаго разу наш літаратар гэтак доўга адсутнічаў на вачах пастальяцаў, што тым часам здарыліся неверагодныя падзеі, і, выйшаўшы з самаблакады, ён выявіў: усе жыхары дома ўтаропіліся ў два наяўныя тэлевізары, і пры кожным былі газеты. Калега, крытык Таміла, хутка растлумачыў яму прычыну такой глядацка-чытацкай апанаванасці: «Ты так усё за гулянкаю можаш пратрапіць. Чаушэску скінулі». Дзве кароткія фразы дужа ўразілі літаратара: дальбог, можна ўсё пратрапіць — здарылася ж падзея па-свойму фантастычная. Літаратар зрабіў высновы.

Але няпроста, марудна бяруцца ў жыцця ўрокі. Праз нейкі час літаратар зноў загуляў — хоць якая гэта была для бедака гулянка?.. Каб вам так на тым свеце гулялася, мог бы ён сказаць сваім непрыяцелям, але чалавек ён быў незласлівы.

Калі ён прачнуўся нарэшце, поўны рашучасці прыпыніцца, яго адразу ж дужа насцярожыў уласны трывожны стан. Вядома, пасля доўгіх пагулянак стан заўсёды бывае трывожным, аднак гэтым разам неспакой быў празмерны — ён проста паглынаў яго. Літаратар цяжка ўсеўся на ложку, надзеў пантофлі, прайшоў у ванны пакой, з жахам угледзеўся ў люстэрка, працёр кроплямі вады звузелыя вочы, апрануўся і пайшоў да дзвярэй. Зубы чысціць не стаў — якія там зубы, калі перш чым прыпыніцца, трэба раз-другі асцярожліва націснуць на тармазы — плісканутъ на агеньчыкі вуголля крыху вадкасці. Кіраваўся ён, вядома, зусім не ў сталоўку, а да электрыка Юзіка, у якога заўсёды было чым заліць любы пажар. Але дзверы не паддаліся. Літаратар здзівіўся: ён ніколі не зачыняў іх і не мог зачыніць і апошнім разам — ну ад каго яму зачыняцца, не ад сваёй жа самоты?

Зрэшты, чаго не бывае ў тлуме, падумаў літаратар і ўзяўся шукаць ключ — занятак быў яму цяпер пакутны і яшчэ больш павялічваў незразумелую трывогу. Ключа нідзе не было. Літаратар, ужо млеючы праз адну толькі саслабеласць сваю, не кажучы пра раптоўную пошасць, зноў падышоў, увесь у поце, да дзвярэй і патузаў ручку. Вынік быў усё той самы. Лоб імгненна ўзмакрэў дазвання. Што ж гэта, бляха, здарылася?

І тут ён нарэшце ўбачыў: у дзвярах невядома адкуль узялося вочка. У горле яшчэ больш перасмягла. Новаўвядзенне? Дык што ж — гэта ён так спаў, што нічога не чуў? Ці бяспамятнасць ужо?..

Ён зірнуў у вочка, але нічога не ўбачыў, адно пачуў нейкую нават нязвыклую цішыню, ну проста свінцовую, — яна душыла яго, налягала цудамі самоты. Літаратар зноў вярнуўся ў пакой, мокры ўжо настолькі, што хоць выкручвай. Застыў пасярэдзіне і абвёў вачыма куты — дзе ж той кляты ключ мог дзецца? Узняў пагляд вышэй, нібыта там можна было штосьці знайсці, — і ажно аслупянеў; пот, здаецца, увесь увабраўся назад у цела: шырокае вакно яго нумара было закратаванае мала не да самага верху, дзе заставалася вузенькая палоска шкла.

«Дапіўся!» — мільганула думка. Але ж як так можна дапіцца? Нават паэт Матрахавіч, якому бачыўся начамі ў куце чорны чалавек, не расказваў яму такога. Узрушаны, літаратар ускочыў на падваконне і, ухапіўшыся рукамі за краты, дацягнуўся падбароддзем да палоскі шкла.

Па двары неяк дзіўна гулялі людзі. Адмервалі крокі строга па перыметры, уздоўж сцен, на нязменнай адлегласці ў два-тры метры ад іх. Адзетыя ўсе яны былі ў піжамы, рукі трымалі за спінаю. Пасярэдзіне, на вялізным камені, што рабіў раней двор такім маляўнічым, стаяў чалавек у нейкай чорнай спяцоўцы... з аўтаматам у руках.

У літаратара ажно мазгі вылазілі з галавы. Ён павёў вачыма ўверх і ўбачыў, што шкляное вакенца на версе вежы было выбіта і з яго высоўваўся другі аўтамат, які трымаў таксама чалавек у чорнай спяцоўцы... І гэта быў добра знаёмы яму паэт, чалавек артадаксальных поглядаў, з якім ён не раз спрачаўся, у тым ліку і за чаркаю... Але ж не біліся яны ніколі... Божа літасцівы, дайшло раптам да літаратара — усе астатнія, і аўтаматчык на камяні, і «гулякі», былі ягонымі знаёмымі літаратарамі!

Аўтаматчык на камені таксама быў асобаю артадаксальнай — апошнім часам ён выявіў сябе сталым беларускамоўным аўтарам газеты «Наше знамя», і літаратар перастаў з ім здароўкацца, на што той чамусьці мала зважаў. Затое сярод «гуляючых» шпацыраваў іхні вядомы апанент крытык Таміла. Быў сярод іх нават індыферэнтны амаль да ўсяго паэт Матрахавіч, які даўно праславіўся сваім палітычным нігілізмам... Па ягоным твары нельга было сказаць, што ён меў патрэбу ў апахмяленні — наадварот, па ўсім было відаць, што ён пра гэта й думаць забыўся... Але ж і Матрахавіч колісь пісаў палымяныя антыартадаксальныя вершы...

«Праўду казаў Таміла — неадменна дап'ешся!», — падумаў літаратар неяк ужо усцешана, і хацеў быў клікнуць электрыка Юзіка, які з'явіўся ў куце двара, — не ў піжаме, а ў зялёнай спяцоўцы, ён прысеў на тратуары і корпаўся ў скрутку дроту. Зняможаны, літаратар хацеў быў папрасіць Юзіка прынесці яму чаго паддекавацца, як раптам заўважыў, што электрык размотваў дрот ад крыху бачнай, па-за межамі двара, за вонкавымі мурамі будынка, агароджы, і намотваў яго на клемы электрашчыта.

Ледзь жывы, літаратар цяжка спусціўся ўніз і ўтупіўся ў падлогу, з апошняе надзеі ўсё яшчэ шукаючы ключа...

Але яму адно згадаўся стары паэт, які прабавіў доўгія гады ў розных загароджаных зонах: аднойчы ён сказаў, што і інтэр'ер, і экстэр'ер пісьменніцкае стадолы надзвычай добра прыстасаваны да ўтрымання людзей у ізаляцыі...

Версія гэтая была б досыць верагоднай, калі б не адна акалічнасць: лёс распарадзіўся шчасна, і цяпер, дзякуючы новаму дзяржаўнаму ладу, праз дарагавізну пуцёвак у памянёны дом, літаратары на Іслачы больш не жывуць. Забіраць іх будуць, пэўна, з кватэр-каморак, якія паспелі яны атрымаць, як сябры іхняга таварыства.

7 лістапада 1993 года.

---

* *Назва Уладзіміра Някляева*

«ПРЫХОДЗЬЦЕ, ПАКУЛЬ МЫ ДОМА...»

Так могуць звярнуцца да сваіх прыхільнікаў беларускія артысты оперы і балета. Сезон у Вялікім тэатры першай распачала трупа Нацыянальнага балета Беларусі, праз некалькі дзён святочную сустрэчу з гледачамі наладзілі й артысты оперы, паказаўшы нядаўнюю прэм'еру — «Рыгалета» Д. Вердзі. Новы сезон абяцае нямала новых уражанняў: гэта і прэм'ера оперы С. Картэса «Візіт дамы» (паводле Ф. Дзюрэнмата), і абнаўленне папулярных класічных пастановак — «Аіды», «Травіяты», «Князя Ігара». І доўгачаканая прэм'ера балета «Рагнеда», над якім у садружнасці з кампазітарам А. Мдзівані працуе майстар харэаграфічнай сцэны В. Елізар'еў. А пры чым тут гэткі загаловак? Справа ў тым, што ўжо не толькі наш балет, а і оперная трупа мае графік замежных гастроляў. І неўзабаве беларуская опера зноў выпраўляецца ў Іспанію — аж на два месяцы! Маршрут Нацыянальнага балета праляжа праз «сэрца» Еўропы: Бельгія, Францыя, Швейцарыя... Словам, беларускім гледачам давядзецца часам і пасумаваць без Вялікага тэатра.

Н. К.

ЛОЎКАСЦЬ РУК І...

Два дні запар мінскім Палацам культуры чыгуначнікаў валодалі фокуснікі. Пры перапоўненай глядзельнай зале (дарэчы, уваход быў бясплатны) тут упершыню праходзіў «Фестываль магаў-94». Кульмінацыяй свята стала стварэнне Клуба Ілюзіяністаў на чале з прэзідэнтам Яўгенам Кісялёвым. Новая арганізацыя заклікана абараняць прафесійныя інтарэсы майстроў гэтага любімага публікай жанра. Дарэчы, сёння іх у нас — усяго 18 чалавек.

Тэкст і фота В. СТРАЛКОЎСКАГА

ДЭБЮТАВАЛА «ВАР'ЕТЭ»

Нядаўна ў Гродзенскім Доме афіцэраў адбыўся дэбют тэатра «Вар'етэ». Гэты арыгінальны малады творчы калектыў узначаліла мастацкі кіраўнік Ірына Гаранкіна. Летась яна атрымала Гран-Пры на фестывалі беларускай эстраднай песні «Песні над Нёманам». Ірына сабрала вакол сябе энтузіястаў-аднадумцаў з вялікім творчым патэнцыялам. У складзе калектыву — балетная група і спевакі-салісты. Аранжыроўшчык, акампаніятар і аўтар песень — Анатоль Кандыба, гукарэжысёр — Генадзь Самата. Публіка цёпла прыняла лаўрэата фестывалю «Песні над Нёманам» Марыну Савіцкую, лаўрэата фестываляў аўтарскай песні Таццяну Варанчыхіну, жывога і тэмпераментнага спевака з Мадагаскара Стэла Фідзі. Захоплена былі сустрэты песні ў выкананні Ірыны Гаранкінай, якая валодае яркім выразным голасам. Нельга не адзначыць арыгінальнасць твораў гродзенскага кампазітара Анатоля Кандыбы, асабліва песні «Не сумуй» і «Журба». Маладосцю, бляскам, сучаснымі рытмамі, прыгажосцю класічных і палкасцю народных танцаў завабіла гледачоў балетная група тэатра. (Вопытныя танцоры неаднаразова выступалі ў Польшчы, Грэцыі, Турцыі, Сірыі, Мазамбіку). Калектыў тэатра «Вар'етэ» працуе цяпер над новай праграмай.

В. РАДЗІЁНАЎ, С. БАГДАНАЎ

«МНЕ ПА ДУШЫ НЯЛЁГКІ ШЛЯХ...»

Неспадзявана і нібыта ніадкуль з'явіўся ў тэатральным жыцці Мінска акцёр Ігар Забара. Не быў вядомы знаўцам са студэнцкіх часоў або па выпусках былога БДТМІ. Не хадзіў у дапаможных складах акадэмічных тэатраў. Не мітусіўся сярод уплывоўцаў або вызначальнікаў, — сярод тых, ад каго найпрост залежыць, ставіць Шэкспіра або Марчука, даваць ролю адразу або выпрабаваць на яе пяць-дзесяць кандыдатаў. Між тым цікавасць да першых мінскіх тэатральных работ Ігара мацавалася. Яму не спатрэбілася ахвярна даводзіць сваё майстэрства, пераконваць у значнасці сваёй творчай асобы. Ні ў кога не адбіраючы славы, абазнанасці ды прыхільнікаў, ён прыцягнуў увагу выкананнем ролі Караля Беранжэ («Кароль памірае» Э. Іянеска), літаральна ўзрадаваў (надта ж смешна) Чортам («Камедыя...» паводле К. Марашэўскага і Ф. Аляхновіча), паланіў нечуваным рамантызмам Мэкі-нажа («Трохграшовая опера» Б. Брэхта)... Да спектакляў Альтэрнатыўнага тэатра, які прадстаўляе акцёр, дадалася і нядаўняя прэм'ера тэатра-лабараторыі беларускай драматургіі «Вольная сцэна», дзе ў пастаноўцы «Vita brevis, або Нагавіцы святога Георгія» М. Адамчыка і М. Клімковіча ён адметна выканаў ролю Лютара, — сваю самую буйную пакуль што ролю па-беларуску. Адначасова ўзяў удзел у конкурсе, — перамога ў ім давала права на адмысловыя заняткі ў лабараторыі Міхаіла Чэхава, — сёлета яна праводзіцца ў Вялікабрытаніі. Узяў удзел і... апынуўся сярод пятнаццаці прадстаўнікоў краін СНД, якія днямі пачнуць дасканаліць сваё майстэрства ў Лондане.

З Ігарам ЗАБАРАМ гутарыць рэдактар аддзела тэатра «ЛіМа» Жана ЛАШКЕВІЧ.



— Напраўду, Ігар, скуль жа ты ўзяўся ў Альтэрнатыўным тэатры, якія сцэнічныя досведы займеў, каб так порстка ды трывала атайбавацца сярод... пастаяннага поспеху: у цябе няма аніводнае адчэпнае работы!

— Скончыў ГТІС (цяпер РАТІ). Меў прапановы ад маскоўскіх тэатраў, але не на пэўныя ролі, а так, увогуле... З аднакурснікамі працаваў у Волагдзе пад кіраўніцтвам рэжысёра, нашага ж сакурсніка. Ягонаю мараю было ўехаць у Маскву на белым кані. У Волагдзе ён на нас паездзіў-паездзіў... Ажно да белых коней, праўда, іншага паходжання... Жудлівае гэта з'явішча, калі, здаецца, крок да поспеху, да сапраўднай работы, а гарэлачка паперадзе кожнай думкі ўзнікае... Зрэшты, мне скардзіцца няма на што, я перайграў шмат. На што спадзяваліся? Цяжка сказаць. Мая жонка, мінчанка Алена Забара (гледачы памятаюць яе па спектаклі «Вольнай сцэны» «Ку-ку» М. Арахоўскага. — **Ж. Л.**) спадзявалася вярнуцца дахаты. Амаль выпадкова пазнаёміліся з Вітаўтасам Грыгалюнасам, і наш пераезд адбыўся.

— А як тое, на што арыентавалі ў ГІТІСе, тое, да чаго рыхтавалі, увасобілася, так бы мовіць, у рабочым працэсе? Будзённае існаванне ўсё часцей зварачае да прыкрасці, — тады, калі здаецца, што спраўдзіцца ў прафесіі ўжо нічога не замінае. Ты — спраўджваешся! Нягледзячы ні на што — ні на выдаткі рэжысуры, ні на звыклыя скруты мастацкіх непаразуменняў, ні на безграшоўе...

— Так, ГІТІС мае абаяльную, таямнічую рэпутацыю «кузні ды млына» талентаў. Вядома, шмат залежыць ад майстра, да якога трапіш: нашым майстрам была выдатная актрыса Людміла Іванаўна Касаткіна. Актрыса ва ўсім і... толькі. Уменне навучыць быць акцёрам — гэта зусім іншага кшталту талент. Да ГІТІСа ў мяне за плячыма былі два гады навучання ў Яраслаўлі, — мяне выгналі з фармулёўкаю: «За паводзіны, несумяшчальныя са званнем

СПРАЧАЕМСЯ ВАКОЛ СУПРЭМАТЫЗМУ

ДА ТВОРЧАСЦІ АЛЕНЫ КІТАЕВАЙ

Не так даўно ў маскоўскім Цэнтры сучаснага мастацтва, які займаецца яго найноўшымі плынямі, шумна адкрылася новая галерэя дызайну, заснаваная выдавецтвам «ИМА-пресс». Выпускаючы калекцыйныя кнігі, паштоўкі, плакаты, выдавецтва ўсе пяць год свайго існавання дазваляла сабе раскошу супрацоўнічаць з лепшымі маскоўскімі дызайнерамі-графікамі. Па вызначэнню крытыкаў, падчас буму кніжных серыялаў «для народа», афармленых на спажыву аляпаватаму масаваму густу, «ИМА-пресс» займалася сапраўднымі артыстычнымі вольнасцямі, да прыкладу, падліскай на любоўныя лісты. Таму нічога дзіўнага, што менавіта гэтае выдавецтва, звыклае да прафесійнага мастацтва, прычынілася да адкрыцця першай у Маскве галерэі, дзе мэтанакіравана будзе дэманстравацца графічны дызайн. Цяпер такую раскошу могуць дазволіць сабе далёка не ўсе былыя «ўскраіны» Саюза, выключэннем і раней былі бадай што адзіныя прыбалты. Не дзіва таксама, што першую экспазіцыю аддалі Алене Кітаевай. І не столькі таму, што яна паспяхова супрацоўнічае з выдавецтвам, зрабіўшы для яго выдатны дызайн гадавой справаздачы Банка сувязі, серыю рэкламных плакатаў (ЦДМ, 1993), што яна жонка цяперашняга галоўнага мастака «ИМА-пресс». Хаця, відаць, нікому і не паказалася б несправядлівым, што галерэя аддае перавагу мастакам, якія даспадобы заснавальніку. Алена мае цвёрдую рэпутацыю мастака-прафесіянала, якой не чужы і вольны артыстызм. У яе творчай біяграфіі — перамогі на міжнародных біенале, конкурсах, прэстыжныя каталогі. Можна з поўным правам лічыць яе беларускай мастачкай, бо ўсё творчае жыццё, акрамя некалькіх апошніх год працы ў Маскве, звязана з Беларуссю. Найбольш плённа і стала працавала яна з балетнай трупай Елізар'ева. Выстава, якую Алена прадставіла ў галерэі дызайну, таксама напрацавана і зроблена на

Супрематическая азбука

Беларусі. Гэта, можна лічыць, яе першая персанальная выстава. Другая зараз знаходзіцца ў Мастацкім музеі Віцебска і, вытрымаўшы хвалю непаразумення з-за нязвыкласці плакатнага жанру, экспануецца з немалым поспехам.

За плячыма ў Алены Кітаевай — школа прамысловага дызайну Беларускай Акадэміі мастацтваў. Ёй пашанцавала, яна трапіла ў час росквіту факультэта, у асяроддзе выкладчыкаў-рамантыкаў, упэўненых, што надышла «залатая эпоха» мастацтва, выпеставанага на спадчыне папярэдніх канструктыўных набыткаў. Таму, відаць, і палюбіўся маладой мастачцы Казімір Малевіч, а ў яе творчасць увайшоў увесь «супрэматычны» арсенал выяўленчых сродкаў.

У 1986 г. пачалася самастойная мастацкая праца. Творчы лёс Алены Кітаевай складваўся адносна шчасліва: не было знікнення ў шэрай будзённасці дызайнерскай працы на заводзе, беспрацоўя андэграўнда, вымушанай змены прафесіі. Наадварот, дзяржаўныя заказы адразу вылучылі яе з агульнага кола. Мяркуйце:

савецкага студэнта з правам аднаўлення пасля службы ў шэрагах СА пры наяўнасці бездакорнай характарыстыкі ад камандавання», — фармулёўку, здаецца, ніколі не забуду. Выгналі, нягледзячы на выдатныя адзнакі па спецыяльнасці.

— А што няможна было сумясціць са званнем савецкага студэнта?

— На Волзе, на караблі, мы адзначылі заканчэнне другога курса. Вядома, шумелі: чыталі, спявалі, кпілі са студэнцкага жыцця. Ішоў 1982 год, мы не звярнулі на гэта ўвагі... Затое там, у Яраслаўлі, я навучаўся ў адметнага педагога Уладзіміра Варанцова. Ён цяпер галоўны рэжысёр Яраслаўскага тэатра, — тры гады таму, ты памятаеш, яны надта няўдала гастралявалі ў Мінску. Надта розныя прафесіі — педагога ды рэжысёра-практыка... А ГІТІС, на жаль, — гэта плынь, фабрыка, прорва, бо можна чатыры гады вучыцца з чалавекам на паралельным курсе і ні разу не спаткацца. Інстытут, цяпер акадэмія, разам са сваёю камернасцю згубіў, страціў і ўвагу да асобы. Не магу і не хачу хлусіць, што ГІТІС стаўся маёю школаю. Школаю застаўся Яраслаўль. І... мая мама, вельмі далёкая ад мастацкіх прафесій. Самы зацікаўлены ўва мне чалавек. Сам я з Украіны, мае бацькі і цяпер жывуць у Палтаве. Мама заўжды была завадатарам усялякіх розыгрышаў, жартаў, на Каляды магла ўбрацца Дзедам Марозам, зрабіць насценгазету з расповядамі пра сямейныя неспадзеўкі, — яна ў жыцці вельмі творчы чалавек. Насуперак бацьку, дарэчы, матэматыку, — педанту, вельмі адказнаму, сур'ёзнаму... Не буду хаваць, што мне прапаноўвалі заставацца і працаваць у Палтаўскім музычна-драматычным тэатры: там усе гарно спяваюць песні, і я б там усё жыццё спяваў бы пра гарну дівчыну Наталку... Гэта Наталка жыве на тамтэйшай сцэне ўжо гадоў трыста і збірае паўнюткія залы — вось праява! Рытм жыцця ў Палтаве неверагодна сонны: спёка, каштаны, цішыня, усе ходзяць у вышыванках і ў... трэпках, бо надта горача. А побач — Сарочынскі кірмаш, дзе да гэтага часу ездзяць на свіннях і караскаюцца па слупах, салам мазаных, каб боты дастаць. Каларыт неверагодны. Люблю Палтаву надзвычайна, але працаваць там ніколі не буду...

— Што ж, збольшага ведаючы твае ролі, я магу ўявіць твае запатрабаванні. Бясспрэчная ўдача — роля Караля Беранжэ.

— Я ў такім жанры, абсурднай драмы, ніколі дагэтуль не працаваў, а першая сцэнічная рэдакцыя «Караля...» была пакутлівай, доўгай, калі ты памятаеш, нават без антракту, і «ЛіМ» напісаў, што ўмеюць памардаваць акцёраў на сцэне Альтэрнатыўнага тэатра. Справядліва. Бо танальнасць спектакля не мянялася, панавала аднастайнасць... Вага, якую трэба было ўзяць і Вітаўтасу Грыгалюнасу, і мне, была надта вялікая. А што я іграў у Волагдзе? Хлопца-вепручка ў «Вепручку» Розава, Панкратава ў «Дзецях Арбата», Мікалая ў «Зорках на ранішнім небе». «Кароль памірае...» для мяне цяпер — вельмі дарагі спектакль. Ён моцна змяніўся, дарэчы...

— Згодная, змяніўся ён так, што варта яго ацэньваць, бадай, як прэм'ерны. Кароль Беранжэ — твая зорная роля?

— Вызначальная. У Маскве на конкурсе для лабараторыі Міхаіла Чэхава, калі я прайшоў першы тур, прапанавалі паказаць на пятнаццаць хвілін тое, пра што сам акцёр мяркуе, як пра прыдатнае для паказу. А я ўжо даўно развітаўся са студэнцтвам, ніякіх чытальніцкіх праграм у мяне нямашака, і я паказаў гэткі калаж на тэмы са спектакля «Кароль памірае». Ёсць у спектаклі адзін эфектны момант, які вырашыў мой акцёрскі лёс: імгненнае, раптоўнае старэнне Беранжэ. І я... састарэў на вачах у журы... І журы, напэўна, мне паверыла...

— А ў «Трохграшовай оперы» ты свядома, як я прыдумала, калі пісала артыкул, «спавядаў празрыстую стылістыку ролі», — а трэба было напісаць прасцей: даваў магчымасць маладзейшым калегам выявіцца каларытна ды характарна?

— Мэкі-нож быў лёгкім у рабоце. Я толькі ўзяў пад увагу патрабаванні рэжысёра і сам сябе... пасадзіў у глядзельную залу. Амаль літаральна. Бо Нож у нашым вырашэнні, на жаль, толькі глядач спектакля, які адбываецца вакол яго, і яму нічога не застаецца, як толькі... глядзець яго!

— А як ты паставіўся да запрашэння ў спектакль А. Андросіка і У. Рудава «Камедыя...» паводле К. Марашэўскага і Ф. Аляхновіча? Мусіў жа ўводзіцца ў падрыхтаваны, вырашаны і вывераны ўжо спектакль, хоць сабе і з падмосткаў Навучальнага тэатра перанесены...

— Не ведаю артыста, які самлее ад шчасця, калі яму выпадзе сыграць Чорта. І я, натуральна, не самлеў. Нават прапанаваў Андрэю Андросіку скарыстаць кіношны эфект: няхай Чорт з кожным выхадам з'яўляецца ў новым абліччы, нават у дзіцячым альбо жаночым, а ўжо голас я яму свой аддам... На жаль, пракат, эксплуатацыя спектакля не дазволілі нам так параскашаваць. І лётаю я Чортам, і надараюцца са мной (і з ім) неспадзеўкі, і публіка нас любіць, але свечку Богу паставіць я не забываюся.

— А што, акрамя вартых, бясспрэчна папулярных спектакляў Альтэрнатыўнага з тваім удзелам, ты б яшчэ паглядзеў, у чым бы па-акцёрску прыняў удзел?

— Мне не падабаецца тэатральная атмасфера Мінска. Здаецца, яна вельмі зададзеная, змушаная, абцяжараная нейкімі штучнымі аўтарытэтамі, якія на кожным рагу выгукаюць: «Прафесійна, не прафесійна!» Магчыма і таму, што да Альтэрнатыўнага тэатра (пры ўсіх ягоных заганах) не ставяцца па-творчаму сур'ёзна. Магчыма і таму, што мяне вельмі расчаравалі акадэмічныя тэатры. Згадваю, сярод першых мінскіх спектакляў, якія моцна ўразілі, была «Картатэка» ў пастаноўцы Рыда Таліпава, бадай, самы цікавы спектакль ягонага тэатра, эстэтычна бездакорны і ў яркім акцёрскім выкананні. А вось акадэміі расчароўваюць нейкаю дзіўнаю затуленасцю, закрытасцю ад свету, ад людзей, ад часу! Праўда, любая альтэрнатыўнасць з часам мінае і хочацца... класікі, класікі. Рэжысура наша часам дзівіць дзіўна: нават калі спектакль і выдае на прыстойны, дык акцёрскія работы зрэдчас задавальняюць...

— А з кім, акрамя заўсёдна-твайго Вітаўтаса Грыгалюнаса, ты б хацеў папрацаваць?

— Перадусім — з Мікалаем Пінігіным. Мяне вабіць ягоная чалавечая добразычлівасць і прафесійная абазнанасць. Ён, мабыць, заўжды пэўна ведае, чаго вымагаць з акцёра. Я, перапрашаю, усяедны. Мне цікавыя і доследы Вікцюка, і тэатр Додзіна, мне надзвычай падабаюцца пошукі Анатоля Васільева, — у яго спектакль з дня ў дзень мяняецца так, што кожны раз, ідучы на вядомага аўтара і ведаючы рэплікі на памяць, не ведаеш, што прычакаеш. У мяне няма сваёй тэатральнай ідэі і стройнай тэатральнай сістэмы. Магчыма, калі атрымаецца, я сам буду ставіць, і тады высветліцца, які тэатр — мой. Увогуле гэта, відаць, узроставая акцёрская хвароба: свярбяць рукі, цвеліцца сэрца, баліць галава, але... удалых прыкладаў акцёрскіх пераўвасабленняў у рэжысёра так мала! Спрабую перш-наперш сам сабе рабіць ролю, — гэта цалкам магчыма ў кіно; адтуль, з кіно, апошнім часам паболела прапаноў... З другога боку, хочацца ўжо адысці ад формы, ад характарнасці, каларытнасці і да т. п., — каб дапяць да зместу, да аўтара, да ягонага пакрыёмага сэнсу. Няхай бы гэта быў не самы касавы спектакль, тым больш, што мы ўсё адно жывём не ад збораў. З'явіўся ўжо «Каін» Байрана з вельмі складаным вершам, працуем над «Горам ад розуму» Грыбаедава, але... Усё хоць чымсьці, але не па мне. Там вершы, тэатральнасць, умоўнасць, а трэба паспрабаваць сябе ў дакладнай псіхалагічнасці, у падаванні матывовак, у тым, што глядач не разгадвае, але і не абмяжоўваецца, так бы мовіць, здыманнем вонкавай ролевай зразумеласці, якая ляжыць на паверхні вобраза. Ёсць жа розныя тэатральныя школы, абсалютна, дарэчы, супрацьлеглыя. Вось школа Станіслаўскага, здаецца, састарэлая і ператвораная ў агульнае месца: зірнём на Плята, на Ранеўскую, на нашу Клімаву, — яны працуюць чысцютка паводле ягонае школы, але — як!

— Рацыя. Здаецца, сёння ўжо і не так важна, што нам скажуць ды пакажуць са сцэны, не важна нават тое, што стаіць за спектаклем. Найважны той, хто гэта робіць вочы ў вочы з гледачом: акцёр-асоба. Тая, што цікавей за любую школу...

— Я веру ў лёс. Веру ва ўдачу. Мне па душы нялёгкі шлях Аляксея Пятрэнкі, і я не давяраю, скажам, феерычнаму, прыгожаму шляху Дзмітрыя Харацьяна. Я калісьці жыў вельмі весела, нават безаглядна, а цяпер рытм майго жыцця запаволіўся, з часцінак быцця і работы стала складацца нейкая мазаіка. Стаўлю Богу свечкі. Баюся сурочыць. Саромлюся, калі пазнаюць у метро, а з сямі спектакляў, якія цяпер іграю, сяброў запрасіў бы на... два.

— Ігар, а гэта вялікая ўдача для акцёра, калі роля можа мяняцца разам з ім?

— З Каралём Беранжэ — удача, бо я толькі цяпер зразумеў, пра што мне трэба гэтую ролю іграць. Разумею таксама, што часам неабходны і Рацар з Канстанцінавым, і Розаў, але ж ёсць Чэхаў, Іянеска, Стрындберг, — на ўсе часы і для ўсіх... хто зможа іх ўзяць. Я люблю добрую — літаратуру, музыку... Ні разу не дачытаў Чэйза, — сумны ён, не варта час марнаваць. Часам, праўда, людзі, чыйму густу я заўжды даваяраў, кажуць, які адметны... Эдуард Лімонаў, і я злуюся, бо не магу сябе прымусіць знайсці тую адметнасць. Калі сумленна, я не ўспрыняў Бенедыкта Ерафеева, і ты вось расказвала, што ў Польшчы нейкі тэатр ладзіць спектаклі паводле Ерафеева з мэтаю лекаваць наркаманаў, маўляў, клін клінам выбіваюць, а я ў свае трыццаць два гады раптоўна аказваюся такім кансерватарам, што аддаю перавагу, напрыклад, Градскаму, але не таму, тэлевізійнаму, а таму, якога мала хто ведае, з цыкламі на вершы Пастарнака, Бёрнса, Маякоўскага.... Люблю жывапіс маіх сяброў, Люды Шчамялёвай ды Ігара Рымашэўскага, і магу прызнацца, што яны паўплывалі на мой густ сваёю дзівоснаю тэатральнасцю, вытанчанасцю, гумарам... Вось дзе нацыянальная ідэя, я б сказаў, несумненна падзяляе агульначалавечае! А агульначалавечае набывае такі шчамялёўска-рымашэўскі каларыт...

— Вось на гэтых мастаках з нашай гаворкі знікне апошні прывід ўяўнага канфлікту: і я люблю іх вельмі. Таму спынімся цяпер і працягнем пасля Лондана: я спадзяюся, што твае прафесійныя ўражанні будуць цікавыя і нашым чытачам. Шчасліва з ездзіць і абавязкова — вярнуцца!

Фота Аляксея ІЛЛІНА

афармленне міжнароднага фестывалю польскай песні ў Віцебску (1988), міжнароднага фестывалю «Славянскія тэатральныя сустрэчы» (1991), апошняга міжнароднага фестывалю «Славянскі базар» у Віцебску. Надалей пачалося трывалае супрацоўніцтва з беларускімі выдавецтвамі (фірменны стыль выдавецтва «Вышэйшая школа», паштоўкі, плакаты для іх; выйшла ў выдавецтве «Беларусь» «Супрематическая азбука»). На старонку ў каталозе да маскоўскай выставы расцягнуўся спіс конкурсаў і біенале, у якіх прыняла ўдзел Алена Кітаева за апошнія гады. І ва ўсіх гэтых работах пануе яе прыхільнасць, нават адданасць супрэматычнаму стылю Казіміра Малевіча.

У гісторыю мастацтва ўвайшло вядомае жаданне Малевіча пабачыць татальнае шэсце супрэматызму. Праўда, яго шчырая любоў і надзея на будучае свайго дзецішча былі досыць жорстка адсунуты наступнымі пакаленнямі авангардыстаў. Ужо Філонаў, а за ім іншыя, адмаўляюцца ад чыстай формы, прызнаўшы гэты шлях тупіковым для далейшага развіцця мастацтва, і звяртаюцца да фігуратыўнасці, толькі на больш абагуленым, філасофскім узроўні. Так супрэматызм і застаўся ў свядомасці мастакоў у двух накірунках: як найвялікшая мастацкая спадчына і як адзін з вытокаў сучаснага дызайну, пабудаваны на прыгожай лагічнасці форм. Што ж датычыць айчыннага дызайну, тут лёс спадчыны Малевіча трагічны. Зразумела, вінаваціць можна толькі гісторыю, але мара пачынальніка супрэматызму — упрыгожыць асяроддзе — так і не спраўдзілася. Дызайн пачынае хутка набіраць моц толькі ў апошняе дзесяцігоддзе, звяртаючыся, нарэшце, да авангардных здабыткаў.

Вядома, супрэматызм меў сваіх вядомых паслядоўнікаў: Стрэмінскі, Мандрыян, іншыя. Але гэтыя адзінкі былі мастакамі-філосафамі, яны спрабавалі ажывіць канцэпцыі Малевіча. Алена Кітаева, таксама шчырая паслядоўніца выдатнага майстра, зусім не вызначаецца экспрэсіўнасцю. Эмацыянальная ў жыцці, у мастацтве яна стрыманая і працавітая.

Як вызначыць яе амаль літаральнае адлюстраванне супрэматычных прыёмаў у плакаце, нават цытаванне Чашніка і Лісіцкага ў «Супрематической азбуке», дзіцячай кніжцы для авалодання мовай мастацтва разам з мовай слоў? Што гэта — дэкаратыўны ход, транссупрэматызм, шлях па вядомай, але падзабытай каляіне? Альбо спроба ідэйна і выяўленча вызначыць супрэматызм, пабудаваць падмурак яго далейшага развіцця? Складана знайсці гэтую мяжу, бо мастацкія эксперыменты Кітаевай існуюць у поўным вакууме, — не маючы ні паслядоўнікаў, ні канкурэнтаў, а толькі крытыкаў.

Наўрад ці супрэматычныя вышукі Кітаевай падмацаваны ідэйна, але яны прыцягальна прыгожыя. Мастачка нібы гуляе з коламі, квадратамі, кубамі, яна дазваляе сабе абмежаваную колеравую гаму з чорнага, чырвонага і сіняга, што ўзыходзіць да Малевіча і нязвыкла хвалюе ўяўленне. Яна смела ўводзіць у кампазіцыю вядомыя работы, так у «Супрематической азбуке» «Б» — башня Татліна, «Г» — горад Лісіцкага, «К» — канструкцыя Паповай, а вокладка — з чорным квадратам. Алена спрабуе вырвацца з паверхні ліста, так з'явіліся Юлы, вялікія і малыя, механічныя фуэтэ (фантазіі на тэму беларускага балета). А як паставіцца да калоды ігральных супрэматычных карт, яшчэ нідзе не надрукаваных, дзе містычныя дамы і каралі — і постаці, і канструктыўныя знакі (прыкладам, у гісторыі карты стваралі і Соня Дэланэ, і Білібін? Альбо бясконцы рух у дэкаратыўнай прасторы плакатаў («Віцебскі трамвай» да фестывалю польскай песні)? Але і тут не адчуваецца, што мастачка хацела вывесці новую форму альбо канцэпцыю супрэматызму. Яна размаўляе мовай стваральніка УНОВИСА, нібы навучаецца першапачатковай артыкуляцыі, дзеля стварэння ўсё больш складаных геаметрычных пабудоў. Часам узнікае ўражанне, што яе цікавяць толькі рытм геаметрычных фігур і логіка кампазіцыі. Цікава, што жывапіс Малевіча вельмі пачуццёвы, але яго квадраты — няроўныя, нібы пульсуючыя на халстах, — мёртва застываюць на паперы. Кампазіцыі Алены Кітаевай захоўваюць гэтую пачуццёвую няроўнасць нават у тыражыраванай прадукцыі пры існуючай паліграфічнай якасці. Яе плакаты маюць выразны ўнутраны рух, пабудаваны на супрацьлегласці супрэматычных фігур. Як прыклад, плакат «Беларускі балет», дзе ў розных плоскасных варыяцыях існуюць кола і трохкутнік. Альбо плакат, прысвечаны У. Стрэмінскаму, пабудаваны на руху літар рознай велічыні. Здаецца, мастачцы падабаецца такая гульня, якая пасля набывае афіцыйнае прызнанне. Яе работы існуюць на вастрыні арыгінальнасці і элегантнасці, але, на жаль, не самаіроніі, што і дазваляе ёй так безабаронча стаць аб'ектам крытыкі маскоўскай прэсы.

Як толькі не называлі яе выставу ў галерэі дызайну. Аж захлынаючыся, пісалі пра «беспардонны, бурны трапічны супрэматызм, перасаджаны на маскоўскі агарод», «сляпую любоў да Малевіча», «правінцыйнасць», якая не мае аніякай павагі да сапраўднага дызайну. Маскоўскага, відаць. Але як тады расцэньваць

Кінетычная Юла



Рэкламныя майкі для беларускага балета

штогодні ўдзел мастачкі ў міжнародных выставах графічнага дызайну і плаката з жорсткім і незалежным адборам удзельнікаў: біенале ў Варшаве, Брно, Таяма (Японія), Мехіка, Лахці, Каларада? Тое, што менавіта Кітаеву запрасілі ў 1990 г. выканаць рэкламу для гастроляў у СССР Англійскай нацыянальнай оперы? А вядомы лонданскі калекцыянер Філіп Гранвіль уключыў у свой збор і плакаты А. Кітаевай. Ці ж не гэта крытэрый прызнання мастака?

Плакаты, буклеты, паштоўкі, сувеніры, нават майкі з фірменнымі знакамі беларускага балета карыстаюцца вялікай папулярнасцю за мяжой. Алена Кітаева паспрабавала сябе і як мастак па касцюму ў балеце «Серэнада» на музыку П. Чайкоўскага, і як мастак-афарміцель у часопісе «Московский художник». Кола яе дзейнасці хутка разрастаецца ўшыркі, што можа прынесці толькі плён мастачцы, узбагаціўшы яе новымі прыёмамі. А гэта неабходна, каб не трапіць у замкнёнае кола ўласнага стылю і пазбегнуць лёсу капіраваць самога сябе. Магчыма, пошукі стануць штуршком да больш глыбокага асэнсавання супрэматызму і дададуць творчасці Алены Кітаевай новыя рысы.

Наталля ШАРАНГОВІЧ

Фота А. МАЦЮША

Партрэт Алены Кітаевай.

У ВАРТАСЦІ ЖЫЦЦЯ

7 кастрычніка свой новы тэатральны сезон адкрывае Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача. Бадай ці не ўпершыню за апошнія дзесяць гадоў чакаю адкрыцця з такой нецярплівасцю і так зацікаўлена: моцныя ўражанні пакінулі работы тэатра ў сезоне мінулым.

Спектаклі «Старадаўняя казка» Юрася Мажэйкі, «Песня пра зубра» паводле паэмы Міколы Гусоўскага, «Тая, што стварыла цуд» Уільяма Гібсана і ўрок-гульня «Пра гэта не гаворацъ» прыкметна змянілі тюгаўскую афішу, абазначылі зрухі ў творчай дзейнасці калектыву. Выявіўся значны патэнцыял трупы.

Лёгка было назіраць збоку і іранізаваць наконт «абслугоўвання школьных праграм» (прынамсі, аўтару гэтых радкоў). Цяжка ТЮГу было мэтанакіравана працаваць на тое, каб залучыць да сябе і выхаваць гледача. Творчыя вынікі 1993/94 тэатральнага года рэальна засведчылі магчымую перспектыву абранага накірунку, звышзадачай якога з'яўляецца псіхалагічная рэабілітацыя дзіцяці.

Якасныя змены ў работах ТЮГа адзначыць сёння напэўна і самы прыдзірлівы тэатрал. Тюгаўская сцэна зажыла мастацкімі вобразамі, глядзельная зала спазнала атмасферу тэатральнага відовішча. Можна ўявіць, колькіх намаганняў гэта каштавала...

Але здзейсненае, як слушна заўважае мастацкі кіраўнік тэатра Мадэст Абрамаў, толькі пачатак. Самае цяжкае чакае трупу наперадзе. Каб рухацца пэўна, не перапыняючыся, трэба вырашыць шэраг праблем. Перш-наперш — вызначыцца ў самім разуменні інстытута дзіцячага тэатра і толькі тады распрацаваць канцэпцыю яго станаўлення і развіцця, без чаго ТЮГу наўрад ці ўдасца набыць сваё праўдзівае творчае аблічча. Наспела, відаць, патрэба і ў структурнай перабудове тэатральнага арганізма.

Якраз гэтыя пытанні і мае на ўвазе адметная імпрэза, задуманая пры актыўным удзеле Тэатра юнага гледача. На базе ТЮГа з 24 па 29 кастрычніка пройдзе Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя і трыенале «Тэатр — дзецям». У рэчышчы агульнай размовы мяркуецца аб'яднаць тэорыю і практыку сцэны, свята і будзень дзіцячага тэатра.

Трыенале спраўдзяць тэатр з Мангайма (Германія), Маладзёжны тэатр з Масквы і беларускі ТЮГ. Акрамя знаёмства з пастаноўкамі гэтых калектываў, плануюцца выставы дзіцячага малюнка паводле прагледжаных спектакляў, выезды ў школы да дзяцей, цяжкіх для выхавання, «круглы стол» на тэлебачанні.

Што да спектакляў, дык сёлета асаблівая ўвага будзе нададзена казцы. Літаральна на пачатак сезона прымеркаваная прэм'ера «Ноч на Івана Купалу» Юрыя Куліка. У рабоце знаходзіцца п'еса Сяргея Кавалёва «Заяц варыць піва», напісаная па матывах вершаў і казак Уладзіміра Караткевіча. На далейшае ёсць задума распачаць цыкл казачнай класікі.

Яшчэ адна асаблівасць рэпертуарных планаў на новы сезон — стварэнне спектакляў паводле канкрэтных прапаноў з боку тых, хто наведвае ТЮГ. Так, улічваючы пажаданні сваіх гледачоў, Юры Вута бярэцца за пастаноўку «новай серыі» школьных показак — «СуперША — 2». А прапанова настаўнікаў прадставіць як-небудзь творы сусветнай драматургіі, з якімі іхнія вучні знаёмяцца падчас заняткаў, падштурхнула М. Абрамава на стварэнне сцэнічнай кампазіцыі — гэтага падарожжа ў драматургію Лопэ дэ Вегі, Шэкспіра, Гогаля... Гэткім чынам актыўна спрацоўвае адваротная сувязь, дапамагаючы ТЮГу мацаваць спецыфічнае ўзаемаразуменне паміж сцэнай і глядзельнай залай.

Можна меркаваць, што сур'ёзнасць і паслядоўнасць у рабоце, якія абумовілі «новы пачатак» у дзейнасці Тэатра юнага гледача, будуць вызначаць і вартасці ягонага мастацкага жыцця.

Ала САВІЦКАЯ

ПРЫГАЖУНІ ПРЫХОДЗЯЦЬ, АДЫХОДЗЯЦЬ...

А «Верасы» — застаюцца. Імёны прыгажунь, якія былі на першым плане ў гэтым папулярным ансамблі, таксама застаюцца. Толькі ўжо ў ягонай гісторыі. На першых ролях былі тут калісьці Н. Мікуліч, Я. Паплаўская, Ю. Скараход, І. Ваяводзіна, А. Ялінская... З імёнамі з іміджам — Анжэлікі Ялінскай творчае жыццё «Верасоў» было звязана да зусім нядаўняга часу. І вось мастацкі кіраўнік ансамбля Васіль Раінчык «запаліў» новую «зорачку»: у «Верасоў» — маладая салістка Ірына Дарафеева. Прыгажуня Ліка ад калектыву адышла. Што далей? Пакажа час. Артыстычны свет — далікатны, не будзем спяшацца ў яго са сваімі недарэчнымі пытаннямі...

Віншуем!

Якубу УСІКАВУ — 75

Якуб Усікаў належыць да старэйшага пакалення беларускіх крытыкаў і літаратуразнаўцаў. З першымі артыкуламі і рэцэнзіямі ён выступіў яшчэ ў 1946 годзе. На гэты час ужо меў за плячыма нямала жыццёвых сцяжын. У 1940 годзе скончыў Мінскі педа-агічны інстытут імя М. Горкага. З трэцяга курса вучыўся завочна. Працаваў дырэктарам сярэдняй школы ў Вялікім Сяле Дзяржынскага раёна, выкладчыкам мовы і літаратуры ў Мар'інагорскім сельскагаспадарчым тэхнікуме. У час Вялікай Айчыннай вайны партызаніў, а прызваны ў армію, ваяваў на 2-ім Беларускім фронце. Быў паранены.

З 1945 па 1949 год працаваў у рэдакцыі газеты «Чырвоная змена» і адначасова з 1947 па 1949 год вучыўся ў аспірантуры пры Інстытуце мовы, літаратуры і мастацтва Акадэміі навук Беларусі. Пасля заканчэння яе кандыдат філалагічных навук Я. Усікаў да 1975 года загадваў кафедрай беларускай літаратуры Магілёўскага педагагічнага інстытута.

На творчым рахунку Я. Усікава шэраг кніг, што засведчылі аб плённасці мастакоўскіх пошукаў даследчыка — манаграфіі «Драматургія Кандрата Крапівы. Нарысы аб станоўчым героі» (1953), «Беларуская камедыя. Ля вытокаў жанру» (1964), «Беларуская камедыя» (1973), зборнік літаратурна-крытычных артыкулаў «Грамадзянскае сумленне мастака» (1976)...

Я. Усікаў напісаў нарыс жыцця і творчасці аднаго з выдатнейшых беларускіх драматургаў — «Андрэй Макаёнак» (1984), з'яўляецца адным з аўтараў дапаможнікаў для студэнтаў ВНУ «Беларуская дзіцячая літаратура» (1966), «Беларуская вуснапаэтычная творчасць» (1966), «Гісторыя беларускай літаратуры: XIX — пачатак XX ст.» (1981), «Гісторыя беларускага тэатра» (1983).

Віншуем Якава Кірылавіча з 75-годдзем! Зычым яму доўгіх год жыцця, новых творчых поспехаў!

ЗДАНІ ЎЗНІКАЮЦЬ АПОЎНАЧЫ...

(Пачатак на стар. 5)

ваўкамі». Парадак любой цаной і любымі сродкамі, як пры Сталіне. А нядаўна гэта загучала на афіцыйным узроўні, з канкрэтнымі рэкамендацыямі, як дабівацца «парадку», кіруючыся правілам «не можешь — научим, не хочешь — заставим». Некалі гэта быў чыста ГУЛАГаўскі лозунг, што вісеў ці не ў кожнай «зоне» і ўдаваў сабой асноўны прынцып камуністычнай пенітэнцыярнай сістэмы з яе перавыхаваннем прымусовай працай. Той самай, дарэчы, што паўстала прадметам разгляду Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый (яе рэзалюцыі мелі загаловак «Аб рабскай працы ў СССР»). Супадзенне, думаецца, невыпадковае, ад якога ўзнікаюць вельмі непрыемныя асацыяцыі і ўспаміны...

«Запуск» жа прамысловасці мяркуецца здзейсніць з дапамогай расійскіх ваенных заказаў тутэйшаму ВПК. Такая прадукцыя, як вядома, можа быць выкуплена толькі дзяржавай, якая будзе расплачвацца за яе грашамі падаткаплацельшчыкаў, і, у выніку, зноў будзе не рост, а паніжэнне жыццёвага ўзроўню... Дый дзяржава, а ў дадзеным выпадку гэта расійская дзяржава, зусім не збіраецца расплачвацца, бо сама яна рашуча ўступіла на шлях рэформ і імкнецца скарачаць ваенныя расходы і канверсаваць адпаведную прамысловасць. На каго і на што можна разлічваць, хіба што на Зюганава з Жырыноўскім? Ці на скандальна вядомага Эдзічку Лімонава?.. Апошнія прадстаўляюць не расійскі ўрад, а «непрымірымую апазіцыю» гэтаму ўраду, і стаўка на такую апазіцыю ў дадзенай сітуацыі набывае вельмі непрыгожае палітычнае адценне. Праўда, у нашым кіраўніцтве, як здаецца, гэтага не надта саромеюцца...

Характэрна, што пры падобнай настальгіі па Савецкім Саюзе цалкам ігнаруюцца пытанні духоўнасці, нацыянальнай культуры, суверэнітэту. Усё гэта, разам з мовай і дзяржаўнай сімволікай, з пагардай адкідваецца ўбок, а ўзамен прапануецца старая, як свет, тэорыя панславізму, падмацаваная сучаснымі неафашысцкімі ідэйкамі. Як вядома, Н. Д. Данілеўскі, адзін з яе аўтараў, марыў у свой час аб стварэнні Вялікага славянскага Саюза са сталіцай у Канстанцінопалі, перайменаным у Царград, з чарнаморскімі праліўмі, з рускай моваю ў якасці агульнаславянскай, з сістэмай «гегеманічнай федэрацыі», г. зн. федэрацыі пад гегемоніяй Расіі. Саюз гэты, згодна Данілеўскаму, павінен быў процістаяць аб'яднанай Еўропе. Варта перачытаць яго нашумелую ў свой час кнігу «Россия и Европа», каб убачыць, адкуль бярэ сваю ідэалогію наш так званы «Славянский Собор». Жырыноўскі з яго «рыўком на поўдзень» таксама сілкуецца з той жа крыніцы. І не толькі Жырыноўскі.

На вялікі жаль, штосьці блізкае да гэтага прагучала нядаўна і ў нас на самым высокім афіцыйным узроўні. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнка ў інтэрв'ю маскоўскаму журналісту А. Каравулаву адкрыта выказаўся ў тым сэнсе, што ён ідзе «нават далей, чым федэрацыя», у кірунку аб'яднання славянскіх рэспублік пад згідаю старэйшага брата, прычым апошнія два словы былі ўжыты без аніякай іроніі, у сэнсе, узятым са сталінскіх яшчэ часоў. Трэба думаць, азначанае інтэрв'ю давалася А. Лукашэнкам як прыватнай асобай, якая, вядома, мае права на ўласную думку і па праблеме дзяржаўнага суверэнітэту. Аднак тады ўзнікае заканамернае пытанне, калі ж шаноўны грамадзянін А. Лукашэнка быў шчыры: ці калі даваў гэтае інтэрв'ю, ці калі прыносіў прэзідэнцкую прысягу, паклаўшы руку на Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, дзе ў параграфе 100 пад першым нумарам напісана, што Прэзідэнт «прымае меры па ахове суверэнітэту, нацыянальнай бяспекі і тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь». Пытанне, як бачым, застаецца непрыемным, калі не ў юрыдычным, дык у маральным кантэксце... У цывілізаванай дзяржаве таго хапіла б для ініцыяцыі імпічмэнту.

Цікава, што сярод пэўнай часткі прыхільнікаў аднаўлення СССР, у тым ліку і нашых рускамоўных інтэлектуалаў, бытуе і канцэпцыя, арыентаваная не толькі на Расію, але і на Амерыку, ці, дакладней, на амерыканскі ўзор. Гэта лімонаўская канцэпцыя «плавільнага катла», згодна якой усе нацыянальныя меншасці і іх культуры павінны бязлітасна сплавіцца на амерыканскі капыл у межах адзінай расійскай дзяржавы ў нейкае адзінае рускамоўнае цэлае. Для прыхільнікаў яе, аказваецца, зусім не мае значэння тая акалічнасць, што амерыканская дзяржава з яе культурай стваралася людзьмі, адарванымі ад сваіх нацыянальных каранёў, і на тэрыторыях, што не мелі аніякіх культурных традыцый, літаральна на голым месцы (лёс індзейскіх культур нам добра вядомы). На Беларусі ж і традыцыі, і мова, і культурныя карані, як бы ні хацелі іх вытаптаць мясцовыя служкі расейскага нацыянал-бальшавізму... Жаданы «плавільны кацёл» можа ўпаўне не вытрымаць і ўзарвецца па югаслаўскім узоры, толькі ў непараўнальна большых і страшных памерах...

Здавалася б, усё гэта павінна быць ясным і зразумелым. Каму ж з людзей старэйшага ўзросту не хацелася б вярнуць часы іх рамантычнай маладосці, і, тым болей, каму з партакратчыкаў і неабальшавікоў не карцела б атрымаць назад былыя іх выгоды і прывілеі? Але за «прывід» Савецкага Саюза стаяць і галасуюць зараз і дастаткова шырокія масы насельніцтва, прычым не толькі ў нас, на Беларусі, але і на Украіне, адпаведна прыводзячы да ўлады пракамуністычныя сілы. Апошнія ўвогуле зараз узнімаюць галаву, зноў-такі апіраючыся на законы і дэмакратыю, — і ў Прыбалтыцы, і ў Венгрыі, і нават у Польшчы!.. Тут дзейнічаюць, думаецца, больш глыбокія прычыны, прычыны не толькі сацыяльнага, але і сацыяльна-псіхалагічнага і нават светапогляднага характару. Нягледзячы на пастаянныя клятвы ў вернасці так званай матэрыялістычнай дыялектыцы, і ў тэорыі і на практыцы ў нас фактычна панавала самае што ні ёсць вульгарнае «чорна-белае» мысленне па прынцыпе «альбо-альбо». Яно было характэрна не толькі для бальшавікоў, але і для народнага, так бы мовіць, мыслення ўвогуле — мыслення менш лагічнага і больш эмацыянальнага. Яно і ў бальшавікоў, зрэшты, з'явілася пад уплывам апошняга, бо ў класічным марксізме было ўсё ж пэўнае імкненне да дыялектыкі, г. зн., да мыслення тыпу «і-і», хоць і ў Маркса, па з'едлівай заўвазе С. Булгакава, вернасці гегелеўскай дыялектыцы хапіла толькі на першы раздзел «Капіталу»... У бальшавізме як нацыянальна-рускай форме марксізму праявілася спецыфічна расійская ментальнасць з яе агалошаным яшчэ вядомым паэтам прынцыпам «коль рубнуть, так уж сплеча». Тут не месца спыняцца на прычынах такой ментальнасці ў рускага народа, абумоўленай гістарычнымі абставінамі; пра тое, зрэшты, не раз ўжо пісалася. Скажам толькі, што з тэарэтычна-сістэмнага пункту погляду гэта прыкмета ўнутранай сістэмнай няўстойлівасці, і ў рускай культуры тую няўстойлівасць адзначалі расійскія славянафілы і заходнікі з чаадаеўскіх часоў. Падобная няўстойлівасць, на жаль, уласцівая і для беларускай ментальнасці, нягледзячы на праславутую талерантнасць, цярпімасць і што там яшчэ... Пра тую няўстойлівасць пісаў Ігнат Канчэўскі, параўноўваючы яе ні многа ні мала з геатэктанічным разломам, што раздзяліў Еўропу і Азію, Захад і Усход.

Вось гэта самая неабальшавіцкая разломная логіка «альбо-альбо» праяўляецца зараз у нашых рэфарматараў-дэмакратаў. Як ні дзіўна, яны дзейнічаюць часта ў шорах самага сапраўднага марксізму-ленінізму, засяроджваючы ўсю сваю ўвагу на эканоміцы і пакідаючы ўбаку ўсе надбудовачныя, г. зн., духоўныя каштоўнасці, такія, як сацыяльная справядлівасць, мараль, рэлігія, філасофія, мастацтва. Нават у чыста палітычнай агітацыі і прапагандзе ўсё зараз круціцца выключна вакол эканомікі, паглыбляючыся часам у такія яе тонкасці, якія сярэдні выбаршчык і не ў стане зразумець... У той жа час такія рэчы, як страта высокіх ідэалаў, імклівае нарастанне сацыяльнай несправядлівасці, адкрыты амаралізм, паніжэнне сексуальнай маралі і разлажэнне сям'і, катастрафічнае збядненне адных і фантастычнае ўзбагачэнне другіх, цынічны культ сілы ў моладзі, агульны заняпад як у матэрыяльным, так і ў эстэтычным сэнсе мастацкай культуры, — усё тое застаецца, на жаль, па-за ўвагаю нашых рэфарматараў. Так і прыходзіць міжвольная думка, што кіруюцца яны прынцыпам, так бы мовіць, не «быць», а «мець». Але гэта ўжо прынцып не пад'ёму грамадства, а яго заняпаду, як тое было паказана і Тойнбі, і Шпенглерам, і Сарокіным. Ды і Маркс, зрэшты, схіляўся да гэткага ж разумення, бо менавіта такім і быў капіталізм XIX стагоддзя, крытыцы якога ён аддаў столькі сіл і на які міжвольна ці вольна арыентуюцца і некаторыя сённяшнія рэфарматары-дэмакраты...

Усё гэта бачыць так званы просты чалавек, сярэднеарыфметычны выбаршчык, што вырас ва ўмовах савецкай імперыі, і гэта вельмі яго палохае. Хоць і не надта дасведчаны ён у сакрэтах эканамічнай навукі, але можа нядрэнна зрабіць параўнанне таго, што атрымалася, з тым, што было, не толькі ў эканоміцы, але і ў духоўным жыцці. І параўнанне будзе зроблена, канечне ж, не на карысць сучаснасці. Тым болей бачаць тое работнікі культуры, якія літаральна на сабе адчуваюць, да чаго вядзе прынцып laissez faire у культуры, напрыклад, мастацкай, ператвараючы яе ў прастытуіраваны прадмет куплі-продажу. Менавіта гэтым тлумачыцца той нечаканы на першы погляд факт, што такія славутыя прадстаўнікі расійскага дысідэнцкага руху, як А. Зіноўеў і У. Максімаў, пачынаюць супрацоўнічаць з «Правдой», а ў нас некаторыя дзеячы ў настальгіі па «вялікім мінулым» пагражаюць нават «умереть стоя». Праўда, у апошнім выпадку галоўную ролю адыграла, думаецца, не столькі туга па тым мінулым, колькі традыцыйна халопскае нізкапаклонства перад маскоўскімі аўтарытэтамі.

Мы сапраўды зараз амаль што задушаныя эканамічнымі бедамі і недахопамі. Але ж не трэба забываць, што не хлебам адзіным жывы чалавек. Патрэбен яму і дух, патрэбна Фаворскае святло. І святло тое канцэнтруецца ў сціплых, але вечных ідэалах хрысціянскае дэмакратыі, якая, падаецца, толькі і здольна вывесці нас на правільную дарогу. І выведзе, бо менавіта яна спалучае ў гарманічным адзінстве матэрыю і дух, эканоміку і духоўную культуру. Ды гэта ўжо прадмет асобнай гаворкі... Пакуль жа мы блукаем у цемры бездухоўнасці, бо і грамадства наша, і культура перажываюць, гаворачы словамі таго ж Шпенглера, нават не «вечар», а глыбокую поўнач. Таму і мроящца сяму-таму, зусім як у Гогаля, злавесныя мерцвякі, што паўстаюць з магіл: то Расійская імперыя у дарэвалюцыйных межах, то гіганцкі, узброены да зубоў архіпелаг ГУЛАГ пад шыльдаю «СССР». Здані ўзнікаюць апоўначы...

СВЕТЛЫ СЛЕД БУДЗЕ ВЕЧНА ЖЫВЫМ

ПАМЯЦІ ІВАНА ЛАСКОВА

«Я ўжо цалкам перакананы ў правільнасці сваёй гіпотэзы. Тым і жыву сярод нягод апошняга часу. Ёсць адчуванне, што нездарма жыву», — пісаў мне нядаўна Іван Антонавіч Ласкоў, які так рана і раптоўна пайшоў ад нас. Тым, хто ведаў яго, жыццярадаснага, энергічнага, цікаўнага да ўсяго на свеце, цяжка паверыць, што яго больш няма.

Закінуты лёсам у Якуцію, Ласкоў даваў прыклад такога шчырага служэння беларускай ідэі, якім мала хто можа пахваліцца і жывучы тут. Паэт, празаік, крытык, ён у апошнія гады найбольш часу і сіл аддаваў гістарычным доследам. Яго гіпотэза аб фіна-ўгорскім паходжанні летапіснай літвы — сапраўднае навуковае адкрыццё, плён арыгінальнага, нестандартнага мыслення.

З дакладам на гэтую тэму Ласкоў сёлета павінен быў ехаць у Хельсінкі, на міжнародны кангрэс фіна-ўгорскіх народаў. Не паспеў... Не паспеў ён закончыць два раманы і п'есу; сабраць у архівах КДБ звесткі пра ўсіх беларусаў — ахвяраў сталінскіх рэпрэсій у Якуціі. Але паспеў закончыць і перадаць у Беларусь, у выдавецтва «Мастацкая літаратура», галоўную працу свайго жыцця — кнігу пра летапісную літву.

«Ласкоў рабіў вялікую справу, — лічыць Адам Мальдзіс. — Ён практычна адзін распрацоўваў фіна-ўгорскі пласт у стварэнні беларускага этнасу. Не хачу сказаць, што яго высновы з'яўляюцца ісцінай у апошняй інстанцыі (такога нельга сказаць ні аб адным даследчыку), але мне асабіста яго доказы здаюцца лагічнымі і пераканаўчымі».

У гіпотэзы Ласкова ёсць і прыхільнікі, і праціўнікі. Аднак пакуль што аспрэчванне яе ідзе толькі ў прыватных размовах. Няма ніводнай публікацыі, якая б гэту гіпотэзу абгрунтавана абвяргала. Ласкоў чакаў навуковай дыскусіі. Яна не адбылася. «У кожнага нашага вучонага — свая дзялянка», — сумна жартаваў ён.

Калі ўжо чалавек абараніў дысертацыю, што Волма ці Арэса — балцкія назвы, ён будзе трымацца за сваё да канца. Хоць варта проста разгарнуць атлас Рэспублікі Комі, каб убачыць там і Волму, і Арэсу, і Зэльву, і Немын, і шмат чаго яшчэ. А следам за філолагамі ідуць і археолагі. Раз Волма — назва балцкая, значыць, і культура, знойдзеная там, таксама балцкая. Кола замыкаецца.

Разам з публікацыямі на Бацькаўшчыне артыкулы Ласкова часта з'яўляліся ў беларускай эміграцкай прэсе. Вялікі яго артыкул змешчаны ў газеце «Вечерний Сыктывкар». Засталася цікавая перапіска Ласкова з летувіскімі вучонымі.

Адзін з гэтых вучоных пачаў перапіску жорстка: «Мне жаль, что вы, образованный человек, преследуете такие гнусные цели... Вы излагаете свою теорию, где только можно, с целью лишить нас нашей истории». Ласкоў адказаў яму, што не пазбаўляе летувісаў гісторыі, а дапамагае ўзнавіць яе ў сапраўдным выглядзе, а скажэнне гісторыі ніводнаму народу не прыносіла карысці. Нарэшце яны неяк паразумеліся, і летувіскі вучоны прызнаўся Ласкову, што ён таксама знайшоў шмат фіна-ўгорскіх слядоў на тэрыторыі Летувы, але яго нідзе ў Летуве не друкуюць. Нібыта няма тых слядоў — і ўсё!

Мне здаецца, што і на Беларусь летувісы хочуць распаўсюдзіць гэты прынцып — не было фіна-ўграў, былі толькі балты. Колькі прац нашых навукоўцаў-«балтафілаў» канчаюцца шчырай падзякай вільнюскім калегам, што прадаставілі ім патрэбныя матэрыялы.

Тым больш прыемная прыхільнасць да Ласкова такіх выдатных вучоных, як Адам Мальдзіс і Мікола Ермаловіч. «Ласкоў знайшоў залатую жылу, хай распрацоўвае яе далей, — не раз пры сустрэчах са мной гаварыў Ермаловіч. — Напішыце, каб хутчэй вяртаўся ў Беларусь. Такія людзі патрэбны тут».

Вярнуцца ў Беларусь — гэта была запаветная мара Івана Антонавіча. Але як? Тут не абяцалі яму ні працы, ні кватэры. Напэўна, былі праблемы сямейнага плана: жонка — якуцкая пісьменніца, у Якуцку нарадзіліся і выраслі дзеці. Дадаліся і непераадольныя фінансавыя цяжкасці. «Прашу прабачэння за доўгае маўчанне, — пісаў мне Ласкоў. — Я са студзеня беспрацоўны, а беспрацоўны, аказваецца, мае значна меней часу, чым той, хто працуе. Хапаешся за тое і за сёе. Чытаю амаль што задарма лекцыі ў мясцовым універсітэце па расейскай літаратуры пачатку XX стагоддзя: Блок, Бунін, Гумілёў, Ахматава, Пастарнак і г. д. Пішу штотыдзень для газеты...»

Пісаў ён літаратурныя агляды, прынцыповыя і вострыя, нажываючы сабе ворагаў у мясцовым пісьменніцкім асяроддзі.

Вось так, занадта напружана, прайшлі апошнія чатыры гады жыцця Ласкова. Гавару — чатыры гады, бо столькі доўжылася маё з ім знаёмства. Пачалося яно з перапіскі (ліставання, як гаварыў Ласкоў) па праблемах яго артыкула «Племя пяці родаў». Потым мы некалькі разоў бачыліся ў час яго апошняга прыезду ў Мінск увосень 1991 года. Я ўспрымала гэтае знаёмства як падарунак лёсу. У наш час, калі найчасцей сутыкаешся з раўнадушнасцю, цынізмам, меркантыльнасцю, радасна сустрэць чалавека адукаванага, цікаўнага, самаахвярна і бескарысліва адданага сваёй справе.

У Ласкова быў своеасаблівы розум, востры і абсалютна непадуладны штампам і догмам. Яму не заміналі агульнапрынятыя меркаванні, ён заўсёды думаў сам. Так, уласна, і адбылося з летапіснай літвой. Каму магла прыйсці ў галаву думка, што літва можа быць небалцкім народам? Сама назва вымушала да такой высновы. Але ж назва той, нашай літвы — адно, а назва Літвы сучаснай не гістарычная, яна ўзята самімі летувісамі. Зрэшты, пра ўсё гэта было шмат публікацый Ласкова ў «ЛіМе» і ў «Полымі». Скора, спадзяюся, мы ўбачым і яго кнігу. Сёння мне хочацца сказаць аб іншых знаходках Ласкова, якія ён не публікаваў, бо лічыў нераспрацаванымі, недастаткова даказанымі. Зноў жа, не выдаю іх за ісціну ў апошняй інстанцыі, хай гэта будуць проста тэмы для роздуму.

Вельмі цікавіла Ласкова паходжанне славян. «Славянская гісторыя зусім не высветленая, нават у межах дзвюх тысяч год, — пісаў ён. — Невядома, адкуль яны ўзяліся: ці аднекуль прыйшлі, ці жылі на сваіх сённяшніх тэрыторыях спрадвечна. Прычым на гэты конт няма і паданняў. Нібы такой прорве народаў адбіла памяць. Гэта можа тлумачыцца зменай мовы.

Сёння славянскія народы ў агуле перавышаюць любую моўную еўрапейскую групу. А ў рымскія часы пра іх, лічы, і не чуваць было — так, ускосныя згадкі. Гэта значыць, што іх было зусім мала. Чым жа вытлумачыць іх такі хуткі рост? Незвычайнай пладавітасцю? Вядома ж, такое тлумачэнне было б лухтой. Славяне павялічваліся колькасна аж да II тысячагоддзя н. э. (а рускія — і надалей) дзякуючы пераходу на славянскія мовы фіна-ўграў, абарыгенаў вялізных прастораў.

Славяне здаюцца ў параўнанні з раманскімі і германскімі народамі нейкімі зусім маладымі, яны нібыта адсталі ад гістарычнага развіцця Еўропы аж на тысячу год, жывучы на адзінай з тымі тэрыторыі і практычна ў такіх самых умовах. І гэта, мусібыць, звязана са зменаю мовы, працэсамі перамешвання чалавечых масаў».

Я напісала Ласкову: а ці не магло так быць, што ў час змены моў славянскія і фіна-ўгорскія словы ўжываліся паралельна? Напрыклад, такія нелагічныя словазлучэнні ў славянскім фальклоры, як **гусі-лебедзі** ці **сарока-варона**, маглі раней гучаць як **юсі-лебедзі, ра́ка-варона** (на мове комі юсь — лебедзь, ра́ка — варона). Гэтая мая здагадка вельмі спадабалася Ласкову.

Неяк Іван Антонавіч з радасцю паведаміў: «Я, здаецца, адкрыў сакрэт слова **суніцы**. Па комі-зыранску **сунис** — прадзіва, нітка. А суніцы ж размнажаюцца вусамі, цягнуцца па зямлі, як нітка». З той пары, збіраючы суніцы, заўсёды ўспамінаю Ласкова, яго нітачкі, працягнутыя ў сённяшні дзень з далёкага-далёкага мінулага.

Усе мы ведаем, што славяне ў Ноўгарадзе не змаглі кіраваць самі і запрасілі варагаў (скандынаваў) з-за мора. А вось Ласкоў лічыць, што тое мора было хутчэй за ўсё Чудскім возерам, што варагамі маглі называць людзей з глухіх лясоў (у мове комі **во́р** і **яг** — сінонімы слова лес; спараныя, яны ўзмацняюць сэнс), што слова **русь** занадта нагадвае **весь, чудь, водь**, каб быць заморскім.

«Мае думкі апошнім часам сталі круціцца вакол варагаў, русі і г. д. Пра русь у пачатковым летапісе сказана так: «Те варяги назывались русью подобно тому, как другие называются шведы, а иные норманны и англы, а еще иные готландцы, —вот так и эти прозывались». Выходзіць, што русь — не нарманы, не шведы, не англічане, не гатландцы. Дык адкуль тады ўзялася версія, што русь — скандынавы?

Далей — глядзіце, хто іх запрашаў: «Сказали руси чудь, славяне, кривичи и весь: «Земля наша велика и обильна, а порядка в ней нет. Приходите княжить и владеть нами»...

Звярніце ўвагу, што ў спісе плямёнаў, якія прасілі русь «валодаць намі», на першым месцы стаіць чудзь, хаця цэнтрам дзяржавы стаў Ноўгарад. Гэта яўна паказвае, што чудзі было больш, чым славян...

Што ж да этнічнай прыналежнасці русі, да яе моўнага гнязда, то прыпыняе такі вядомы факт, на які чамусьці ніхто не звяртае ўвагі. Цытую: «И сел Олег, княжа, в Киеве, и сказал Олег: да будет матерью городам русским». Чаму не бацькам? Гэта сведчыць, што ў мове русі не было катэгорыі граматычнага роду... Ва ўсіх фіна-ўгорскіх мовах катэгорыі роду няма. Адной з тых моў і быў носьбітам Алег. Якой менавіта? Тут яшчэ трэба капаць...

Ваша назіранне, што нарманы, калі б гэта былі яны, прыйшлі б ужо хрышчонымі, вельмі каштоўнае. Паглядзіце: яшчэ і напрыканцы X стагоддзя Уладзімір выбіраў паміж праваслаўем, каталіцызмам, юдаізмам і магаметанствам. Калі б русь прыйшла са Скандынавіі, дык, мусібыць, захавала б памяць пра даўняе хрышчэнне ў каталіцызм, і пытання б увогуле не было. А Уладзімір пра гэта не памятае. «Идите, откуда пришли, — гаворыць ён пасланцам папы, — ибо и отцы наши не приняли этого». Якія ж тут скандынавы?»

Вельмі прыгожае тлумачэнне імя Ігар прапануе Ласкоў — ад **юго́р**, што азначае прамень, святло, зара.

Кожнага ліста ад Івана Антонавіча я чакала з нецярплівасцю, нібы гэта быў працяг цікавага прыгодніцкага рамана. Толькі дзеянне ў тым рамане ішло не наперад, а назад, у далёкую дагістарычную пару.

«Я ўзяўся за высвятленне пытання, ці сапраўды паміж еўрапейскімі мовамі маецца генетычная сувязь, ці сапраўды яны паходзяць ад нейкай адной. А можа, агульны пласт іх лексікі тлумачыцца ўзаемадзеяннем носьбітаў гэтых моў?

Метадалогія мая такая. Вылучаю «ядро мовы», г. зн. такія словы, якія павінны былі б у кожнай мове існаваць спаконвечна: назвы найболей важных акаляючых з'яў (сонца, зямля, неба, вецер, агонь і г. д.), частак цела (галава, вочы, нос, рот, рукі, ногі), найважнейшыя дзеясловы (сядзець, стаяць, хадзіць, есці, спаць), найважнейшыя якасці (вялікі, малы, высокі, нізкі, шырокі, вузкі). Выбраўшы да 150 такіх слоў, хачу выпісаць іх з усіх еўрапейскіх моўных груп: славянскія, лацінскія, грэцкія, нямецкія, летувіскія, а потым параўнаць. Ці ж няясна, што калі ўсе гэтыя мовы паходзяць ад адной, то ядро іх павінна супадаць? А ўжо першыя назіранні паказваюць, што такіх выпадкаў, каб слова з ядра мелася ва ўсіх гэтых мовах, выключна мала. Напрыклад, **неба** па-летувіску **дангус**, а на лаціне — **цэлум**, у грэцкай — **уранос**, панямецку — **хімэль**. Ці можна сказаць, што яны паходзяць ад аднаго слова? Вядома ж, не. А неба ж заўсёды было над галавой у людзей. Значыць, каб мовы развіваліся так, як лічыцца, слова **неба** не магло б знікнуць і замяніцца іншым. Адсюль і бачна, што ўяўленне наша няправільнае. Як бачыце, я іду ў такім кірунку, за які мяне пастараюцца з'есці без солі».

І вось апошняе пісьмо, ад 12 чэрвеня (памёр Ласкоў 28 чэрвеня ад інсульту).

«Калі я пішу, што паміж групамі індаеўрапейскай сям'і моў няма генетычнай роднаснасці, я маю на ўвазе, што нельга лічыць, быццам яны паходзяць ад аднаго кораня, аднае агульнай пра-мовы. Гісторыя гэтай сям'і, на мой погляд, зусім не такая. Яна звязаная з распаўсюджаннем лексікі і граматычных асаблівасцяў на індаеўрапейскай прасторы, г. зн. той прасторы, якую сёння займаюць індаеўрапейскія мовы. Распаўсюджанне ж гэтае звязанае з рухам людзей, перамешваннем розных плямёнаў.

Перамешванне было ў першую чаргу звязанае з рабаўніцкімі войнамі, захопам, продажам і перапродажам рабоў. Спачатку персы зганялі ў свае гаспадаркі людзей з Сярэдняй Азіі і Паўднёвай Еўропы, потым тое ж самае рабілі грэкі, пасля гэтых — рымляне. Вялікія масы носьбітаў розных моў пры гэтым перамяшчаліся з канца ў канец ад Індыі да Іспаніі. Зразумела, што пры гэтым перамешваліся і мовы.

Вядома, якая процьма грэцкіх слоў у лаціне. Процьма грэцкіх і лацінскіх слоў у германскіх, балцкіх, славянскіх мовах. А нам думаецца, што гэтыя словы гавораць пра агульнае паходжанне. Не! Індызмы, іранізмы ў германскіх, балцкіх, славянскіх мовах тлумачацца тым, што **ў германскія, славянскія, балцкія народы ўліліся рабы, што бясконца ўцякалі з Рымскай імперыі.** Я думаю нават, што:

1/ Германскія народы ўяўляюць з сябе кельтаў, што зліліся з гэтыкі ўцёклымі рабамі;

2/ Балтыйскія народы ўтварыліся ад зліцця з такімі рабамі жыхароў Панноніі (дакафракійскія плямёны);

3/ Славяне ўтварыліся ад зліцця ўцёклых рабоў інда-іранскага паходжання з пермскімі плямёнамі.

Пермскія плямёны жылі ў басейне Дуная. Тут іх бясконца ваявалі рымляне. Пры гэтым у рабства захоплівалася шмат мужчын. Шмат мужчын і гінула ў сутычках. Месца гэтых мужчын займалі ўцёклыя рабы, што прыбіваліся да плямёнаў...Гэтыя мужчыны займалі галоўнае месца ў плямёнах, рабіліся вядучай сілай, вызначалі твар плямёнаў, у тым ліку агульныя рысы мовы. Рабскае паходжанне славян падкрэсліваецца іх назвай: на лаціне **склав** — **раб**. Першыя славяне зваліся **склавінамі**.

Зразумела, што ўцёклыя рабы былі актыўным элементам. Да таго яны палалі нянавісцю да Рыма. Ведалі яны і пра багацці Рыма. Менавіта таму былыя рабы — германцы — і знішчылі Рым.

Славяне ж склаліся пазней германцаў. Таму ў разбурэнні Рыма яны ўдзелу не бралі. Склаўшыся як племя, выпрацаваўшы мову, яны ў далейшым распаўсюдзілі гэтую мову на мноства пермскіх, фіна-ўгорскіх плямёнаў.

Больш падрабязна пасля»...

Як горка, што гэтага **пасля** не будзе!

Паколькі сярод нашых продкаў былі і фіна-ўгры, давайце падзелім іх веру ў тое, што душы нябожчыкаў робяцца зоркамі і адлятаюць у Млечны Шлях. Хай у Млечным Шляху зорка Ласкова зойме сваё месца, адкуль заўжды будзе бачна любая яго сэрцу Беларусь.

Святлана КЛІМКОВІЧ

Фота М. КЕНЬКІ

І. Ласкоў (у цэнтры) у час свайго апошняга прыезду ў Мінск увосень 1991 года. Злева — С. Клімковіч, справа — кандыдат тэхнічных навук А. Ярусаў, комі-пярмяк па нацыянальнасці, вялікі прыхільнік гіпотэзы Ласкова.

У ВІЦЕБСКУ ЗАКОНЧЫЎСЯ ПЛЕНЭР...

15 верасня ў Віцебску ўрачыста закрыўся вось ужо трэці на гэта лета пленэр. Пасля Шагалаўскага міжнароднага, дзіцячага Рэпінскага тут адбыўся і міжнародны пленэр К. Малевіча. У краязнаўчым музеі размясцілася выстава, там жа праходзіла тэарэтычная канферэнцыя, на якую былі запрошаны госці з Масквы і Санкт-Пецярбурга, прадстаўнікі Фонду Малевіча ў Расіі. Недалёка ад будынка, дзе некалі быў створаны УНОВІС і мастацкая школа, закладзены помнік, аўтарам праекта якога і архітэктарам сталі віцябчане А. Слепаў і І. Лапуноў. Вынікам пленэру павінна стаць стварэнне Цэнтра сучаснага мастацтва пры фінансавай падтрымцы Фонду Сораса, ініцыятыву стварэння якога Віцебск «перахапіў» у Мінска, як зазначыў адзін з арганізатараў пленэра, мастак А. Малей.

І ДВА СПЕКТАКЛІ ЖУГЖДЫ

З 1 па 8 кастрычніка запрошаны на знаны лялечны фестываль у горадзе Ужгарадзе «Загубленая душа, альбо Пакаранне грэшніка» Віцебскага абласнога тэатра «Лялька» (інсцэніроўка У. Граўцова паводле Я. Баршчэўскага) ды «Гарбата на дваіх» — вечаровая лялечная праграма Магілёўскага абласнога лялечнага тэатра. Дадамо, што запрашэнне Алега Жугжды на прадстаўнічы фестываль падрыхтавалі паспяховыя паказы спектакля «Рыгорка — ясная зорка» А. Вярцінскага, спектакля, які не раз збіраў узнагароды самых розных фестываляў.

На здымку: сцэна са спектакля «Загубленая душа...»

Фота М. ШМЕРЛІНГА

ЯКІМ СПРАЎНЫМ ЧЫНАМ?

10 і 11 верасня Магілёў прымаў чарговае міжнароднае дзіцячае свята «Лялька-94», зладжанае па прапанове і на базе Магілёўскага абласнога тэатра лялек з дапамогаю абласнога ўпраўлення культуры ды абласнога навукова-метадычнага цэнтра. Шэсце праз горад перапыняла кірмашовая праграма на галоўным пляцы горада; адмыслова і дасціпна прадстаўляліся тэатры; гандлявалі сваімі вырабамі і народныя ўмельцы... Што да мастацкай праграмы, дык яе склалі спектаклі шматлікіх запрошаных з Беларусі ды Расіі тэатраў, а сам тэатр-гаспадар прадставіў гледачам яшчэ прэм'ерны спектакль «Міа, мой Міа» паводле А. Ліндгрэн ды забаўляльную вечаровую праграму. Гледачы і госці былі задаволеныя, хоць апошнія слушна меркавалі пра... надта малую, куртатую, абмежаваную занятасць у свяце. «Зважым на тое, што свята перадусім ладзіцца не так для Магілёва, як для дзяцей, што так ці іначай жывуць пад Чарнобылем у раёнах, мястэчках ды гарадках. Для дзяцей, якія проста не могуць усім раёнам ці горадам патрапіць на адзін-адзіны выязны спектакль падчас абмежаванага тэрміну, — ці не таму свята набывае ў бальшыні дзятвы прысмак крыўды?.. А мы б маглі сыграць і па два, і па тры спектаклі», — пракаменціраваў мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага тэатра лялек Яўген Клімакоў. Сапраўды, но з шэсця, кірмашовага перабору ды рамесніцкага гандлю можна было б перайсці толькі на спектаклі, спектаклі, спектаклі? Альбо, беручы пад увагу патрэбы горада, спалучыць усё якімсьці больш спраўным чынам?

Перадрук

Адшумелі святочныя шэсці, мітынгі, гулянні, прысвечаныя 50-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Адгучалі харошыя, удзячныя словы па адрасе ветэранаў, франтавікоў і партызанаў, якія цаною неймаверных страт, высілкаў і гераізму ўратавалі родную зямлю і свет ад карычневай чумы. У свята часцей згадвалася апошняе — гераізм. І менш — пакуты, кроў, нягоды, смерць. А між тым...

У расійскім часопісе «Родина», якія стаў амаль недаступным для беларускага падпісчыка, яшчэ ў 1991 годзе (NN6—7) была апублікавана гутарка карэспандэнта часопіса І. Бехцерава з Віктарам Астаф'евым пад такою вось красамоўнаю назваю: «Спачатку снарады, пасля людзі...» Гутарка ўражвае балючай, праніклівай праўдай пра вайну, найперш пра тое, як, у якіх умовах даводзілася ваяваць савецкаму салдату з фашысцкімі захопнікамі. Мяркуем, што яе з цікавасцю прачытаюць і лімаўскія чытачы.

СПАЧАТКУ СНАРАДЫ, ПАСЛЯ ЛЮДЗІ...

— Віктар Пятровіч, у дзесятым нумары нашага часопіса за мінулы год мы паспрабавалі ўзнавіць аб'ектыўную карціну таго, што адбывалася ў Расіі пасля рэвалюцыі, паспрабавалі вызваліцца ад прывітых стэрэатыпаў у поглядзе на грамадзянскую вайну і яе прычыны, на мэты і дзеянні процізмагарных бакоў. Цяпер хацелася б гэтак жа непрадузята паглядзець і на Вялікую Айчынную вайну. Але справа тут больш далікатная. Калі ў перыяд рэвалюцыі і грамадзянскай вайны роля бальшавіцкай партыі ўвогуле адназначная (шляхам падману, тэрору, гвалту ўсталяваць сваё панаванне), дык у перыяд Вялікай Айчыннай у партыі і ў народа мэта аказалася быццам бы адна.

— Мэта, можа, і адна, ды сутнасць розная. У адных — жыццё, уласная кроў, у другіх — падман, хітрыкі, агітацыя. Ды скуру яны проста ратавалі сваю — за кошт нас! А ўжо пасля вайны, у сорак пятым, калі такую славу атрымалі, такую веліч, ашалелі проста: не ведалі, колькі яшчэ народу ў лагеры загнаць, як узнагародзіць сябе, чым пакарміць яшчэ. Яны распараджаліся і лёсамі, і матэрыяльнымі каштоўнасцямі, і прыродай, і ўладай. Нездарма распараджаліся. А савецкая ж улада ніколі камуністам не належала, іх ніколі не выбіраў народ. Народ да гэтага аніякіх адносін не меў, народ можна было толькі знішчаць, як быдла, араць на ім, пераганяць з месца на месца, марыць голадам, падрываць пакаленні, генацыд наладжваць. За гэта цяпер і расплачваемся. І зноў-такі мы, не яны...

Калі да пераправы праз Дняпро рыхтаваліся, там па беразе, па акопах, шнырылі ўсякія, ажно да генералаў. А ўжо маёрыкаў сноўдалася, палкоўнікаў... Падыходзяць да якога-небудзь узбека ці рускага: давай, маўляў, уступай у партыю, у самую лепшую ў свеце, глядзіш, і сям'і дапаможам у выпадку чаго. «Ды Божа мой, пішы, вядома!» А чаго? Палова прадчувае ўжо, што да таго берага не даплыве. Хай пішуць, можа, і праўда сям'і памогуць, дзецям... Ну, і пісалі. А той, хто здолеў запісаць паўсотні ці восемдзесят чалавек, абавязкова ордэн атрымліваў за гэта...

— Ордэн?! Здагадваўся, што не чыста, але каб такое...

— Ну, вядома! А пасля глядзіш: у хлопцаў гэтых, камуністаў толькі што спечаных, і якія пасля ўсе валяліся паўраспранутыя на тым беразе, у кожнага на шыі крыжык. Выразаны з кансервавай бляшанкі, на нітачцы. Таму што на Бога аднаго спадзяваліся, а не на гэтых... Што яны, паперадзе яго пойдуць, ці што? Ды такое толькі ў кіно савецкім, у кніжках нашых!

А пераправа цераз Дняпро... Дваццаць пяць тысяч уваходзіць у ваду, а выходзіць, на тым баку, тры тысячы, максімум пяць. Праз пяцьшэсць дзён усё гэта ўсплывае. Уяўляеце?

— Але як усё-такі быць з гэтым: «Камуністычная партыя Савецкага Саюза і яе роля ў арганізацыі разгрому нямецка-фашысцкіх захопнікаў»? Гэта моцна засела ў нашых галовах... Хоць, калі складаеш адзін да аднаго разрозненыя факты: вынішчэнне кіраўнічых кадраў, недавацэнка характару сучаснай вайны, ігнараванне сігналаў аб падрыхтоўцы ваенных дзеянняў, небывалая колькасць палонных, здрадніцкія адносіны да тых, што апынуліся за калючым дротам і на акупаванай тэрыторыі, катастрафічныя страты, фарміраванне цэлых армій і паліцэйскіх карпусоў з ліку нашых грамадзян (чаго наогул нельга ўявіць, кажучы пра мінулыя войны), няўмелае кіраўніцтва — міжволі прыходзіш да высновы, што вайну мы выйгралі толькі цудам. І ўжо, прынамсі, не зважаючы на «арганізуючую і мабілізуючую сілу партыі».

— Якая там «арганізуючая і мабілізуючая»! Калі б намі кіравалі і камандавалі толькі палітаддзелы, мы б прайгралі вайну за паўтара месяца. Яны і кіравалі — ажно да Смаленска. Там, у акружэнні, генерал Лукін нешта накшталт пераваротy ўчыніў — ці то адхіліў іх, ці то ў атаку разам з усімі пагнаў. Вось ужо тут яны паваявалі!

Першыя нашы контрудары, першыя нашы поспехі — гэта таму, што перасталі іх слухаць. Яны ж панствавалі на фронце — не здатныя ні на што, распешчаныя, у словах патанулыя, у самаўладстве, ва ўпэўненасці, што могуць усім распараджацца. Мы на перадавой — сорак — пяцьдзесят чалавек у роце, скуры на далонях не засталося — працуем, а ў іх там дзеўкі — крамяныя такія б... У нас начальнік палітаддзела брыгады, які ні разу на перадавой не быў, сем дзевак за вайну абпузаціў, вось ягоныя подзвігі.

Пасля вайны ўжо, у Ленінградзе, пытаюся ў аднаго генерала (ён сівы ўвесь, і я ўжо сівы): «Аляксей Кандратавіч, а чаму гэта ў нас начальнік палітаддзела на перадавой не быў?» А ён адказвае: «А на храна ён табе там, дурню, патрэбен? Ды гэта я не пускаў яго туды. Ён жа прыйдзе — яму трэба бліндаж капаць, ды ў тры накаты, а вас там пяцьдзесят чалавек замест ста дваццаці. У вас жа кароста на плячах, рукі да касці сцёртыя, а вы капаеце...» — «Ну, — кажу, — анучкай абгорнеш і капаеш». — «Вось. А яму ў тры накаты бліндаж ды двух вартавых у дадатак. А пасля яшчэ ён вас і абжарэ, усе вашы запасы злопае...»

— Тое, пра што вы распавядаеце, тым больш дзіўна, што для партыі ваеннае становішча — з яго казармамі, загадамі і Іншай надзвычайшчынай — было як бы натуральным асяроддзем бытавання... Што ж здарылася?

— Тое, што Сталін і яго гадаванцы бяздарна пачалі вайну, бяздарна яе правялі і бяздарна завяршылі, у выніку чаго народ падвергся неаднаўляемаму гвалту, як высветлілася. Дарэчы, вы ведаеце лічбу нашых страт у Вялікай Айчыннай вайне?

— Цяпер быццам бы прынята называць 27 мільёнаў чалавек замест ранейшых 20 мільёнаў.

— Не, 47 мільёнаў, мяркуюць дасведчаныя людзі... Гэта ж трэба! А як ваявалі? Пагналі нас — і адразу: «Злівай паліва! Палі! Бамбі! І па чужых, і па сваіх, калі свае ў акружэнні... Вясной 44-га года, у самую вялікую слату, мы на сабе валаклі гарматы, на сабе валаклі машыны, акружаючы 1-ю танкавую армію. Перад гэтым білі мы яе, галубу, усю зіму. То мы яе акружым, то яна нас. А колькі было там, унутры яе, «катлоў» нашых! Пад Каменец-Падольскім рэшткі арміі ўсё-такі прарваліся. Так, яны страцілі ўсе машыны, баявую тэхніку, масу людзей, але ядро арміі збераглі, і ўжо ў Польшчы яна нас сустрэла адмабілізаванай, адладжанай, як належыць у немцаў, ды і не пусціла нас у Славакію. Спецыяльна для знішчэння 1-й танкавай арміі быў створаны 4-ы Украінскі фронт. Спецыяльна! Гэта ж толькі падумаць трэба, як мы раскідваліся. Фронт, штаб фронту... А хто там? Там доблесны Пятроў, любімы палкаводзец Уладзіміра Карпава, камандаваў. Бяздарна! Дзве арміі — 52-я і 18-я — складалі фронт, і гэтыя дзве арміі павінны былі знішчыць адну. Знішчалі ўсю зіму, але так і не знішчылі. І на Дуклінскім перавале яна спыніла нас, гэта значыць, 4-ы Украінскі фронт. Пасля яму ўжо сталі дапамагаць левы фланг 1-га Украінскага і правы фланг 2-га Украінскага франтоў. Велізарнейшая сіла — і нічога не зрабілі, паклалі 160 тысяч чалавек.

Так, камандаванне — горшае не прыдумаеш. Але гэта яшчэ трэба памножыць на нашу Расію, на наша раздалбайства, нашу неабавязковасць, нашу халатнасць. Да нас жа ў тыл прайсці нямецкім разведчыкам было раз плюнуць: як хацелі, так і шнырылі. Быў выпадак, калі з аднаго моста немцы сем чалавек «языкоў» узялі перад самым наступленнем. Усюды войскі, тэхніка, людзі — плюнуць няма куды. І ўсе спяць... Колькі загадаў было розных: не спаць на перадавой, шнырыць будуць — не прапускай! А як не прапускай? Ну, вось яны ідуць, вядро бульбы валакуць. «Стой, б...!» — «Чаго стой?» — «Ну стой!» — «Чаго стой, чаго ты?» — «Стой, кажу, нельга тут хадзіць!» — «Вось тваю маць... А хто сказаў, што нельга?» — «Стой, б..., назад!» — «Ды чаго? Бульбу ідзём варыць!» — «Нельга!» — «Зараз, курва, вінтар здыму, як усмалю — тут жа лапы ўгору загнеш!»... Ну, прапусціў гэтых, пасля другія ідуць, каня параненага вядуць дабіваць, там трэція, чацвёртыя, яшчэ і яшчэ. Уся перадавая сноўдаецца, корміцца, крадзе, шукае штосьці. Ува ўсіх свой клопат. Да пачатку сорак чацвёртага года на перадавой і майстэрні працуюць, боты на заказ шыюць: адзін у танку ці ў самалёце скуру з крэслаў здзёр, другі ў афіцэра сядло сцягнуў на падноскі, трэці шпількі робіць, чацвёрты бярозу здабывае — боты ж штука складаная. А ты за іх дзяжурыш, капаеш, то адно, то другое...

— Але ж перамаглі?

— Таму што навучыліся разлічваць толькі на сябе. І ўжо ў 44-м годзе на батарэі ў кожнай машыне 15—20 снарадаў пад усялякім шмаццём было прыхавана. Там жа і паліва, і запчасткі, і паўпарсюка, там у старшыны анучы свежыя, мяшок круп, бульба. І ўсе пра гэта ведаюць, ды хрэн знойдуць, а знойдуць — не выдадуць. І гэта ў той час, калі з 53-га года таварыш Сталін гуляў у парадак: кожны дзень данясенне аб наяўнасці паліва, снарадаў, людзей. Мяне заўсёды здзіўляла, што людзі ў спісе стаялі ў канцы. Спачатку снарады, паліва, а пасля ўжо людзі...

— Знаёмы матыў... Але калі справаздачнасць і ўсялякая пісаніна — а на фронце, думаю, і больш важныя справы былі — значыць, напэўна ліпа, адсябяціна, прыпіскі...

— Не заўсёды. Прыстрэлка рэпераў — тут асаблівай ліпы няма. Але ў большасці выпадкаў, вядома ж, фількава грамата. «Ну, напішы што-небудзь», гэта камандзір пісару. А пісар: «Ды пайшлі яны...» — «Пішы, пішы!» Вось так... А снарады ж хавалі і вазілі з сабой не ад добрага жыцця. Вось той жа камандзір батарэі. Выпхнулі яго на прамую наводку з парай снарадаў, лічы, голым. Праз 5 хвілін трах-бах — гармата коламі ўгору, разлік загінуў. Значыць, трэба спадзявацца на сябе. Вось і пачыналі прыстасоўвацца. І хавалі, і прыпісвалі. Скажам, на прыстрэлку рэпераў даецца тры-чатыры снарады. Ён выдаткоўвае два. Хто яго праверыць? І на схеме ўсё правільна: чатыры снарады. Я разумею: з-за таго, што ён скарыстаў не чатыры снарады, а два, стральба пасля будзе не такой дакладнай і, магчыма, некалькі чалавек дарэмна загінуць. Але і яго зразумець можна. У яго гарматы, у яго асабовы склад, хлопцам капаць, а ў іх косці вытыркнуліся: як у калгаснага каня, — трэба ім мяса паесці, хлеба. Вось яны і возяць усё з сабой.

— Атрымліваецца, людзей ставілі ў такія ўмовы, што ім, каб выжыць, трэба было хлусіць, выкручвацца, іншых пад кулі падстаўляць?

— Вайна, вядома, разбэшчвае. Любая вайна. Але гвалтаванне народа пачалося раней, яшчэ з часу калектывізацыі. Даведка трэба? Дай таму маселка. Упаўнаважанаму сунь, каб меншы падатак бралі. І дзяцей кудысьці ўладкаваць, у ФЗН там, таксама трэба даваць... Увесь час гэтая купля-продаж ідзе.

І вось так, паступова, да гэтай улады і прыстасаваліся. Не людзі, а ўжо ці не народ жулікам стаў, крыхаборам, злодзеем. А ў вайну, на фронце, усё і выперла ва ўсёй красе!

Хоць дзівосныя былі выпадкі, здзіўляючыя! Нашы дэсантнікі, якія да немцаў у тыл высаджваліся, часта прывозілі адтуль, з акупаванай зямлі, грошы: гэта вясковыя жыхары, замардаваныя немцамі, апошнія капейкі аддавалі ў фонд абароны. Адзін поп прынёс да самалёта поўны мех грошай — сярод паствы назбіраў ды свае прыклаў... Ну, папа пасля, вядома, загрэблі: маўляў, служыў немцам. Так, ён пры немцах працаваў, але ж служыў людзям — суцяшаў, адляваў, веру падтрымліваў...

— А як мянялася ваша асабістае ўспрыманне вайны, яе ацэнка і асэнсаванне — і першых месяцаў, і ўсіх наступных, і, нарэшце, перамога, думаючы пра якую, не ведаеш — радавацца ці плакаць.

— Пра першыя месяцы я ведаю толькі з вуснаў іншых — я ж з дваццаць чацвёртага года, у сорак другім прызваўся, а на фронт трапіў вясной сорак трэцяга. На Бранскі фронт, які наступаў у фланг курска-белгарадскай групоўкі немцаў. Верагодна, задумваўся грандыёзны, як заўсёды, план: акружыць, адсекчы... Але немцы пасля Сталінграда, пасля 6-й арміі, не надта і паддаваліся, самі імкнуліся адсекчы, ім гэта лепей удавалася. Асабліва пад Харкавам, там яны шэсць нашых армій акружылі, дзевятнаццаць генералаў у палон узялі — бо тыя наступаюць ззаду, затое адступаюць спераду... Зараз не публікуюць нічога пра гэта, усе крычаць: 6-я армія, 6-я армія! А скажаш ім: шэсць армій, — нашы маршалы адразу: «Ну і што? Нашы арміі дробныя: што іхняя адна, што нашых шэсць. І наогул усё гэта вымагае праверкі, удакладненняў, пацвярджэнняў...» У нас заўсёды — ледзь ты кранешся нашых страт, тут жа патрэбны дакладныя звесткі. А вось калі яны, маршалы нашы, хлусяць-брэшуць, тады аніякіх і доказаў не трэба. І пасля паўляецца галоўны ваяка на вайне — начальнік палітаддзела 18-ай арміі, абібок і хварсун, і славіць сябе без сораму і сумлення...

Ну, а ўспрыманне вайны, яе ацэнка — гэта ўсё вельмі цяжка словамі вытлумачыць. Бо пакуль дажываеш да ацэнкі — столькі ўсяго нагледзішся. Першы ранены, першы забіты, першая артпадрыхтоўка, першы абстрэл... Усё гэта і перадаць складана. У рамане тым самым, можа, я яшчэ што-небудзь зраблю, перадам — нейкі водгук, нейкі водбліск. А так вось расказаць... Ну, як, напрыклад, растлумачыць такое глупства: калі пачалася наша артпадрыхтоўка, калі ўсё гэта загуло, закалашмаціла, першая думка (ніколі яе не забуду): вось бы маю бабулю сюды...

— Чаму?

— Вось і вы: чаму? Яно і смешна, і недарэчна, але вось паспрабуйце растлумачыць чаму. Вы не ведаеце, я не ведаю, і ніхто не ведае. Гэта невытлумачальна. Вайна наогул штука невытлумачальная. Хоць у нас пра вайну ўсе ўсё ведаюць, усё растлумачаць. Але мы пра яе праўды не ведаем і ўведаем, мяркую, не скора...

— Віктар Пятровіч, трошкі раней, гаворачы пра нашы страты, вы назвалі 47 мільёнаў замест 27. Я не стаў спрачацца — мы ж не альпіністы, каб выхваляцца адужанымі вяршынямі. Ды і 27

мільёнаў — гэта страшэнная лічба, і 20 мільёнаў — таксама. Але ж гэта толькі загінуўшых! А колькі калек, колькі маральна скалечаных, звар'яцелых, памерлых ад вайны, але пасля перамогі, колькі тых, што не вярнуліся на Бацькаўшчыну, колькі рэпрэсаваных за неасцярожнае слова і чужыя грахі? Тут лічба будзе куды больш крутая! І яна ніяк не супаставімая са стратамі Германіі, якая ваявала на ўсе чатыры бакі свету: на захадзе і на ўсходзе, у Нарвегіі і ў Афрыцы, якая высылала субмарыны да амерыканскага кантыненту. Такія страты не толькі ад нездавальняючага камандавання, яны — сведчанне якасна іншых адносін да народа, да чалавека наогул...

— А сельскія жыхары, асабліва ўдовы, над якімі пасля перамогі проста расправу ўчынялі: не дазваляючы ім выбрацца з абезмужчыненых сёл, забіраючы ў іх усё, ажно да апошняй бульбіны, да зярнятка, ведаючы, што гэта ўмярцвіць сёлы. Што, настолькі не ставала розуму, каб зразумець гэта? Ды яны ўжо пры мне пачалі здыхаць, вёскі, я ж доўга працаваў у газеце, ездзіў, бачыў! У гэтым сэнсе Гітлер можа служыць дакорам нашым правіцелям. Але, ён распраўляўся з камуністамі, як і Сталін з апазіцыяй, зрэшты, аднак, ён ніколі не чапаў свой народ — наадварот, клапаціўся аб ягоным умацаванні, праслаўляў, абагачаў. У Германіі шанавалі жыццё і дастатак. А адносіны да народа ў нас... Ну, якія адносіны ў мясніка да жывёліны?

— Памятаеце барацьбу з касмапалітызмам? Прынята лічыць, што пачалася яна недзе ў канцы саракавых гадоў і вялася пераважна з інтэлігенцыяй. Але мяркую, што гэта толькі водгулле. Сапраўдная барацьба пачалася ў той дзень і гадзіну, калі Чырвоная Армія перайшла мяжу Савецкага Саюза і ўступіла ў Еўропу, а пік яе прыпаў на час масавага вяртання з Германіі ацалелых ваеннапалонных і остарбайтараў, якія, так бы мовіць, знутры спазналі буржуазнае жыццё і маглі цяпер параўноўваць, аналізаваць, рабіць высновы. Па сутнасці, гэта былі першыя нашы дысідэнты з народа, і вастрыё антыкасмапалітычнай кампаніі (няхай яна і не мела пакуль што гэтай назвы) было перш за ўсё накіравана супраць іх.

— Вядома. Неабходна было ліквідоўваць тых салдат, тых вальнадумцаў, якія на свае вочы пабачылі, што пераможаныя жывуць непараўнана лепей за пераможцаў, што там, пры капіталізме, жыццё ідзе куды здаравей і багацей... Я сам, яшчэ ж жывучы ў Ігарцы, веру, што калі нашы Заходнюю Украіну вызвалілі, дык яны яе сапраўды вызвалілі. Бо гэткая прапаганда вялася! Але больш за ўсе словы мяне пераканаў аповяд аб тым, што людзі там жывуць настолькі гаротна, што даводзіцца адну запалку шчапаць на чатыры часткі. Забіла мяне гэтая запалка... Пачалі і мы тут спрабаваць шчапаць нашы запалкі, але нам іх нават напалам расшчапіць не ўдавалася — ламаюцца, галоўка адлятае. А там ажно на чатыры часткі! Ой, гаротныя людзі! Пасля, ужо ў вайну, калі самі наступаць туды пачалі, — мамачкі мае! У кожнай гаспадарцы бетанаваныя двары, свая калонка, кафляныя печы, усё прыбрана, чыста, жывёла дагледжаная, хахлухі крамяныя, хахлы... «Дык вось мы каго вызвалялі!» — думаю... Ну, нагледзіцца вось такога салдат, вернецца ў родную вёску, паглядзіць на тараканаў, на дзяцей галодных ды і разане слоўка-другое... Як з такім змагацца? Толькі знішчыць. Вось і пачаў таварыш Сталін нічшыць тых, хто яму скуру ўратаваў.

— Значыць, не было справядлівасці?

— Якая справядлівасць? Справядлівасць адзіна дзе была, дык гэта на перадавой, на самай-самай. Цяпер пішуць: камісары тут, артысты ў акопах, газетчыкі, фотакарэспандэнты. Ды нічога такога і ў паміне! Спытайце пра гэта ў сапраўднага сумленнага франтавіка, у каго розум яшчэ не звіхнуўся. Аніякіх камісараў, аніякага НКУС, аніякіх следчых, якія ў кіно па акопах швэндаюцца. Ды яны ў штаны накладуць яшчэ на падыходзе да перадавой! Нікога там з іх не было, там самы галоўны быў Ванька-ўзводны з зашмальцаваным пузам — бегае з пісталетам, мацюкаецца... Ну, а дзе-небудзь паблізу камандзір роты. А камандзір батальёна — гэта ўжо панок, яму асобна естачкі пададзена і ўсё такое...

Вось тут была справядлівасць, вось тут была свабода. І гэта мяне ашаламіла. Вось тут ужо гаварылі што хацелі і рабілі што хацелі. І Бог ім суддзя.

— У старой арміі, у якіх бы войнах і паходах яна ні ўдзельнічала, заўсёды адчувалася святло якойсьці маральнай ідэі: вера, Айчына, цар...

— Ды Бог быў, Бог! Камісара замяняў святар. А перад святаром не будзеш дурня корчыць. Святар, усе верылі, жыве па справядлівасці. І святары, у бальшыні сваёй, і не дазволілі б салдата аб'ядаць. І адкрыта крыўдзіць хамствам салдата не дазволілі б, і адкрыта хлусіць. Ды дваранскі афіцэр і не стаў бы — ну, не мог ён, не гэтак выхаваны... Вядома, царскую армію, у якой служылі па дваццаць пяць гадоў, таксама ідэалізаваць нельга. Але святар на вайне — гэта вам, вядома, не камісар.

— А ці была такая маральная ідэя ў нас, у нашай арміі? Ці разумелі вы — сярод усёй хлусні, блытаніны, бруду, несправядлівасці, — што ваюеце за Радзіму? Ці толькі за другую частку славутага сімвала веры: «За Радзіму, за Сталіна»?

— Каб крычалі «за Радзіму, за Сталіна» — такога не памятаю. Нейкая пашанотлівасць, страх — гэта было. Як жа нам без Бога? Вось і замянілі. А каб крычаць... Не, там не да гэтага было, там жыццё сур'ёзнае. Ды і наогул вайна — не прадмет для якіхсьці спектакляў. Сапраўды, усе сталыя людзі, усе патрапілі ў такія варункі, дзе няма неабходнасці гуляць у штосьці, прыкідвацца, корчыць з сябе нешта. У запасным палку, можа, хто і скажа: «За таварыша Сталіна!» — тое, чаму яго яшчэ ў калгасе вывучылі, — а на перадавой дзеля чаго? Там сядзіць які-небудзь баявы старшына, выскаляе жалезныя зубы: давай-давай, маўляў, загні яшчэ што-небудзь!..

Ну, а маральная ідэя... Была, вядома. Але не камунізм, не камуністы — іх заўсёды ненавідзелі, пагарджалі, баяліся... Ваявалі, думалі: вось пераможам — лягчэй стане. Спадзяваліся на перамены. Падманулі...

— Ведаеце, я чалавек зусім цывільны, і абмяркоўваць, ацэньваць рашэнні і ўчынкі прафесійных вайскоўцаў не магу. Вядома, такія неймаверныя страты прымушаюць задумацца аб ступені іх прафесійнасці... Але мяне больш цікавіць псіхалогія іх паводзін, іх адносіны да салдата. Ці былі сярод іх такія камандзіры, якіх можна было б, як даўней, назваць «бацькамі» салдатаў? Бацькі-камандзіры, якія гарой за свайго салдата — і перад ворагам, і перад уласным начальствам.

— Не, сярод вышэйшага камандавання не было. Усе яны — вартыя гадаванцы Сталіна. Бальшыня з іх зусім не лічыліся са стратамі і зусім не разумелі, што такое чалавек, салдат. І калі я чытаю дзе-небудзь, як яны разліваюцца ў любві да салдата, мяне калоціць. Ці яны і на самай справе не разумеюць нічога, не разумеюць, што менавіта яны больш за ўсё і вінаваты перад салдатам, ці гэта цынізм.

Але ў салдатаў любімцам, я мяркую, быў Ракасоўскі. Ён пасядзеў у турме, пацярпеў, ён быў прыгожы, абаяльны... Што да мяне, дык я ўсё-такі перад усімі іншымі аддам перавагу Коневу Івану Сцяпанавічу. Усё-такі ён акуратнейшы быў. Я думаю, што ён нават крышачку, ледзь-ледзь (не дадзена гэта нашым палкаводцам, не з тае яны пароды), хоць краёчкам, але зачапляўся за нас думкаю. Ва ўсялякім разе, і кармілі лепш, і забяспечвалі, і ўжо гэтак забойча і абы-куды не гналі, медалькі выдавалі, апратку перамыць дазвалялі...

Але вось вазьміце немцаў. Мы ўсё кажам: немцы такія, немцы сякія. А ў немцаў жанчын на перадавой не было, дзяцей таксама. Гэта ў Берліне нас падлеткі іхнія пачалі абстрэльваць, дык гэта ўжо народная вайна пачалася... А самае галоўнае, яны ўсю вайну давалі водпускі салдатам. Дзесяць дзён на перадавой — і ўсё, больш нервовая сістэма не вытрымлівае. Я вось быў моцны хлапчына — вясковы, фэззэнчык, дзетдомаўшчына, не спешчаны, умеў прыстасоўвацца. Але на зыходзе васьмі-дзевяці дзён мяне, зазвычай, ці то параніла, ці што іншае са мной надаралася. Нельга чалавека трымаць тут столькі, гэта ўжо не баец, трэба адпускаць яго, каб ачуняў. І немцы гэта разумелі. Ужо як ні цяжка ім было ў сорак чацвёртым, адступалі, але ўсё роўна давалі водпускі салдатам.

Акрамя таго, у іх не было гэтых мардуючых нас праблем: адпачыць, спаласнуцца-перамыцца... У іх на кухні, у шпіталі — усюды быў парадак. У іх не кралі. Так, у немцаў унтэр-афіцэр меў права застрэліць салдата. Але ён не карыстаўся ім, гэта ў нас які-небудзь дурань набярэцца — і застрэліць. Адломсціць захацеў, ці не так паглядзеў на яго, ці яшчэ што-небудзь.

— Бацька неяк абмовіўся... Я, праўда, чамусьці бянтжыўся распытваць яго пра вайну, але зрэдчас загаворваў... Дык вось ён сказаў, што ў немцаў у акопах, на перадавой, была пасцельная бялізна. Мяне гэта ўразіла. Гэта ж класіка, можна сказаць: баец, задрамаўшы на дне залітага вадою акопа, шынелік, хаўнер падняты, рукі ў рукавы.

— Праўда, усе коўдры мы бралі ў іх. А ў нас і ў запасным палку — у запасным, не на перадавой! — на голых дошках спалі. І не ад беднасці. Проста за людзей не прымалі, не прывыклі прымаць. Зганялі, як быдла, гналі, як быдла, і ўтрымлівалі, як быдла. Як пайшло гэта з рэвалюцыі, з грамадзянскай вайны, з калектывізацыі, з баракаў, так і йдзе... Прыганяюць сюды, на Енісей, спецперасяленцаў, загадваюць: «Абжывайцеся!». Трэба снег раскопваць, зямлянкі капаць, а нічога няма. Дзеці паміраюць, дзяцей у снезе хаваюць, іх тут жа, на вачах маці, пясцы ды лісы з'ядаюць... Чаго ж мы хочам цяпер, якой чалавечнасці, якой міласэрнасці? Гэта ж чацвёртае пакаленне ўжо! Калі вось мы ад другога пакалення — я, напэўна, належу да трэцяга — яшчэ штосьці ўзялі, здолелі ўзяць, насуперак усяму, дык цяпер жа ўжо чацвёртае пакаленне! Ім ад каго было ўзяць?

— А пятае пакаленне, калі карыстацца вашай шкалой? Сённяшнія школьнікі?

— А гэтыя зусім будуць без стырна і ветразя. Будуць яны адзін аднаго любіць, будуць біць, будуць, як у пячоры, адбіраць дужы ў слабага...

Тут мне знаёмы з Абакана распавядаў. У іх у адным доме старая на першым паверсе памерла. Адчыняла дзверы, павалілася і памерла. Прыйшоў міліцыянер, дзверы апячатаў, пераступіў цераз старую і пайшоў. Цэлы дзень уся пяцізтажка, увесь пад'езд — то на працу, то з працы, хто ў дзетсад з дзецьмі, хто ў школу — пераступаюць цераз старую — і далей, па сваіх справах... Ну, чаго ж яшчэ? Куды ж яшчэ? Усё, гэта край... І нашы ўнукі, дзеці вашы, яны ж на такой агітацыі выхоўваюцца, а не на закліках.

Нішто не праходзіць марна, усё адгукаецца рана ці позна. Вось і адгукнулася. І вайна, і баракі, і калектывізацыя.

— Ніколі не веру ў нарманскую тэорыю аб запрашэнні варагаў на Русь. Але цяпер, ад адчаю, ці што, гледзячы на ўсё, што вытвараецца з намі, з дзяржавай нашай, подлая такая думка закрадваецца: а можа, у варагах наша выратаванне?

— Вось цяпер ідзе гэтая барацьба за Курыльскія астравы. Ды аддайце вы іх японцам! Яны іх выліжуць, вычысцяць, пераўтвораць у сад, як Паўднёвую Карэю, і вам жа пасля будуць пастаўляць збожжа, рыс, гародніну, рыбу... Вось, дарэчы, дзве Карэі побач: адной камандуюць японцы, другой — геніяльны правадыр і настаўнік. Дык адна працвітае, а ў другой сабак ядуць.

— У нас і бліжэй ёсць прыклад: былое княства Фінляндыя, састаўная частка Расійскай Імперыі. З адной даты пачынаючы, ад аднаго і таго ж калочка пайшлі, толькі рознымі шляхамі. Не думаю, што пры нашым патэнцыяле, пры нашых рэсурсах мы б цяпер жылі горш за фінаў.

— Я калі з імі сустракаюся, размаўляем і пра наша і пра іхняе жыццё, яны смяюцца: «У нас жа белая гвардыя перамагла!» А ў нас — чырвоная... Пра што тут спрачацца? Усё ўжо ясна, усё відавочна... І ў Сібір кітайцаў трэба пусціць — хай працуюць разам з нашымі, павучаць трошкі, зямлю дагледзяць. Глядзіш, і нам штосьці прададуць, памідоркі якія-небудзь, хлябка напякуць, штаны падлатаюць.

— Што ж, атрымліваецца, мы асуджаны — нягледзячы на перамогу?

— Я не магу так сказаць, гэта грэх вялікі — так сказаць...

— Віктар Пятровіч, а калі ўявіць, што не адбылося ў нас рэвалюцыі і ўсіх іншых вынікаючых з яе бед і Расія па-ранейшаму развіваецца натуральна, паслядоўна праходзіць усе належныя эпохі і стадыі, не блытаючы іх і не прапускаючы... Як бы ў такім выпадку складваліся варункі?

— Пачнём з таго, што вайны гэтай проста не было б. Ужо тая, першая сусветная вайна, была, магчыма, апошняй. Усё-такі яна шмат чаму навучыла чалавецтва, пачыналася пэўнае ацверазенне, рух да супрацоўніцтва, садружнасці — ужо ж такая яна была цяжкая. Гэта мы толькі: «А, імперыялістычная!» — і ўсё, пытанне закрыта... Ды і Расія была б іншай. Не скаверканая бальшавікамі, не аслабленая голадам, раскулачваннем, усемагчымымі чысткамі, а магутная квітнеючая дзяржава. Я для сябе асабіста раблю такую выснову: новая Расія, такая, якой нам не далі ўведаць яе, пачыналася са сталыпінскіх рэформ, з будаўніцтва Транссібірскай магістралі, з дэмакратызацыі і развіцця грамадства. Дадайце да гэтага здароўе і чысціню народа. Яшчэ немцы здзіўляліся, калі дзяўчатак нашых ганялі ў бардакі салдацкія, у лагерах здзекаваліся, што з дзесяці восем-дзевяць былі нечапаныя. Ды і з хлопцаў загінуўшых каля васьмідзесяці працэнтаў не зведалі грэху...

Але, народ быў маральны і цнатлівы, цэльны, даверлівы. І заставаўся такім яшчэ доўга, нягледзячы на ўсе выпрабаванні. У бараках зберагалі цнатлівасць, у Ігарцы якой-небудзь, гэта ж цяжка несусветна! І я думаю, што пры маральным патэнцыяле нашага народа, пры яго фізічнай моцы (народ малады, на ўзлёце) Расія займала б цяпер вядучае становішча ў свеце і была б як донар для ўсіх іншых народаў. І ў маральных адносінах, і ў эканамічных, ды і ў сферы культуры — тут XIX стагоддзе дало нам гэтакі разгон, што адно толькі б развівацца. А мы адразу, з гэтакіх вышынь, бухнулі сябе ў нейкую яміну.

Мне будуць казаць: а як жа, маўляў ракеты, касмічныя караблі?.. Ды кіньце, гэта таксама ўсё было б. Ды і не аднымі камуністамі зроблена. А каб у космасе лятаць — дзеля гэтага абрабавалі, распранулі, даканалі і народ, і ўсю эканоміку.

— Але, можа, калі-небудзь стане гэтак, што бальшавікі сыдуць са сцэны, саступяць месца іншым, цвярозым і дзейсным? Не самі, вядома, а ў выніку аб'яднаных і ўзгодненых намаганняў усяго народа... Ці магчымае тады адраджэнне, як цяпер гаворыцца? Зрэшты, я ўжыў бы іншае, больш прыдатнае для сённяшняга стану слова: выздараўленне. Для пачатку ачуняць хоць бы...

— Ну, проста так яны з нас не злезуць. Яны як энцэфалітны клешч: усмакталіся, угрызліся, атруцілі мозг, арганізм спаралізавалі. І загінуць толькі разам з народам: падымуць вайну якую-небудзь, грамадзянскую ці яшчэ якую, але абавязкова кровапраліцце ўчыняць. Яны не могуць, не здольныя прызнаць сваё паражэнне і добраахвотна адмовіцца ад улады. Гэта людзі настолькі дробязныя, настолькі нікчэмныя і славалюбныя, ну як ім без улады? Без яе куды ім, навошта і каму яны патрэбныя? Вось цяпер паасобныя з іх і гатовыя быццам унутрана да перамен, а падкорка не дае, не пускае. Тыя ж, хто сапраўды хацеў перамен, з кампартыі выйшлі. І выйшлі ўсе прыстойныя людзі.

А выздараўленне... Калі і магчымае, дык толькі пры дапамозе цуду. Толькі цуду. І гэта ж мы з вамі ўжо ніколі не ачуняем. А дзеці не гатовы, дзеці вучыцца не хочуць, лянуюцца, аніякай цягі да ўдасканалення, да самаразвіцця. Угаварыць іх немагчыма, як нас, яны вельмі ўзвінчаныя, кволыя мускуламі, досыць баязлівыя. Адзінае, што ў іх развіваецца і прагрэсіруе, дык гэта карыслівасць, адасобленасць, зласлівасць, зайздрасць — якраз тыя якасці, якія былі зусім не ўласцівыя рускаму народу, а толькі прыпісваліся яму ягонымі ненавіснікамі. У малой ступені ўсё гэта, вядома, прысутнічала, але такога, як зараз, нават уявіць сабе было немагчыма.

Мы самі не разумеем, наколькі далёка сягнулі мы насустрач сваёй пагібелі. Можа быць, з гэтае прычыны і стараюцца цяпер не адкрываць усёй праўды аб тым, у якім становішчы мы знаходзімся, — для таго, каб хоць нейкія ілюзіі пад выглядам ідэалаў зберагчы. А ілюзіі ўдаецца ўтрымаць толькі ў пенсіянераў, толькі яны яшчэ вераць: Ленін, партыя, сацыялістычны выбар...

— Але — калі, раптам, усё-такі?

— Не, яны нас у спакоі не пакінуць. Мы згодны аддаць ім самыя лепшыя вобласці: калі ласка, едзьце! Забірайце сваіх прыхвасняў і лёкаяў, забірайце дзевак, маёмасць, забірайце капіталы, якія вы зарабілі не сеяўшы і не араўшы, стварайце там аўтаномію, аб'яўляйце суверэнітэт і працуйце, будуйце свой камунізм, навучыце нас, бедных, што гэта такое. А мы ўжо як-небудзь. Толькі адпусціце вы нас, хоць не надоўга з ланцугоў вызваліце!.. Дык жа не!

ЛіМ ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ГАЗЕТА ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ БЕЛАРУСІ

Заснавальнікі:

Саюз пісьменнікаў Беларусі і Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь

Выходзіць з 1932 года

Газету рэдагавалі

Х.Дунец	*(1932–35)*
І.Гурскі	*(1935–41)*
А.Куляшоў	*(1945–46)*
М.Горцаў	*(1947–49)*
П.Кавалёў	*(1949–50)*
В.Вітка	*(1951–57)*
М.Ткачоў	*(1957–59)*
Я.Шарахоўскі	*(1959–61)*
Н.Пашкевіч	*(1961–69)*
Л.Прокша	*(1969–72)*
Х.Жычка	*(1972–76)*
А.Асіпенка	*(1976–80)*
А.Жук	*(1980–86)*
А.Вярцінскі	*(1986–90)*

Галоўны рэдактар

Мікола ГІЛЬ

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА:

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

Андрэй ГАНЧАРОЎ

першы намеснік галоўнага рэдактара

Юрась ЗАЛОСКА

Міхась ЗАМСКІ

Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ

Барыс ПЯТРОВІЧ

намеснік галоўнага рэдактара

Юрась СВІРКА

АДРАС РЭДАКЦЫІ:

220600, ГСП, Мінск,

вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:

прыёмная рэдакцыі *332-461*

намеснікі галоўнага рэдактара *332-525, 331-985*

аддзелы:

публіцыстыкі *332-525*

пісьмаў і грамадскай думкі *331-985*

літаратурнага жыцця *332-462*

крытыкі і бібліяграфіі *332-204*

паэзіі і прозы *332-204*

музыкі *332-153*

тэатра, кіно і тэлебачання *332-153*

выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў *332-462*

навін *332-462*

мастацкага афармлення *332-204*

фотакарэспандэнт *332-462*

бухгалтэрыя *268-640*

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.

Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з думкамі і меркаваннямі аўтараў публікацый.

Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра «ЛіМа»

Апаратныя сродкі і тэхнічная падтрымка — фірма «Дайнова»

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня "Беларускі Дом друку", (г.Мінск, пр. Ф.Скарыны, 77)

Індэкс 63856. Наклад 11.194. Нумар падпісаны 22.09.1994 г.

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Тэлетыдзень

ПАНЯДЗЕЛАК, 26.09

Беларускае тэлебачанне

9.05 Дзелавы веснік
9.20 Пад купалам Сусвету
9.30 Пяць хвілін на жарты
9.40 «Чарапашкі ніндзя»
10.05 «Мне не хапае вас, настаўнік». Л. Мухарынская
10.55 Планета людзей
11.30 Памяці З. Бабія. Дабрачынны канцэрт
15.50 Тэлебачанне — школе. А. Вольскі — дзецям
16.10 Паказвае Гродна
17.10 «Бімбат»
17.30 Навіны
17.40 «Прагулка ката Леапольда», мульт
17.50 Беларускі тур
18.10 Навіны (Брэст)
18.25 Навіны ВВС
19.00 Аэробіка
19.30 «Праспект»
20.00 Кальханка
20.15 Хакей. «Цівалі» (Мінск) — «Сокал» (Кіеў)
21.00 Панарама
21.35 Пяць хвілін на жарты
21.45 Кантакт
21.50 «Тэлесябрына»
21.55 Спартыўны тэлекур'ер
22.15 Валадарская дружына
23.15 Пад купалам Сусвету
23.25 НІКа
23.40 Надвор'е
23.50 «Паласа Сімарона», с. 9

Канал «Астанкіна»

17.00, 20.00, 23.00 Навіны
17.25 Свет сёння
17.40 Азбука ўласніка
17.50, 23.35 Надвор'е
18.00 Гадзіна пік
18.25 «Дзікая Роза»
18.50 «Галасы Расіі»
19.00 Смехапанарама
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.45 Гол
21.15 Прэс-клуб
22.40 Канал ілюзій
23.40 Прэс-экспрэс

Канал «Расія»

6.00, 11.00, 15.00, 19.00, 22.00 Весткі
6.20 Патрабуюцца... патрабуюцца...
6.30 Формула-730
7.00 Час дзелавых людзей
7.30 Вуснамі дзіцяці
8.00 Навіны АВС
8.30 «Справа Гаргонавай», м/ф (Польшча), с. 1
9.40 Антрэпрыза
10.40 Сялянскае пытанне
15.20 Мульці-пульці
15.50 Там-там навіны
16.05 Новая лінія
16.35 Урача выклікалі?
16.50 Бізнес у Расіі
17.20 Свята кожны дзень
17.30 Выратаванне 911
18.25 У вёсцы Гадзюкіна — дажджы...
19.25 Падрабязнасці
19.35 «Двайны грэх», м/ф («Эрюль Пуаро»)
20.35 Кліп-антракт
20.40 Рэпарцёр
21.00 Без рэтушы
22.20 Аўтаімгненне
22.25 Зоркі гавораць
22.30 Спартыўная карусель
22.35 ЭКП
22.45 Майстры. А. Басілашвілі

Санкт-Пецярбург

10.30 «Рускі дом», д/ф
12.00, 14.30, 18.30, 21.45 Інфарм ТБ
12.10 Чароўная лінія
12.25 «Нямецкая хваля»
13.00 Адам і Ева +
13.30 «Каміла, ці Нераскрытыя таямніцы»
14.25 «Вось табе на», мульт
14.40 «Страсці», м/ф
16.15 «Хроніка адной рэпетыцыі», д/ф
17.15 «Чароўная гісторыя», спектакль
18.10 Вялікі фестываль
18.50 Спорт, спорт, спорт...
19.05 «Каміла, ці Нераскрытыя таямніцы»
19.55 Свет мастацтва
20.30 Тэлеслужба бяспекі
20.40 «Фарух і Зумрал», мульт
20.55 Да 60-годдзя А. Басілашвілі
21.25 Тэлемагазін
21.30 Па ўсёй Расіі
22.00 Спартыўныя навіны
22.10 Ваш стыль
22.20 А. П. Чэхаў. «Сцэнкі»
23.00 «Уся каралеўская раць», м/ф, с. 1

АЎТОРАК, 27.09

Беларускае тэлебачанне

8.00 Раніца рэспублікі
8.10 Пад купалам Сусвету
8.20 Надвор'е
8.30 Пяць хвілін на жарты
8.40 Мультфільмы
9.00 Тэлебачанне — школе. А. Вольскі — дзецям
9.20 «Фантазія», кінанарыс
9.30 Адкрыццё сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
11.55 «Паласа Сімарона», с. 9
13.10 «Бімбат»
13.30 Навіны
15.40 «Нов і К»-топ-10
16.40 Тэлебачанне — школе. Гісторыя
17.10 «Крылы», в/ф
17.30 Паэтычная гасцёўня. Г. Страдаў
17.50 Навіны (Віцебск)
18.10 Тэлевізійны клуб паляўнічых і рыбаловаў «Удача»
18.25 Навіны ВВС
19.00 Эканамікст
19.10 Чарнобыль: праблемы і вырашэнні. Прамая лінія
20.00 Мост
20.30 Кантакт
20.35 Кальханка
21.00 Панарама
21.35 Пяць хвілін на жарты
21.40 Пад купалам Сусвету
21.50 Надвор'е
22.00 На сесіі ВС РБ; «Маё каханне, мой смутак»

Канал «Астанкіна»

5.30 , 7.15 Раніца
7.00, 9.50, 15.00, 17.00, 20.00, 23.00 Навіны
8.00 Агляд рынку нерухомасці
8.20 «Дзікая Роза»
8.45 Дзелавы веснік
10.00 Справа
15.25 «Вайна гобатаў»
15.50 Памыжнамі, дзяўчынкамі...
16.05 Рок-урок
16.40 За кулісамі
17.25 Тахнадром
17.35, 20.35 Надвор'е
17.40 Памяці Р. Раждзественскага
18.00 Гадзіна пік
18.25 «Дзікая Роза»
18.55 Тэма
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.45 З першых рук
20.55 Футбол. Кубак УЕФА «Нант» (Францыя) — «Ротар» (Валгаград)
22.50 50 х 50
23.50 Прэс-экспрэс

Канал «Расія»

6.00, 11.00, 15.00, 19.00, 22.00 Весткі
6.20 Патрабуюцца... патрабуюцца...
6.30 Формула-730
7.00 Час дзелавых людзей
7.30 «20 гадоў узыходжання на вулканы», д/ф (ЗША)
8.00 Навіны АВС
8.30 Мульці-пульці
8.35 Раніцні канцэрт
8.50 Без рэтушы
9.45 «К-2»: «Абзац»
10.35 Тэлегазета
10.40 Сялянскае пытанне
15.20 Фальклорная карусель
15.50 Там-там навіны
16.05 Новая лінія
16.50 Ваша права
17.05 Чалавек справы
17.40 Свята кожны дзень
17.50 Ніхто не забыты
17.55 Здарова жывеш
18.10 L-клуб
19.25 Падрабязнасці
19.35 Фільм-прэм'ер
19.55 «Блеф, ці Гісторыя аб падмане і махлярстве», м/ф (Італія)
22.20 Аўтаімгненне
22.25 Зоркі гавораць
22.30 Спартыўная карусель
22.35 Футбол. Кубак УЕФА. «Дынама» (Масква) — «Сэрэн» (Бельгія)

Санкт-Пецярбург

10.15 «Дом Бенуа», д/ф
12.00, 14.30, 18.30, 21.45 Інфарм ТБ
12.10 Чароўная лінія
12.25 «Нямецкая хваля»
13.00 Хуткая дапамога
13.30 «Каміла, ці Нераскрытыя таямніцы»
14.15 «Асляня-агароднік», мульт
14.45 «Залатое цяля», м/ф
17.35 Адкрываю для сябе Расію
18.10 Вялікі фестываль
18.50 Спорт, спорт, спорт...
19.05 «Каміла, ці Нераскрытыя таямніцы»
19.50 «Зоркі» эстрады на 5-м канале
20.40 Тэлеслужба бяспекі
20.50 Без назвы
21.10 Гэгстэр
21.25 Тэлемагазін
21.30 Будні
22.00 Спартыўныя навіны
22.10 Ваш стыль
22.20 «Уся каралеўская раць», с. 2, 3

СЕРАДА, 28.09

Беларускае тэлебачанне

8.00 Раніца рэспублікі
8.10 Эканамікст
8.20 Пад купалам Сусвету
8.30 Надвор'е
8.40 Пяць хвілін на жарты
8.50 «Дзівосны манеж», мульт
9.00 Тэлебачанне — школе. Гісторыя
9.30 «Маё каханне, мой смутак»
10.30 Аэробіка
12.10 Валадарская дружына
13.10 «Крылы», в/ф
13.30 Навіны
15.40 Відзьма-нявідзьма
16.40 «Еўрапейскі калейдаскоп»
17.10 «Бімбат»
17.50 Футбол. Кубак УЕФА. «Лацыо» (Італія) — «Дынама» (Мінск).
18.10 Навіны (Гомель)
18.25 Навіны ВВС
19.00 «Крок»: «Пяць зорак»
20.10 Крэда
20.30 Кантакт
20.35 Кальханка
21.00 Панарама
21.35 Пяць хвілін на жарты
21.40 Пад купалам Сусвету
21.50 Надвор'е
22.00 На сесіі ВС РБ; «Маё каханне, мой смутак»; Хакей. «Цівалі» (Мінск) — «Крылы Саветаў» (Масква)

Канал «Астанкіна»

5.30, 7.15 Раніца
7.00, 9.50, 15.00, 17.00, 20.00, 23.00 Навіны
8.00 Расійскі дайджэст
8.20 «Дзікая Роза»
8.45 Дзелавы веснік
8.55 Клуб падарожнікаў
15.25 «Вайна гобатаў»
15.50 На балі ў Папялушкі
16.05 «Лятаючы дом»
16.40 Кампанія «Мір»
17.25 Азбука ўласніка
17.40 Свет сёння
17.50, 20.35 Надвор'е
18.00 Гадзіна пік
18.25 «Дзікая Роза»
18.55 Клуб «Белы папугай»
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.45 Маналог
20.55 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. «Спартак» (Масква) — «Пары сен-Жэрмен» (Францыя)
23.10 Праграма «Y»
23.30 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Агляд
0.40 Прэс-экспрэс

Канал «Расія»

6.00, 11.00, 15.00, 19.00, 22.00 Весткі
6.20 Патрабуюцца... патрабуюцца...
6.30 Формула-730
7.00 Час дзелавых людзей
7.30 Снеданне для чэмпіёнаў
8.00 Навіны АВС
8.25 Раніцні канцэрт
8.40 «Санта-Барбара»
9.30 Рэпарцёр
9.45 XX стагоддзе ў кадры і паза кадрам
10.35 Тэлегазета
10.40 Сялянскае пытанне
15.20 Студыя «Рост»
15.50 Там-там навіны
16.05 Далёкі Усход
16.50 Кліп-антракт
16.55 М-трэст
17.10 Залатая галінка
17.40 Свята кожны дзень
17.55 Звычайная справа
18.10 Тэледэбаты
19.25 Падрабязнасці
19.35 «Санта-Барбара»
20.25 Ніхто не забыты
20.30 Гранд-рэпартаж
21.05 Зала чакання
22.20 Аўтаімгненне
22.25 Зоркі гавораць
22.30 Спартыўная карусель
22.35 Пецярбургскія сезоны

Санкт-Пецярбург

11.20 Мультфільмы
11.40 «Я хачу быць отракам светлым». С. Ясенін
12.00, 14.30, 18.30, 21.45 Інфарм ТБ
12.10 Чароўная лінія
12.25 «Нямецкая хваля»
13.00 Хуткая дапамога
13.30 «Каміла, ці Нераскрытыя таямніцы»
14.20, 21.25 Тэлемагазін
14.45 «Тарцюф», м/ф
16.20 Спявае Г. Пісарэнка
16.45 Урок нямецкай мовы
17.00 «Здарэнне на вуліцы Паланк», м/ф (Венгрыя)
18.10 Вялікі фестываль
18.50 Спорт, спорт, спорт...
19.05 «Каміла, ці Нераскрытыя таямніцы»
19.55 «Справа мінулая», мульт
20.05 Блеф-клуб
20.45 Тэлеслужба бяспекі
20.55 «Падсякай»
21.10 Музычны момант
21.30 Будні
22.00 Спартыўныя навіны
22.10 Ваш стыль
22.20 «Другое нараджэнне», м/ф, с. 1, 2

ЧАЦВЕР, 29.09

Беларускае тэлебачанне

8.00 Раніца рэспублікі
8.10 Пад купалам Сусвету
8.20 Надвор'е
8.30 Пяць хвілін на жарты
8.40 Крэда
9.00 «Маё каханне, мой смутак»
12.25 Трэці тайм
13.10, 17.10 «Бімбат»
13.30 Навіны
16.40 Тэлебачанне — школе. Еўрасінія Полацкая і яе жыццё
17.30 «Кутх і мышы», мульт
17.40 Планета людзей
18.10 Навіны (Гродна)
18.25 Навіны ВВС
19.00 Зачытайце маё пісьмо...
19.05 Крымінальная хроніка
19.25 1000 пытанняў
20.00 Партрэт на фоне часу
20.30 Кантакт
20.35 Кальханка
21.00 Панарама
21.35 «Крок»: «Залатая дзесятка»
22.55 На сесіі ВС РБ; Пяць хвілін на жарты; Пад купалам Сусвету; Надвор'е

Канал «Астанкіна»

5.30, 7.15 Раніца
7.00, 9.50, 15.00, 17.00, 20.00, 23.35 Навіны
8.00 Агляд рынку нерухомасці
8.20 «Дзікая Роза»
8.45 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. «Баварыя» (Мюнхен) — «Дынама» (Кіеў)
15.25 «Вайна гобатаў»
15.50 Мульцітролія
16.05 ...Да 16 і старэйшым
16.40 Планета
17.25 Знак пытання
17.40 Загадка СБ
17.50, 20.30 Надвор'е
18.00 Гадзіна пік
18.25 «Дзікая Роза»
18.55 Сярэбраны шар
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.40 Масква — Крэмль
21.00 Лато «Мільён»
21.30 Мастацкі фільм з удзелам Алена Дэлона «На яркім сонцы», м/ф (Францыя)
23.45 Прэс-экспрэс

Канал «Расія»

6.00, 11.00, 15.00, 19.00, 22.00 Весткі
6.20 Патрабуюцца... патрабуюцца...
6.30 Формула-730
7.00 Час дзелавых людзей
7.30 Знаёмыя мелодыі
8.00 Навіны АВС
8.30 Паехалі
8.40 «Санта-Барбара»
9.35 Зусім сакрэтна
10.30 Тэлегазета
10.40 Сялянскае пытанне
15.20 Студыя «Рост»
15.50 Там-там навіны
16.05 Новая лінія
16.35 На шляху да рынку
16.50 Рубяжы
17.05 Будні
17.45 Свята кожны дзень
17.55 У свеце аўта- і мотаспорту
18.25 Свая гульня
19.25 Падрабязнасці
19.35 «Санта-Барбара»
20.30 Я — лідэр
20.55 Ціхі дом
21.45 ЭКП
22.20 Аўтаімгненне
22.25 Зоркі гавораць
22.30 Спартыўная карусель
22.35 Футбол. Кубак кубкаў. «Ферэнцварош» (Венгрыя) — ЦСК (Расія)

Санкт-Пецярбург

12.00, 14.30, 18.30, 21.45 Інфарм ТБ
12.10 Чароўная лінія
12.25 «Нямецкая хваля»
13.00 Хуткая дапамога
13.30 Іграе аркестр Міністэрства абароны Расіі
13.55 «Мікалай Астроўскі. Легенды і быль», д/ф
14.45, 21.25 Тэлемагазін
14.50 «Садко», м/ф
16.20 Еўрапейскі калейдаскоп
16.50 «Просты мужык», мульт
17.00 Студыя «Уяві»
17.10 Дзецям пра зверанят
17.30 Парады садаводам
17.40 Рэформа і ўлада
18.10 Вялікі фестываль
18.50 Спорт, спорт, спорт...
19.05 «Асенні марафон», м/ф
20.45 Тэлеслужба бяспекі
20.55 Спявае Г. Вішнеўская
21.30 Па ўсёй Расіі
22.00 Спартыўныя навіны
22.15 Ваш стыль
22.20 «Вячэрні звон»
23.20 «Другое нараджэнне», с. 3

ПЯТНІЦА, 30.09

Беларускае тэлебачанне

8.00 Раніца рэспублікі
8.10 Пад купалам Сусвету
8.20 Надвор'е
8.30 Пяць хвілін на жарты
8.40 Як нараджаецца музыка?
9.00 Тэлебачанне — школе. Еўрасінія Полацкая і яе жыццё
9.30 Гуляем у стрытбол
10.00 «Крок»: «Пяць зорак»
11.10 «Я + Я»
11.45 Планета людзей
12.15 Размовы ад Вовы
12.45 «Дывертысмент», канцэрт
13.10, 17.10 «Бімбат»
13.30 Навіны
16.30 Жыві і помні
17.40 У свеце навукі
18.10 Навіны (Магілёў)
18.25 Навіны ВВС
19.00 Эканамікст
19.10 Свята паэзіі ў Нясвіжы
19.35 «Свая ці чужая выгада?» Прыватызацыя
20.20 «Тэлесябрына»
20.35 Кантакт
20.40 Кальханка
21.00 Панарама
21.35 Пяць хвілін на жарты
21.40 Пад купалам Сусвету
21.50 Надвор'е
22.00 На сесіі ВС РБ; «Таміра»: «Доўгія провады», м/ф

Канал «Астанкіна»

5.30, 7.15 Раніца
7.00, 9.50, 15.00, 17.00, 20.00, 23.00 Навіны
8.00 Новы старт
8.15 Сарока
8.40 «Дзікая Роза»
9.10 Аўтапартрэт. Л. Скоблікава
10.00 Бізнес-клас
15.25 «Рыокы, сумлены, закаханы», м/ф, с. 1
17.25 Чалавек і закон
17.55, 20.35 Надвор'е
18.00 Чалавек тыдня
18.20 «Дзікая Роза»
18.50 Поле цудаў
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.45 Сустрэча з А. Салжаніцыным
21.05 «Вуліцы Сан-Францыска»
22.05 «Погляд»
23.10 Валейбол. Чэмпіянат свету. Расія — Канада
24.00 Прэс-экспрэс

Канал «Расія»

6.00, 11.00, 15.00, 19.00, 22.00 Весткі
6.20 Патрабуюцца... патрабуюцца...
6.30 Формула-730
7.00 Час дзелавых людзей
7.30 «Гарадок»
8.00 Навіны АВС
8.25 Паехалі
8.35 Осінцаў баль
9.05 «Санта-Барбара»
9.55 «Ламінарыя, ці Жыццё з пункту гледжання...», д/ф
10.35 Тэлегазета
10.40 Сялянскае пытанне
15.20 Студыя «Рост»
15.50 Там-там навіны
16.05 Новая лінія
16.50 Дысней па пятніцах
17.45 Свята кожны дзень
17.55 Зорны дождж
19.25 Падрабязнасці
19.35 «Санта-Барбара»
20.25 Пяць хвілін аб добрым жыцці
20.30 Джэнтльмен-шоу
21.05 «К-2»: «Спыніся, імгненне»
22.20 Аўтаімгненне
22.25 Зоркі гавораць
22.30 Спартыўная карусель
22.35 «Перамена лёсу», м/ф

Санкт-Пецярбург

12.00, 14.30, 18.30, 21.45 Інфарм ТБ
12.10 Чароўная лінія
12.25 «Нямецкая хваля»
13.00 Хуткая дапамога
13.30 «Вясна, лета, восень, зіма і мастак Зінка», д/ф
13.45 «Чараўніцтва», канцэрт
14.45 «Асенні марафон», м/ф
16.20 З любоўю да вас. М. Біешу
17.20 Мультфільмы
17.40 «Кешка і гангстэры», м/ф
18.10 Вялікі фестываль
18.50 Спорт, спорт, спорт...
19.05 «Дзіця чалавечае», м/ф
20.50 Тэлеслужба бяспекі
21.00 Спявае М. Баярскі
21.25 Тэлемагазін
21.30 Будні
22.00 Спартыўныя навіны
22.10 Ваш стыль
22.20 «Двухмеснае аўто», м/ф (ЗША)

СУБОТА, 1.10

Беларускае тэлебачанне

8.00 Раніца рэспублікі
8.10 Эканамікст
8.20 Пад купалам Сусвету
8.30 Надвор'е
8.40 Пяць хвілін на жарты
8.50 Здароўе
9.15 «Доўгія провады», м/ф
10.50 Паказвае Віцебск
11.45 «Лулу — анёл кветак»
12.20 «Пушчанскія галасы»
13.00, 15.25 «Бімбат»
13.30 Архіварыус. У. Магамаеў
14.10 Хрысціянская праграма
14.40 Шматгалоссе
15.45 «Чарапашкі ніндзя»
16.10 «Чацвёртае вымярэнне»
16.45 «Нов і К»-топ-10
17.45 «Падводныя лодкі — акулы са сталі», д/ф
18.15 Тыдзень тэлебачання Кітая. Выступленне Надзвычайнага і Паўнамоцнага пасла КНР у Беларусі пана Ван Сінда. «Кітай», д/ф
19.00 Міжнародны дзень музыкі
19.50 Міжнародныя спартыўныя навіны
20.25 Пад купалам Сусвету
20.35 Кальханка
21.00 Панарама
21.35 «Тайны сям'і дэ Граншан», м/ф, с. 2
22.35 Пяць хвілін на жарты
22.45 «Каскад»
23.05 Відзьма-нявідзьма

Канал «Астанкіна»

6.30 Суботняя раніца дзелавога чалавека
7.15 Спорт-шанц
7.45 Слова пастара
8.00 «Марафон-15»
8.30 Кампанія «Мір»
10.00 Ранішняя пошта
10.30 Я — жанчына
11.00 Без паўзы
11.10 Смак
11.25 Дапамажы сабе сам
11.55 Чалавек і закон
12.05 «Кітай: экзотыка і не толькі...»
13.50, 22.50, 23.50 Навіны
14.05 Тэлескоп
14.35 «Кэтвізл»
15.00 Люстэрка
15.40 Спявае Д. Хварастоўскі
16.05 У свеце жывёл
16.45 Шчаслівы выпадак
17.35 Да і пасля
18.30 Бамонд
18.45 «Сем нот Астанкіна»
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.00 Навіны плюс
20.35, 23.00 Надвор'е
20.45 «Звар'яцелы», м/ф (ЗША)
23.10 Валейбол. Чэмпіянат свету. Расія — Грэцыя

Канал «Расія»

7.00, 13.00, 19.00, 22.00 Весткі
7.25 «Душы цудоўныя парывы», д/ф
7.55 Мульці-пульці
8.25 Студыя «Рост»
8.55 Пілігрым
9.40 Музыка ўсіх пакаленняў
10.10 Тэлеэрудыт
10.15 Да Масквы — далёка
11.00 Кліп-антракт
11.10 «Вясёлае чарадзейства», м/ф
12.20 Кіно ў кастрычніку
12.35 Тэлеэрудыт
12.40 Сялянскае пытанне
13.20 Перарваны звон у Карнегі-хол
14.05 Астралогія кахання
14.35 «Зоркі Амерыкі»
15.05 Мульці-пульці
15.15 Футбол без межаў
16.10 «Тры мушкецёры», мульт, прэм'ера (ЗША)
17.05 Вуснамі дзіцяці
17.35 Свята кожны дзень
17.45 Шарман-шоу
19.25 «Апошняя мішэнь», м/ф (Італія)
21.25 Рэк-тайм
22.20 Аўтаімгненне
22.25 Зоркі гавораць
22.30 Спартыўная карусель
22.35 Праграма «А»
23.35 «Вір», м/ф

Санкт-Пецярбург

9.00 «Гадзіна Фрэйзера»
9.35 «Двухмеснае аўто», м/ф (ЗША)
11.40 Музыка на заказ
12.10 Чароўная лінія
12.25 Мультфільмы
13.00 Хуткая дапамога
13.30 «Рабочы пас ёлак», м/ф, с. 1, 2
15.50 «Марыяна першая», мульт
16.20 У адным нясумным пансіёне
16.40 «Еўропа ў агні», д/ф
17.45, 20.50 Уік-энд з дэтэктывам
18.10 Вялікі фестываль
18.30, 21.30 Інфарм ТБ
18.55 Экспрэс-кіно
19.15 «Страсці»
21.05 «Падаў леташні снег», мульт
21.45 Ваш стыль
21.55 «Сяло Сцяпанчыкава і яго жыхары», м/ф, с. 1

НЯДЗЕЛЯ, 2.10

Беларускае тэлебачанне

8.00 Раніца рэспублікі
8.10 Пад купалам Сусвету
8.20 Пяць хвілін на жарты
8.30 Слова да чалавека
9.00 Беларускі тур
9.20 «Тайны сям'і дэ Граншан», с. 2
10.20 «Чарапашкі ніндзя»
10.45 MTV. Лепшыя хіты
11.15 Аэробіка
11.45 Гасцёўня «Тэлебома»
12.45 Мультклуб
13.15 «Хто лепшы?»
13.50 «Таксі N 518», м/ф (Кітай)
15.30 Тры апельсіны
15.50 Тэлеклуб «Гаў-гаў»
16.15 «Гінес-шоу»
16.45 Тэлекрама
16.55 «Чарапашкі ніндзя»
17.20 Праспект
17.50 Дзелавы веснік
18.05 Памяці З. Бабія. Дабрачынны канцэрт
19.35 Спартыўнаму комплексу «Раўбічы» — 20 гадоў
20.00 Панарама
20.35 Кальханка
20.55 Пяць хвілін на жарты
21.05 Пад купалам Сусвету
21.15 «Сінема» прадстаўляе
21.20 «Жанчына Месяца», м/ф (Італія)
22.55 Камп'ютэрны палігон
23.10 Футбол. КІМ (Віцебск) — «Тарпеда» (Мінск)
24.00 Рок-айленд-шоу

Канал «Астанкіна»

7.15 Алімпійская раніца
7.50 Спортлато
8.00 Марафон-15
8.30 Раным-рана
9.00 Палігон
9.30 Пакуль усе дома
10.00 Хрустальны чаравічак
10.50 Экстра-НЛА
11.15 «Шырэй круг!»
12.45 Шпаргалка з падарункам
13.00 «Падводная адысея каманды Кусто»
13.50, 17.05, 22.50, 23.50 Навіны
14.10 «Стратэгія Перамогі», д/ф
15.20 Жывое дрэва рамёстваў
15.25 Клуб падарожнікаў
16.15 Амерыка з М. Таратутам
16.45 Тэлелоцыя
17.15 «Баскетбольная ліхаманка», «Сапраўдныя паляўнічыя на прывіды»
18.15 Надвор'е
18.20 «Ступень да Парнаса»
18.40 «Таксіст», м/ф (Італія)
21.00 Нядзеля
21.50 Спартыўны ўік-энд
22.05 Праменад у Марыінскім
23.05 Футбол. «Тарпеда» (Масква) — «Ротар» (Валгаград)

Канал «Расія»

7.00, 13.00, 19.00, 22.00 Весткі
7.25 Настаўнік Сургута
8.25 Студыя «Рост»
8.55 Сусветная вёска
9.20 Добрай раніцы, Еўропа
9.50 Аты-баты...
10.20 Рэпартажы з «Малой Еўропы»
10.50, 13.35 «Жывыя і мёртвыя», м/ф
12.40 Шэсць сотак
13.20 Не высечы...
15.15 Тэлеконкурс юрыстаў
16.00 У свеце жывёл
17.00 Чароўны свет Дыснея
17.55 Ю. Дамброўскі. «Ручка, ножка, агурочак...», спектакль
18.40 Кліп-антракт
18.45 Свята кожны дзень
19.25 «Чырвонае сонца», м/ф (Францыя)
21.25 У Ксюшы
22.20 Аўтаімгненне
22.25 Зоркі гавораць
22.30 Спартыўная карусель
22.35 Каробка перадач
22.50 Цішыня N 9

Санкт-Пецярбург

9.00 «Гаючае слова»
9.35 «Клемянціна»
10.05 Экспрэс-кіно
10.20 Свярдлоўск. Будні і святы
11.00 Нядзельны лабірынт
12.30 «Песня, з якой мы раслі», канцэрт
13.15 «Буронка», мульт
13.35 «Факір з 4 «В», к/ф
14.05 Казка за казкай
14.40 Тэлеклуб «Класіка»
16.00 Чэмпіянат Італіі па футболе
17.50 Залаты ключ
18.05 Сустрэнемся ля «Пяці вуглоў»
18.50 «Мікола Пусен», т/ф
19.30 Інфарм ТБ
19.55 «Забойства на Жданаўскай», м/ф
21.25 Ваш стыль
21.35 Адамаў яблык
22.35 «Сяло Сцяпанчыкава і яго жыхары», с. 2